Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 23 (4518) 19 чэрвеня 2009 г.

У нумары:

X Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі

Над Маладзечнам у чарговы раз луналі родныя песні і паэтычнае слова.

Стар. 3

Час мінае — Радзівілы застаюцца…

Эльжбета Радзівіл — дачка апошняга гаспадара Нясвіжскага замка — запэўніла: завітае ў Беларусь яшчэ неаднойчы.

Стар. 4

Комплексны падыход да «сельскай культуры»

Захаванне матэрыяльных і нематэрыяльных каштоўнасцей — стратэгія работнікаў культуры Лепельшчыны.

Стар. 5

Рака часу

Вёска Макаўка Бялыніцкага раёна — родная для пісьменніка з Пецярбурга Уладзіміра Караля — стала «гераіняй» яго новай кнігі.

Стар. 6

Страсці вакол аповесці «Гандлярка і паэт»

Іван Шамякін меў талент дараваць тым, хто рабіў яму непрыемнасці.

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 7760 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 10060 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі:
1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Імя Быкава працягвае пульсаваць у літаратурнай штодзённасці. На нашых вачах ствараецца быкаўскі міф, дзе сам пісьменнік нярэдка апынаецца ў сітуацыі, якую так любіў апісваць ва ўласных творах. Я маю на ўвазе кафкіянскую сітуацыю пасткі, кожнае выйсце з якой не з'яўляецца ратавальным, бо нясе з сабою і радасць перамогі, і горыч паразы.

Прысутнасць Васіля Быкава

Васіля Быкава ніколі не пакідала пачуццё рэальнасці. Творы таксама поўняцца канкрэтыкай — фактамі, учынкамі, і толькі выключнае мастакоўскае майстэрства Быкава прымушала сырыя, непрыглядныя кавалкі рэчаіснасці складацца ў цэласную, надзіва лаканічную, стрыманую карціну. Бадай вось гэтая лаканічнасць, гэты бёлеўскі "халадок" прозы і вабіў тысячы людзей. Нешматслоўнасць была ўласцівая Быкаву ад прыроды. Ён з тых пісьменнікаў, якія ўсё жыццё распрацоўваюць сваю эстэтычную дзялянку аднымі і тымі ж, але ўласнаручна вынайдзенымі спосабамі і метадамі: пэўным чынам ладзяць кампазіцыю, падбіраюць месца і час падзей. Быкаў сціскаў прастору і час да кропкі, і кропка пачынала пульсаваць, біцца, як жывая.

Кнігі Быкава чытаюцца праз шкельца аўтарскай асобы, ёю тлумачацца, ёю, на жаль, і завяршаюцца. У гэтым — перамога і параза пісьменніка. Ад дзесяткаў аповесцей застаўся няўлоўны арэол (для некага — німб), дакрананне да якога абяцае *саўдзел* у роздуме над неаформленым, нявысветленым, недасканалым, выгінастым, як акрабат, быццём. "Апошняе слова свету і пра свет яшчэ не прамоўлена. Усё наперадзе і заўсёды будзе наперадзе", — пісаў філосаф. Быкаў ведаў пра няскончанасць уласнае працы, пра яе, так бы мовіць, доўгатэрміновасць. І ўсё ж такі ў будучыню ён глядзеў з надзвычайнай скрухай. Насцярожанасць і недавер бліскалі ў кожным творы, запісе, інтэрв'ю апошніх гадоў. Дзевяностыя і сапраўды былі чорным часам распаду, прычым адносіцца гэта не толькі да гісторыка-культурных арыенціраў, але і да ўсяго, што мела шыльду "мастацтва". Раптам шыльду знялі, і выявілася, што патрэба ў нейкім (як смешна) "абсалюце", нейкіх, даруйце, "каштоўнасцях" далёка не першасная, што "чалавек" можа гучаць "горда" і не надта горда, а вынік гэтай антыноміі лёгка губляецца ў хуткаплыннай мітусні. Дзе ж выхад да чалавека?

Быкаў не адказаў на пытанне, якое выношваў усё жыццё. Але правільна паставіць пытанне — хіба гэтага мала?..

Васіль Быкаў, бадай, з'яўляецца несвядомым дэміургам сацыяльна завостранай прозы апошніх гадоў. Калі пачаліся мастацкія імправізацыі і разбэрсанасць, Быкаў застаўся верным сваёй праблематыцы і ўказаў шлях, па якім сёння ідзе амаль уся наша лепшая проза — асэнсаванне лёсу краіны, пошукі выйсця з крызісу, пошукі выйсця да сапраўднай Беларусі. Тое, што ў гэтай галіне ствараюцца дасканалыя творы нават у наш, далёкі ад захаплення грамадзянскім пафасам, час — сведчыць пра пастаянны ўплыў Быкава. Так, заўсёды хочацца жыць у Беларусі Караткевіча і Сыса, Коласа і Багдановіча. Але ці была і ці будзе калі-небудзь такая Беларусь?

З быкаўскай Беларусі хочацца сысці і зрабіць іншую краіну, перайначыць ці хаця б прамымі зрабіць шляхі да яе. Ад Васіля Быкава і Віктара Казько сыходзіць і напрамак, які Разанаў назваў "вельмі-рэалізмам".

Ён — пісьменнік трагічнага, эсхаталагічнага светаадчування. Гэта бясспрэчна. Але бясспрэчна і ягоная настойлівая прага зменаў, надзея на светлае, на промень радасці ў беспрагляднай цямрэчы. "Дастаеўскі" ў ім заўсёды прагнуў стаць "Талстым". І спыняўся недзе на паўдарозе.

Яго ніколі не пакідала пачуццё рэальнасці. Творы таксама поўняцца канкрэтыкай — фактамі, учынкамі, і толькі выключнае мастакоўскае майстэрства Быкава прымушала сырыя, непрыглядныя кавалкі рэчаіснасці складацца ў цэласную, надзіва лаканічную, стрыманую карціну. Бадай вось гэтая лаканічнасць, гэты бёлеўскі "халадок" прозы і вабіў тысячы людзей. Нешматслоўнасць была ўласцівая Быкаву ад прыроды. Ён з тых пісьменнікаў, якія ўсё жыццё распрацоўваюць сваю эстэтычную дзялянку аднымі і тымі ж, але ўласнаручна вынайдзенымі спосабамі і метадамі: пэўным чынам ладзяць кампазіцыю, падбіраюць месца і час падзей. Быкаў сціскаў прастору і час да кропкі, і кропка пачынала пульсаваць, біцца, як жывая. Для ваеннай прозы характэрным была гераічная каша — "абавязкова давесці героя да Берліна". Быкаў жа абмяжоўваўся адным-двума днямі, адной-дзвюма пройдзенымі вёскамі, вышынямі, і чытачу пачынала здавацца, што час у аповесці цячэ прыкладна аднолькава з яго ўласным, жыццёвым часам. Асабліва важнай была тэма вартасці/нявартасці жыцця: ледзь не ў кожнай аповесці нехта канчае самагубствам. Умова выбару і цікавіла пісьменніка больш за ўсё. Не сам выбар, а ўмова, пры якой ён робіцца — што прыносіцца ў ахвяру і што здабывае перамогу?

Я хачу тут прыгадаць некаторыя асабістыя ўражанні ад прозы Васіля Уладзіміравіча. Справа ў тым, што ў школе беларуская літаратура не выклікала ў мяне якой-кольвек цікавасці. Але аднойчы (здаецца, у сёмым класе) я прачытаў у падручніку адзін твор, прызначаны для пазакласнага чытання — "На чорных лядах". Адэкватна перадаць уражанні не магу: апавяданне проста расціснула мяне ў блін, і яшчэ тыдзень я хадзіў і паўтараў "Вось жа, можна і *так* пісаць?! І пра гэта?!" Апавяданне адкрыла мне *магчымасці літаратуры* — не слінявай і ружовашчокай, а нейкай іншай. Зямля зазыбалася пад нагамі, прайшло шмат часу пакуль я зміры ўся з гэтым творам, абдумаў яго. Урэшце, у кожным творы ён вучыў мастацтву сумлення, суму, сумневу...

...Я памятаю, як у верасні 2003 года брат прывёў мяне, першакурсніка, на Маскоўскія могілкі. Ужо сутонела, крапаў невялікі дождж. З-за дзесяткаў вянкоў магіла Быкава здалася мне неверагодна вялікай. Я стаяў перад ёй і чамусьці адчуваў, што і сам Быкаў вельмі вялікі. Нібы казачны волат у кургане, ён ляжыць, спіць — і пад маімі нагамі, і пад усімі могілкамі, і нават машыны на шашы, якія праносяцца праз імжу, таксама адчуваюць прысутнасць Васіля Быкава. Гэтае насланнё яшчэ доўга не праходзіла.

Васіль Быкаў прысутны ў нашай літаратуры. І сёння, магчыма, болей, чым калі. Пра яго пішуць кнігі філосафы і філолагі. Яны размаўляюць і будуць размаўляць з ім, бо імя Васіля Уладзіміравіча ўжо непадзельна звязанае з імем вялікай беларускай культуры.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Матэрыялы, прысвечаныя юбілею В. Быкава чытайце на стар. 12-13.

Пункцірам

● 4 — 8 чэрвеня гэтага года ў Лондане адбыўся Першы міжнародны турнір літаратурнага перакладу. У гэтай падзеі ўдзельнічалі рускія паэты і перакладчыкі, якія жывуць у Расіі і за яе межамі: у ЗША, Канадзе, Партугаліі, Францыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Ізраілі і іншых краінах свету. З Беларусі ў Лондан прыехаў паэт і перакладчык з англійскай мовы супрацоўнік часопіса "Нёман" Юрый Сапажкоў, які выйграў папярэдняе спаборніцтва па Інтэрнеце. У адкрытым турніры ў Лондане ён заняў другое месца і атрымаў тытул Віцэ-караля літаратурнага перакладу. Першае месца дасталося Андрэю Алеару (Расія), трэцяе — Наталлі Рэзнік з ЗША.

● У Вілейцы адбыўся вечар памяці паэта Івана Лашуткі (1933—2004). Менавіта да гэтага мерапрыемства быў прымеркаваны выхад музычнага дыска, які склалі песні на ягоныя словы. Музыку напісалі Аляксандр Высоцкі і Леанід Гайчук. Кампазітары выступілі ў ролі і спевакоў. Ініцыятарам запісу выступіла дырэктар вілейскага Цэнтра мастацкай творчасці дзяцей Таццяна Захарыч.

● У Брэсцкай абласной бібліятэцы імя А. М. Горкага прайшла прэзентацыя зборніка "Брэст у 1919—1939. Дакументы і матэрыялы". Зборнік увабраў у сябе 187 дакументаў, якія расказваюць пра міжваеннае жыццё горада. Гэта справаздачы, пратаколы, заявы, статыстычныя звесткі, фотаздымкі. Амаль усе дакументы друкуюцца ўпершыню. Зборнік падрыхтаваны супрацоўнікамі дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці і выкладчыкамі гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкіна.

● У галерэі "Ракурс" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў рамках святкавання Года роднай зямлі адбылося адкрыццё гісторыка-культурнага праекта "Скарбы роднага краю: Ашмяншчына". Мэта праекта заключаецца ў папулярызацыі гісторыі роднай зямлі. У яго межах працуе персанальная выстава мастака С. Шэмета "Пра Радзіму — з любоўю..." Выдавецтва "Юніпак" прадставіла выставу друкаванай прадукцыі, прысвечанай Ашмянскаму раёну і яго гісторыі. На адкрыцці музычны падарунак гасцям паднеслі творчыя калектывы раёна.

● У Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адбылася прэзентацыя аўдыёдыска з раманам Уладзіміра Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім". Тэкст твора, які гучыць на працягу 40 гадзін, чытае выкладчык сцэнічнай мовы Андрэй Каляда. Гэта ўжо не першая кніга Уладзіміра Сямёнавіча ў аўдыёфармаце. Да гэтага быў агучаны зборнік вершаў "Быў. Ёсць. Буду". У бліжэйшых планах кампаніі "БелТонМедыя" — запісаць Караткевічаў "Чорны замак Альшанскі".

● У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі ўрачыста адкрылася выстаўка дзіцячых малюнкаў "Свет, у якім няма чужынцаў", прысвечаная Міжнароднаму Дню бежанцаў. Выстаўка арганізавана па выніках аднайменнага рэспубліканскага конкурсу творчых работ, праведзенага Прадстаўніцтвам Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, Міністэрствам адукацыі Беларусі, Цэнтрам творчасці дзяцей і моладзі "Эўрыка". У арганізацыйны камітэт конкурсу сёлета паступіла больш як 1300 дзіцячых малюнкаў, плакатаў, сачыненняў і вершаў з усіх рэгіёнаў краіны.

У экспазіцыі выстаўкі — сто лепшых малюнкаў. На яе адкрыцці прысутнічалі школьнікі, чыя творы былі прызнаныя лепшымі.

Падрыхтавалі Павел РАДЫНА, Віктар ЗАЯЦ

Пушкін і Беларусь

Табло

Такую назву атрымала рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя, прымеркаваная да 210-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Пушкіна, якая прайшла ў Полацку на пачатку чэрвеня. Арганізатарамі выступілі грамадскае аб'яднанне "Беларускі літаратурны саюз "Полоцкая ветвь" і Беларускае грамадскае аб'яднанне "Русь", а фінанасавую падтрымку аказала Пасольства Расіі ў Рэспубліцы Беларусь.

У прывітальным слове да ўдзельнікаў канферэнцыі старшыня ГА Беллітсаюз "Полоцкая ветвь" Аляксандр Раткевіч сказаў, што такое ўрачыстае мерапрыемства праводзіцца ў Полацку ўпершыню, і выказаў спадзяванне, што канферэнцыя на славутай полацкай зямлі стане традыцыйнай. Саветнік пасла Расіі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Ламакін падкрэсліў: "Вялікі геній Пушкіна ўмеў "глаголом жечь сердца людей", але творчы плён яго так і застаецца яшчэ да канца нявывучаным і неацэненым". Старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання "Русь" Іван Корда адзначыў, што "Пушкін у Расіі, Шэкспір у Англіі, Шаўчэнка ва Украіне, Якуб Колас і Янка Купала ў Беларусі — з'яўляюцца тымі творчымі геніямі, якія задаюць тон усяму культурнаму жыццю сваіх народаў і прыводзяць да лепшага разумення паміж народамі многіх краін".

У ходзе навукова-практычнай канферэнцыі прагучала паўтара дзесятка дакладаў розinfнай тэматыкі, прысвечаных жыццю і творчасці паэта.

Для ўдзельнікаў канферэнцыі былі арганізаваны дзве цікавыя экскурсіі. Першую — па экспазіцыйных залах Музея беларускага кнігадрукавання (іх налічваецца ажно 15!) — правяла старшы навуковы супрацоўнік музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага Вольга Шульчанка, другую — па славутых мясцінах горада — старшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Алена Калач.

Па матэрыялах навукова-практычнай канферэнцыі будзе падрыхтаваны і выдадзены асобны зборнік, у які ўвойдуць прадстаўленыя на ёй даклады.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

На здымку: удзельнікі навукова-практычнай канферэнцыі.

Свята натхнення

У Віцебскай абласной бібліятэцы імя Леніна адбылося падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў абласнога літаратурнага конкурсу "Мы народжаны для натхнення", прысвечанага 65-годдзю вызвалення Беларусі, а таксама юбілейным датам вялікіх рускіх пісьменнікаў А. С. Пушкіна і М. В. Гогаля ды нашых знакамітых землякоў, выдатных пісьменнікаў Беларусі: Міхася Лынькова — 110 год, Еўдакіі Лось — 80 год, Васіля Быкава — 85 год з дня нараджэння.

Каля дзвюх тысяч чалавек прынялі ўдзел у розных этапах конкурсу. Асаблівай актыўнасцю вылучыліся гімназіі абласнога цэнтра.

Свята пачалося выступленнем старшыні Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамары Красновай-Гусачэнка, якая была сапраўднай душой конкурсу. Яна адзначыла карпатлівую работу з літаратурнай моладдзю ў школах і гімназіях вобласці.

З вялікай цікавасцю прысутныя сустрэлі выступленні пісьменнікаў Барыса Беляжэнкі і Алены Крыклівец, якія працавалі ў журы і пазнаёміліся з усімі работамі на заключным этапе конкурсу. Яго асаблівасць — тэматычная разнастайнасць паэзіі і прозы: патрыятызм, родная прырода, гісторыя беларускага краю, прыгажосць былі ў цэнтры ўвагі канкурсантаў.

Цікавыя работы прадстаўлены ў кожнай узроставай групе. Многія з канкурсантаў звязваюць будучае з родным Віцебскам і таму прысвяцілі допісы роднаму гораду і яго славутым мясцінам.

Ну, і натуральна, што малодшыя ўдзельнікі конкурсу пісалі пра радасць дзяцінства, калі, па трапным выразе пяцікласніцы Таццяны Хадневіч, "и никто, и ничто нашей радости не помеха".

У шматколернае палатно ўрачыстасці гарманічна ўліўся Пушкінскі баль, падрыхтаваны юнымі паэтамі і артыстамі віцебскай гімназіі № 3. Напярэдадні 210-годдзя з дня нараджэння вялікага рускага паэта, да твораў якога ў славянскім свеце звяртаецца і школьнік, і акадэмік, у святочнай зале адбылася цудоўная тэатралізаваная вечарына.

Свята завяршылася ў цэнтры горада. Да помніка вялікаму паэту былі ўскладзены кветкі, якія такімі яркімі бываюць толькі на пачатку лета.

Валянціна АЛЕЙНІКАВА

Марафон

Стартаваў новы фестываль

На адкрытай пляцоўцы мінскага аэраклуба "Баравая" прайшоў першы рок-фестываль "BelaMusic". Нягледзячы на кепскае надвор'е — папераменна сонца змянялася дажджом — настрой у амаатараў жывой музыкі быў добры.

На адной пляцоўцы ў арганізатараў атрымалася сабраць вядомых беларускіх рок-выканаўцаў. Не было, праўда, НРМ і "Ляпіса Трубяцкого". Калі першы калектыў цяпер не дае канцэртаў зусім, то другі пасля майскага тура па Беларусі ў падтрымку новага альбома адправіўся на гастролі ў Паўночную Амерыку. І тым не менш, сумна не было. На сцэну па чарзе выходзілі "GARADzKIJA", "Дзецідзяцей", "Нейра Дзюбель", "Палац", "БЕЗ БІЛЕТА", "Крама", "J:морс". Выступіў у акустыцы нават удзельнік сёлетняга "Еўрабачання" ў Маскве Пятро Ялфімаў. Але найбольш жаданым стала выступленне трыо "RASTOP POWER TRIO". Яго ўдзельнікі — Аляксей Растопчын, Аляксей Казлоўскі і Андрэй Філатаў. Усе музыкі вядомыя яшчэ па працы ў гурце "Сузор'е". Сёння Растопчын і Казлоўскі жывуць у ЗША. І прыехалі ў Беларусь знарок для ўдзелу ў "BelaMusic".

Парадавала тое, што на фестывалі не прадаваліся спіртныя і слабаалкагольныя напоі. А тых, хто вырашыў прайсці на фестываль ужо пад уздзеяннем "зялёнага змія", міліцыянеры папросту не прапускалі на пляцоўку.

Арганізатары фэста разлічвалі, што ў "Баравой" збярэцца 5-7 тысяч слухачоў. Іх прагнозы не спраўдзіліся: людзей было значна менш. Невялікую наведвальнасць можна спісаць на кепскае надвор'е. Але, калі спонсары фестывалю не адмовяцца ад далейшай дапамогі, наступны раз "BelaMusic" можа сабраць значна больш слухачоў. І цалкам верагодна, што ён стане паўнавартасным камерцыйным праектам. Прынамсі, не хочацца, каб гэты фестываль паўтарыў лёс Beatles-фэсту: праіснаваўшы пяць гадоў, сёлета ён адменены.

Дзмітрый БЕРАЖНЫ

Выстаўкі

З душой знятыя кадры

У Міністэрстве інфармацыі Беларусі адкрылася чарговая фотавыстаўка. Як зазначыў ва ўступным слове намеснік міністра інфармацыі Ігар Мікалаевіч Лапцёнак, сёння — чарговая культурная імпрэза, а мастацкія праекты такога кшталту — выстаўкі знакамітых мастакоў і фотамайстраў — у сценах гэтай установы ўжо смела можна называць традыцыйнымі. А віноўца ўрачыстасці — Пётр Кастрама са сваёй экспазіцыяй "Году роднай зямлі прысвячаецца". Да таго ж, Пётр Васільевіч набліжаецца да свайго 75-гадовага юбілею. Ён рос разам з краінай, праз свой погляд знаёміць жыхароў Беларусі з цікавымі мясцінамі краіны, краявідамі, людзьмі.

Першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч павіншавала юбіляра і ўручыла яму кветкі і кнігі. Лілія Станіславаўна зазначыла, што фотамайстар, які сам заўсёды здымае людзей, падзеі, прыроду, жыццё, цяпер — у цэнтры гэтага жыцця і ўвагі, а таксама сімвалічна, што самога творцу сёння здымаюць фотакарэспандэнты. Пётр Васільевіч захаваў для будучых пакаленняў выдатныя краявіды роднай зямлі. Дадзеная экспазіцыя — сучаснасць і гісторыя, увасобленая ў здымках.

Звяртаючыся да супрацоўнікаў міністэрства, наведвальнікаў і прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, Пётр Кастрама расказаў пра свой жыццёвы і творчы шлях. Нарадзіўся ён у вёсцы Валадарск Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці, дзе і правёў сваё дзяцінства. А ў адзін з чорных дзён Вялікай Айчыннай вайны вёску спалілі гітлераўскія акупанты, таксама ў вайну загінуў яго бацька. У 1955 годзе па пуцёўцы паехаў на цаліну ў Казахстан. Працаваў на вугальнай шахце ў Карагандзе. Аднойчы ў забоі абрынулася парода, але дапамога прыйшла вельмі хутка: таварышы яго адкапалі і вынеслі на паверхню. Пражыў некалькі цяжкіх аперацый, але ў шахту па стане здароўя ўжо не вярнуўся. У 1975 пачаў асвойваць фотамайстэрства, а першы фотаапарат — "ФЭД" — яму падарыла жонка Паліна Паўлаўна, з якой ён пазнаёміўся ў Карагандзе. У Казахстане П.Кастрама пражыў 23 гады і ў 1978-м вярнуўся ў родную Беларусь...

У экспазіцыі прадстаўлены 52 здымкі з Белавежскай пушчы, а ўвогуле Пётр Васільевіч здымаў ва ўсіх беларускіх запаведніках: Прыпяцкім, Нарачанскім, Браслаўскім, Бярэзінскім. Сваімі работамі ён імкнецца паказаць, якая ў нас цудоўная прырода. Фотаздымкаў магло быць значна больш, прызнаецца віноўца ўрачыстасці, бо толькі ў Белавежскай пушчы ён зрабіў сем тысяч кадраў. На выстаўцы — зімовыя, восеньскія, летнія пейзажы і краявіды...

На пытанне, што ці каго яму лепей падабаецца здымаць, Пётр Кастрама адказаў: "Мой асабісты погляд на жыццё — прыгожа здымаць, а не "жоўтыя" факты. А самая любімая тэма — здымаць з душой".

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымку: словы віншавання Пятру Кастраме ад першага намесніка міністра інфармацыі Беларусі Лілії Ананіч.

Фота аўтара

За падзеяй

"Гэта значная акцыя адбываецца ў Год роднай зямлі напярэдадні святкавання 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Толькі свабодныя людзі, якія горача любяць сваю Радзіму, могуць пільна захоўваць і памнажаць нацыянальныя культурныя каштоўнасці, узбагачаць творчую спадчыну продкаў. Яскравым прыкладам таму з'яўляецца фестываль песні і паэзіі, які дэманструе невычэрпнасць таленту беларускага народа, гарманічнае спалучэнне музыкі і слова, адкрывае новыя імёны маладых выканаўцаў — будучыні нашай эстрады".

З віншавання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам і гасцям X Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі.

Жывое слова беларускае...

X Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2009"

Заўсёднікаў гэтага свята залевай не здзівіш. Яны з дажджамі, можна сказаць, сябруюць. Аднаго разу надвор'е нават назву для фестывальных нататак падказала: "Спевы з-пад парасона". Такі загаловак быў бы актуальны і сёлета, хаця падчас першай маладзечанскай імпрэзы, якая пачыналася ў разгар дажджу, парасоны не спатрэбіліся. Яе ўдзельнікі выступалі ў шыкоўных умовах мясцовага Палаца культуры, і публіка пачувала сябе ўтульна ды камфортна. Было гэта раніцай першага фестывальнага дня, які распачаўся значнай падзеяй — Рэспубліканскім конкурсам маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. Сёлета ён ладзіўся ўжо дзесяты раз. Пасля адборачных тураў у раёнах і абласцях вызначыліся фіналісты: па тры прадстаўнікі кожнай вобласці, а таксама сталіцы. Аднак на сцэну маладзечанскага Палаца культуры выходзіла толькі 20 спаборнікаў: напярэдадні праслухоўвання зняў сваю кандыдатуру з конкурсу прадстаўнік Гомельшчыны Андрэй Колясаў. Ён, пераможца нацыянальнага адбору на Міжнародны конкурс маладых спевакоў "Славянскі базар у Віцебску-2009", меў права на такое рашэнне...

Фіналісты конкурсу апынуліся ў экстрэмальных умовах: праслухоўванні абодвух тураў праходзілі запар. Першую песню яны выконвалі пад фанаграму "мінус 1", затым спявалі ў суправаджэнні Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам М. Фінберга. Жывое дыханне аркестра, свежасць аранжыровак, новыя галасы — гэта прыемна ўражвала. Тым болей, што ўзровень вакальнай падрыхтоўкі ды артыстызм выканаўцаў часам даваў фору некаторым эстрадным "зоркам".

Маэстра Міхаіл Фінберг, падкрэсліваючы вялікае значэнне гэтага конкурсу, адзначыў: "Канкурсанты з розных куткоў Беларусі, з рознай адукацыяй. Але ўсе яны спяваюць па-беларуску і спяваюць песні нашых аўтараў. Конкурс адметны тым, што яго рэпертуар будуецца на беларускай класічнай паэзіі, на лепшых песнях нашых кампазітараў. У гэтым яго вялікае патрыятычнае, выхаваўчае значэнне. Ён заўсёды праходзіць пад жывы акампанемент аркестра, і гэтаму папярэднічае напружаная рэпетыцыйная праца, што павышае адказнасць маладых выканаўцаў, становіцца для іх школай прафесіяналізму".

Дарэчы, старшыня конкурснага журы кампазітар Эдуард Зарыцкі падчас дзённай прэс-канферэнцыі падкрэсліў, што за ўсе 10 гадоў правядзення конкурсу гэты быў самы моцны, і многія спаборнікі паказалі сябе як сапраўдныя прафесіяналы. А вынікі такія: Гран-пры і прыз глядацкіх сімпатый дасталіся Аляксандру Салаўёву — прадстаўніку Міншчыны, ураджэнцу Маладзечна і выхаванцу тутэйшай дзіцячай эстраднай студыі "Спяваем разам!", якой кіруе вядомы кампазітар Алена Атрашкевіч. Спецыяльны прыз імя Уладзіміра Мулявіна, заснаваны па распараджэнні Прэзідэнта Беларусі, атрымаў Глеб Лапіцкі з Віцебска. Лаўрэатамі 1-й, 2-й і 3-й прэмій сталі, адпаведна, Ульяна Шэлах, Маргарыта Халатава (абедзве прадстаўлялі Магілёўскую вобласць) і Дзяніс Вяршэнка (Гомельшчына).

▶ На працягу дня, наколькі дазваляла надвор'е, пад адкрытым небам ладзіліся выступленні самадзейных калектываў, гульнёва-забаўляльныя праграмы. Віравала жыццё ў "Горадзе майстроў". Адбываліся візіты нашых паэтаў ды кампазітараў-песеннікаў у Купалавы мясціны (Дом-музей паэта ў Вязынцы, Цэнтр культуры ў Радашковічах), творчыя сустрэчы. У розных аўдыторыях Маладзечна выступілі Віктар Шніп, Міхась Башлакоў, Навум Гальпяровіч, Мікола Шабовіч, Уладзімір Мазго, Канстанцін Цыбульскі, Андрэй Цяўлоўскі, Таццяна Сівец... Падчас бліскучага канцэрта Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі "Свята" на Цэнтральнай плошчы горада бралі слова і паэты Канстанцін Цыбульскі ды Мікола Шабовіч.

А ў журналістаў адбылася кароткая гутарка з Паўлам Латушкам, нядаўна прызначаным на пасаду Міністра культуры Беларусі. Павел Паўлавіч, у прыватнасці, адзначыў:

— Лічу, што гэтае свята — вельмі важная традыцыя. Традыцыя, якая падтрымліваецца і на рэспубліканскім узроўні, і рэгіянальнымі ўладамі. Гэты фестываль падтрымлівае і Прэзідэнт нашай краіны. Таму гэта вельмі важнае мерапрыемства, якое, я ўпэўнены, і надалей будзе традыцыйна праводзіцца тут, у Маладзечне. Беларуская песня і паэзія — гэта тая крыніца, якая патрэбна нашай Беларусі і нашым людзям. Уражанні ад наведвання маладзечанскага рэгіёна вельмі станоўчыя, давялося паглядзець некалькі ўстаноў культуры, якія тут функцыянуюць. Каб гэтак жа было па ўсёй краіне, то было б вельмі добра.

Першы этап працы кожнага кіраўніка, тым больш міністра, пачынаецца на тым, каб пазнаёміцца з сітуацыяй у той галіне, за якую ты адказваеш. Хаця казаць пра культуру як галіну, мне падаецца, можа, не зусім правільна. Таму што культура — гэта тое, што вакол нас, тое, што ўнутры нас, тое, з чым мы сутыкаемся штодня. Але трэба перш за ўсё азнаёміцца са справамі, якія сёння ёсць у культуры, а пазней ужо акрэсліць нейкія кірункі і планы. Для мяне, зразумела, вельмі важным з'яўляецца тое, каб у ментальнасці нашых людзей было разуменне таго, што мы можам ганарыцца беларускай культурай, культурай нашага народа, якая існаваць можа менавіта на гэтай зямлі, нашай радзіме. Вельмі важна, каб мы ганарыліся і культурай нашых суседзяў з Усходу і Захаду. Але памяталі, што галоўным для нас з'яўляюцца нашыя карані, наша беларуская культура.

▶ Дождж, вядома ж, уносіў нейкія карэктывы ў драматургію свята, але не ў яго настрой. Увечары падчас гала-канцэрта сабраліся на Цэнтральнай плошчы і суседніх вуліцах тысячы чалавек. Людзям, якія ўладкаваліся на мокрых лаўках у "зале" пад адкрытым небам або слухалі праграму, павольна шпацыруючы непадалёк ад сцэны, удавалася аплодзіраваць нават з парасонамі ў руках! Той, хто назаўтра паглядзеў па Беларускім тэлебачанні запіс галоўнага фестывальнага шоу, атрымаў далёка не поўнае ўяўленне пра свята. Рэгламент вяшчання не дазволіў паказаць канцэрт цалкам, жорсткі мантаж пазбавіў (за малым выключэннем) тэлегледачоў інфармацыі пра аўтараў песень — тых кампазітараў і паэтаў, творчасцю якіх і сілкуецца гэтае унікальнае свята.

А вечаровы канцэрт у Маладзечне працягваўся каля трох гадзін. Ва ўрачыстай цырымоніі ўдзельнічаў Міністр культуры Беларусі Павел Латушка: ён падкрэсліў значнасць гэтага свята, бо сярод нашых буйных фестываляў толькі два — "Маладзечна" і "Славянскі базар у Віцебску" — праводзяцца пад патранатам Прэзідэнта Беларусі. Міністр зачытаў прывітальны ліст кіраўніка дзяржавы, накіраваны на адрас ўдзельнікаў і гасцей X Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. Публіцы былі прадстаўлены ўдзельнікі сёлетняга конкурсу і яго лаўрэаты. Уладальніку Гран-пры і прыза глядацкіх сімпатый Аляксандру Салаўёву выпаў шанц выступіць у вялікай праграме. Хто ўдзельнічаў у ёй — і не пералічыць! Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Г. Цітовіча, Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі, вакальная група "Камерата", ансамблі "Бяседа" і "Купалінка"; "Сябры" з Анатолем Ярмоленкам, Марына Васілеўская з інструментальным ансамблем пад кіраўніцтвам А. Крамко, Ірына Дарафеева, Алешка, Іскуі Абалян, Гюнеш, Ганна Шаркунова, Жанет, Якаў Навуменка, гурт "Палац", Алег Сямёнаў, Аляксей Жыгалковіч, Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч...

Апроч сталічных артыстаў, выходзілі на сцэну баранавіцкі ансамбль "Крэда", эстрадна-сімфанічны аркестр Гомельскай абласной філармоніі са сваім салістам Сяргеем Якушам, галасістая Аксана Запявалава і харэаграфічны ансамбль "Церніца" з Магілёва — словам, прадстаўнікі ўсіх абласцей краіны... З палымяннымі словамі ды ўласнымі вершамі выступалі нашы знаныя паэты Віктар Шніп, Міхась Башлакоў, Навум Гальпяровіч. Слова беларускае (а як жа інакш на свяце нацыянальнай песні ды паэзіі?) гучала ў спевах усіх выканаўцаў, што прадстаўлялі надзвычай шырокі спектр набыткаў айчыннага песеннага жанру. Ды было пра што паразважаць і крытыкам. Чаму, напрыклад, самыя юныя сталічныя выканаўцы спявалі... "Колыбельную", хаця ў беларусаў багата прыгожых калыханак — народных і створаных сучаснымі кампазітарамі? Чаму сёлета на галоўнай сцэне адсутнічаў "брэнд" маладзечанскага свята, яго ініцыятар і адзін з заснавальнікаў — Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі?..

Зрэшты, падтрымаем энтузіязм арганізатараў, якія выказалі не толькі надзею, але і ўпэўненасць, што і форма, і змест фестывалю "Маладзечна-2011" будуць больш дасканалыя і разнастайныя — прынамсі, да ўдзелу ў ім плануецца далучыць таленавітых прадстаўнікоў замежных беларускіх суполак, якія шануюць і зберагаюць мову і песні сваіх продкаў...

▶ Ад свята да свята — два гады. За гэты час, безумоўна, зменіцца жыццё нашай маладой энергічнай краіны, якая ўпэўнена займае "свой пачэсны пасад між народамі", імкліва развіваецца, захоўваючы гістарычныя асновы дзяржаўнага суверэнітэту і галоўную з іх — нашу мову, шануючы самабытныя традыцыі нацыянальнай культуры. І заўсёднікі Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі мараць пра тое, што наступным разам ён пройдзе ўжо ў больш спрыяльных, "паслякрызісных" фінансава-эканамічных умовах, што яго праект не толькі ўзбагаціцца новымі творчымі ідэямі, канцэртнымі праграмамі, асветніцкімі акцыямі, але і ахопіць, як гэта было раней, два-тры дні, з колішнімі "жывымі" тэлетрансляцыямі на ўсю краіну. Наша песня, наша мова, слова беларускае — самыя каштоўныя, далікатныя і крохкія кветкі ў беларускім садзе, вартыя няспыннага клопату, той асаблівай, трапяткой і глыбокай увагі, з якой ставіцца да нацыянальных святыняў кожны свядомы і сумленны чалавек... Няхай жа будзе шчырай, прыемнай і плённай новая сустрэча ў спеўным, паэтычным беларускім горадзе Маладзечна!

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: падчас прэс-канферэнцыі; Міністр культуры Беларусі П. Латушка; пераможца конкурсу А. Салаўёў; паэты-песеннікі К. Цыбульскі і М. Шабовіч; ансамбль "Свята"; фіналісты конкурсу.

Фота Віктара Кавалёва

Як мы ўжо пісалі, пры канцы мая адбыўся чатырохдзённы прыватны візіт у Беларусь нашчадкаў аднаго з самых буйных і ўплывовых магнацкіх родаў князёў Радзівілаў на чале з 91-гадовай Эльжбетай Тамашэўскай (да замужжа — Радзівіл, дачка апошняга гаспадара Нясвіжскага замка, ардыната Альбрэхта Радзівіла [1885 — 1935]).

Першым гістарычна вядомым носьбітам прозвішча Радзівіл быў Мікалай I Радвіла Астыкас (памёр у 1477 годзе), які прыняў хрысціянства і пакінуў літоўскае паганскае імя ў якасці прозвішча.

Час мінае — Радзівілы застаюцца...

Фотарэпартаж

Пра паходжанне Радзівілаў існуе некалькі паданняў. Паводле некаторых звестак, Радзівіл паходзіць з вышэйшага жрэцкага саслоўя паганскай Літвы і родапачынальнікам з'яўляецца жрэц Ліздзейка. Гэтыя паданні, а таксама характэрны канчатак слова (сугучныя — Эрдзівіл, Монтывіл...) сведчаць пра глыбокую старажытнасць роду. Найбольш пэўнай з'яўляецца версія паходжання Радзівілаў ад літоўца Сірпуціса, чый сын Радзівіл хрысціўся пад імем Крысціян, і ў 1419 — 1442 гадах быў каштэлянам Віленскім (памёр у 1444-м).

Уся праграма гасцявання прысвячалася выключна тым мясцінам, падзеям і рэчам, якія звязаныя з гісторыяй гэтага славутага роду.

О куткі мае мілыя!
О родныя далі!
Калі ў свет мяне кіне
жыццёвым ветрам,
Набяру сабе ў грудзі
адгэтуль паветра,
Набяру яго шмат,
каб надоўга хапіла,
Каб яно мае песні
заўсёды жывіла...

(Уладзіслаў Сыракомля)

Князі Радзівілы наведалі Паланэчку (адзін з іх былых маёнткаў). Сярод іх былі Мацей і Мікалай Радзівілы, і каб не 1939 год, то яны цяпер былі б яе валадарамі. Таксама адбыліся паездкі ў Навагрудак, Ішкалдзь, Мір.

Да слова, калі літаральна праз пару дзён мы — супрацоўнікі "ЛіМа" — наведаліся ў Мір на традыцыйнае свята мастацтваў, для нас правялі невялічкую экскурсію па Мірскім замку. Мы запыталіся пра візіт прадстаўнікоў княскага роду. Ведаеце, яны былі рады, што да іх завіталі Радзівілы, але ў іх засталіся не вельмі добрыя пачуцці, бо Эльжбета Радзівіл спрачалася наконт тых ці іншых дэталяў інтэр'ераў замка, апелюючы тым, што яна неаднаразова тут гасцявала і вельмі выдатна ўсё памятае.

Шмат пра якія факты з вандровак Радзівілаў па Беларусі прадстаўнікі сталічных сродкаў масавай інфармацыі даведваліся ад маладога, але дасціпнага і апантанага журналіста Глеба Лабадзенкі, які ўвесь час знаходзіўся з гасцямі, бо выступіў арганізатарам гэтай паездкі. Як ні прыкра гучыць, але гісторыя ўсё перакуліла з ног на галаву, і колішнія гаспадары і ўладальнікі замкаў і маёнткаў цяпер тут — толькі госці.

Адзін з дзён візіту быў прысвечаны бібліятэкам і музеям. А распачалося ўсё з наведвання Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, дзе гасцям паказалі унікальны маляваны радавод Радзівілаў, які зрабіў Караль Станіслаў Радзівіл Пане Каханку, кнігі, альбом гравюр і малюнкаў, дзе розныя прыдворныя мастакі выконвалі партрэты некаторых прадстаўнікоў роду. Цікавасць князёў выклікала Нацыянальная бібліятэка Беларусі і яе кніжны фонд.

Наступны прыпынак — чытальная зала рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Тут нашчадкі Радзівілаў азнаёміліся з фондамі бібліятэкі, з друкаванымі і рукапіснымі дакументамі з некалі адзінага, унікальнага па сваім складзе кніжнага збору князёў Радзівілаў Нясвіжскай ардынацыі. А навуковыя супрацоўнікі прэзентавалі ім кампакт-дыск з экслібрысамі кніг радзівілаўскай бібліятэкі "Нясвіжскі архіў і бібліятэчная калекцыя".

Шмат якія з выданняў пані Эльжбета помніла з юнацтва, прасіла даць ёй пагартаць. Супрацоўнікі ў белых пальчатках спачатку разгубіліся, але не пярэчылі і дазволілі. Князёўна разглядала кнігі, зрабіла некалькі заўваг наконт памылак у іх апісанні і са здзіўленнем запыталася, чаму гэта ў навуковай бібліятэцы яны захоўваюць кнігі зусім ненавуковага характару. *"Гэта гарох з капустай,* — падсумавала пасля перакладу дыялога з супрацоўнікамі ўстановы князёўна Эльжбета і дадала, — *калі б гэтыя выданні былі ў Радзівілаў у Нясвіжы, дык больш бы народу змаглі імі карыстацца"...* Яна выказала задавальненне прыстойным станам захаваных выданняў і падкрэсліла, што фармальна кнігі павінны належаць Радзівілам, бо яны яшчэ жывыя, а ў Мінску могуць знаходзіцца як бы на дэпазіце. І ўвогуле, чаму гэта дзяржава ўсё іхняе забрала сабе.

Пасля — Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. Эльжбета Радзівіл зноў сканфузіла супрацоўнікаў сваімі пытаннямі, але ж і дала тлумачэнні, за што музейшчыкі былі вельмі ўдзячныя, бо зробяць больш дакладныя подпісы да карцін. І апошняе наведванне за дзень — Нацыянальны мастацкі музей Беларусі, дзе захоўваецца больш як сорак радзівілаўскіх партрэтаў. Князі добра ведаюць іх па фотаздымках і інвентарах, але многія арыгіналы бачылі ўпершыню. Тут таксама былі непаразуменні, бо князёўна лічыць, што пераблыталі партрэты яе продкаў і зрабілі няправільныя подпісы да іх.

Прыкладам, як перакладаў для "Еўрарадыё" слова пані Эльжбеты Глеб Лабадзенка, давядзецца перапісваць палову таблічак. Там вісеў партрэт жанчыны з подпісам, што гэта Луіза Гогентолерн — прапрапрабабуля княжны Эльжбеты. Але як толькі тая пабачыла карціну, то прамовіла, што гэта не Луіза Гогентолерн, а Аляксандра Браніцкая (Энгельгардт). Музейшчыкі пачалі спрачацца: вучоныя лепей ведаюць, а ўсё зроблена ў адпаведнасці з афіцыйнымі дакументамі. Пра што яшчэ можна казаць, калі князёўна знайшла памылку на таблічцы пад партрэтам... роднага бацькі.

Згодна з сямейнай традыцыяй, кожны Радзівіл, не зважаючы на лінію роду, павінен пабываць у Нясвіжы. Што і зрабілі госці з Польшчы і Францыі ў апошні дзень свайго візіту. У Нясвіжы Эльжбета Радзівіл жыла да 18 гадоў, да пачатку Другой сусветнай вайны.

Старажытны Нясвіж па праве лічыцца цэнтрам беларускай культуры мінулых стагоддзяў. Роля яго ў развіцці айчыннай культуры выключная. Гэтаму паспрыяла тое, што ён належаў Радзівілам — буйнейшаму ў Беларусі магнацкаму роду, які імкнуўся, каб горад набыў славу аднаго з важных культурных цэнтраў Еўропы, садзейнічаў развіццю музычнай, мастацкай, тэатральнай культуры. Авеяны легендамі і слаўнай гісторыяй, Нясвіж выступае жыватворным асяродкам для адраджэння старасвецкай беларускай культуры.

Як зазначыў Глеб Лабадзенка, пані Эльжбета пажадала, каб гэты дзень распачаўся са святой імшы ў касцёле Божага цела. Прадстаўнікоў магнацкага роду каля касцёла вітала больш як пяцьсот чалавек. Пасля імшы былыя гаспадары Нясвіжа спусціліся ў крыпту касцёла, каб аддаць даніну павагі сваім продкам.

Кіраўніцтва цяперашняга раённага цэнтра ўрачыста сустракала дэлегацыю ў гарадской ратушы. Былі падарункі, чыталіся вершы, гралі музыкі. А пасля — наведванне ў замак, дзе князёўна замест агляду адкрытай нядаўна экспазіцыі спачатку скіравалася напрасткі да будаўніцтва. Давала заўвагі, што так, а што сказілі. Супрацоўнікі музея занатоўвалі кожнае яе слова, а намеснік дырэктара музея Галіна Кандрацьева загадзя падрыхтавала фотаздымкі інтэр'ераў пакояў. У сваю чаргу пані Эльжбета падрабязна апісвала тое, чаго бракавала на здымку. Хто ж апроч яе можа гэта яшчэ зрабіць, даць такую каштоўную інфармацыю...

На наведванні ў родавы замак закончыўся візіт Радзівілаў у Беларусь. Але цяперашнія замежныя грамадзяне паабяцалі, што яшчэ неаднойчы завітаюць у Беларусь, на радзіму сваіх шаноўных продкаў.

Віктар КАВАЛЁЎ

***На здымках:** князёўна Эльжбета падчас наведвання Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; унутраны дворык Мірскага замка; інтэр'ер Нясвіжскага замка і сам замак.*

Фота аўтара

Мірскі замак — адметны ўзор беларускага дойлідства. Пабудаваны ў пачатку XVI стагоддзя, за сваю шматвяковую гісторыю неаднаразова руйнаваўся і перабудоўваўся. Кожным разам яго аднаўлялі майстры новага пакалення і ў новым стылі. Лёс помніка амаль 500 гадоў цесна звязаны з гістарычнымі падзеямі ў жыцці беларускага народа. Нягледзячы на шматлікія пераробкі, замак захаваў у асноўным сваё першапачатковае аблічча. Яго сярэднявечная архітэктура адрозніваецца багаццем і пластычнасцю форм і дэталей. Разам з навакольным асяроддзем (старажытны парк, паселішча, возера) Мірскі замак уяўляе адзіны архітэктурна-ландшафтны гістарычны ансамбль.

Нясвіж мае багатую гісторыю, у ім да нашых дзён захаваліся адметныя помнікі архітэктуры: замак, ратуша, у якой некаторыя нашы суайчыннікі нават просяць зарэгістраваць шлюб па Радзівілаўскім абрадзе, фарны касцёл, манастыр бенедыктынак, Дом на рынку — адзіны ў Беларусі ўзор гарадскога жытла першай паловы XVIII стагоддзя з барочным фасадам, Слуцкая брама, адна з пяці раней існуючых гарадскіх брам, праз якія можна было патрапіць у горад...

Комплексны падыход да «сельскай культуры»

Сёння мы знаёмім чытачоў "ЛіМа" з начальнікам Лепельскага раённага аддзела культуры Тамарай Барохай. Тамара Максімаўна пра сябе кажа — "ў культуры ўсё жыццё": скончыла бібліятэчны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, працавала бібліятэкарам, вяла сельскую клубную працу. Так што ў сваіх "ўладаннях", перш чым пачаць імі кіраваць, яна добра агледзелася.

Два ў адным

— Скажыце, калі ласка, чым адметным Лепельскі раён можа пахваліцца?

— Я думаю, працай з сельскімі ўстановамі культуры. І асноўны напрамак у ёй — комплекснасць. У нас працуе Каменская сельская бібліятэка-музей Тодара Кляшторнага, нашага земляка. Акрамя таго, што разгорнута экспазіцыя, там яшчэ праходзяць сустрэчы. Прыязджаюць нашы мясцовыя паэты, дочкі Тодара Кляшторнага, не так даўно быў Анатоль Вярцінскі (ён таксама з Лепельшчыны).

Дзейнічае Баброўская сельская бібліятэка-музей Язэпа Мароза. Тут сабраны матэрыял пра знакамітага селекцыянера, беларускага мічурына, нашага земляка. Недалёка ад вёскі Баброва ў былым фальварку Фатынь, месцы жыхарства Язэпа Мароза, захаваліся пасаджаныя ім пладовыя дрэвы, паркавая алея. І пасля агляду экспазіцыі можна прайсціся, паглядзець.

Гэтым летам мы адкрыем яшчэ адну такую бібліятэку ў вёсцы Чарэйшчына. Там будзе створаны музей вёскі. Галоўнае, каб бібліятэка працавала комплексна. Не проста — выдаў чытачу кнігу і ўсё. А тут жа яшчэ ідзе збор мясцовага матэрыялу. Бібліятэкар пачынае — чытачы далучаюцца. Знаходзіцца і фіксуецца краязнаўчы, фальклорны матэрыял.

— Такія комплексы — гэта другое жыццё існуючых бібліятэк, а новыя ў раёне адчыняліся?

— Так. У нас па сацыяльных стандартах не хапала бібліятэкі ў вёсцы Юркоўшчына (мае больш як чатырыста чалавек). Адчынілі. Праўда, будынку яшчэ трэба перажыць рамонт, але чытачоў ужо абслугоўваем. Больш патрэбы няма — у раёне 25 бібліятэк, і гэтага дастаткова.

Адзінае, што мы ў наступным годзе плануем арганізаваць — працу бібліятэчнага аўтобуса, каб абслугоўваць маланаселеныя вёскі. Бібліятэкары да гэтых вёсак дабіраюцца і цяпер — сядаюць на веласіпед ці на рэйсавы аўтобус і вязуць кнігі. Таму спецыялізаваны аўтобус сёння вельмі важны, каб аператыўна забяспечыць насельніцтва літаратурай, перыёдыкай і палегчыць працу бібліятэкарам.

Канцэрт заказвалі?

— Мы гаварылі пра тое, што адчынілася, а зачыняць што-небудзь прыйшлося?

— У апошнія пяць год мы нічога не зачынялі — стараемся захаваць усё тое, што маем. Але такі перыяд, калі зачыняліся сельскія клубы, перажылі. Праўда, там такія клубы стаялі, што іх і ўстановамі культуры назваць цяжка. Напрыклад, у вёсцы Камень у нас вельмі моцны Дом культуры, а побач — у Бабчы — такі, што немагчыма працаваць. Грошы на яго аднаўленне знайсці вельмі цяжка. Ну, і навошта дзве такія ўстановы на адлегласці пяць кіламетраў? Зачынілі. Няхай моладзь прыходзіць таньчыць у Каменскі ДК, дзе добрая апаратура, усё ўпарадкавана. А для пажылых людзей у Бабчу прыедзе аўтаклуб з канцэртам. Мы з 2007 года практыкуем такія канцэрты ў маланаселеных вёсках ці вёсках без клуба. Прыязджае калектыў і выступае на адкрытым паветры, калі цёпла, у магазіне, у хаце нашых сельскіх актывістаў.

Гістарычная каштоўнасць

— Пытанне пра захаванне і рэстаўрацыю архітэктурных помнікаў — адно з самых надзённых пытанняў у кожным раёне. А як справы ідуць на Лепельшчыне?

— Увогуле у нас 47 гісторыка-культурных каштоўнасцяў, якія ўвайшлі ў збор помнікаў нашай рэспублікі. Самыя значныя з іх — помнікі архітэктуры: дзеючы касцёл Св. Казіміра, дзеючая царква Параскевы Пятніцы, будынак вузла сувязі, які, дарэчы, не так даўно адрэстаўравалі. У нас ёсць помнік гідратэхнічнага збудавання — ГЭС, таксама дзейнічае. Плануем рэстаўраваць будынак вінна-ачышчальнага склада. Будынак у цэнтры горада, перададзены на баланс аддзела культуры, і хочам размясціць там краязнаўчы музей. Цяпер як мага хутчэй стараемся зрабіць рэстаўрацыйны праект. Канечне, грошай гэта вымагае вялікіх, і часу патрабуе таксама. Але наш Лепельскі райвыканкам разумее, што гэта трэба рабіць: будынак нам перададзены, праца праекціроўшчыкаў распачата. Так што ёсць прыемныя моманты, але і праблем хапае.

— А што неабходна рэстаўраваць у першую чаргу?

— Будынак спіртзавода ў Таронкавічах. Хаця ён цяпер знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, і гаспадар абавязваецца зрабіць кансервацыю, таму што будынак разбураецца. Там унутры нічога не захавалася, але сама кладка — унікальная.

А пакуль з нерэальнага, але жаданага, наш Губінскі касцёл. Ад яго засталіся толькі фрагменты сценаў. Рэшткі. І зарэгістраваны ён — "рэшткі Губінскага касцёла". Цяпер толькі на фотаздымках бачна, які ён прыгожы быў...

— У раёне пайшлі па шляху перадачы помнікаў у асабістую ўласнасць?

— Будынак у Таронкавічах — пакуль што адзіны выпадак. Раней ён знаходзіўся на балансе сельскагаспадарчага прадпрыемства, а там лішніх грошай, зразумела, няма. Прыйшлося прадаць. Але мы сочым за яго станам. Культавыя будынкі перадалі праваслаўнай царкве і каталіцкаму касцёлу. Карацей, розныя шляхі шукаем, каб захаваць помнікі.

— А як на Лепельшчыне захоўваюцца нематэрыяльныя каштоўнасці?

— Гэты накірунак не застаецца па-за ўвагай. Адзін з самых цікавых прыкладаў — Стайская дзіцячая школа мастацтваў. Там працуюць па праграме адраджэння і развіцця аўтэнтычнай культуры. Ёсць узорны фальклорны калектыў "Сунічкі". У яго рэпертуары выключна мясцовыя песні, танцы, музыка; касцюмы адпавядаюць старажытным лепельскім строям. У гэтым годзе на Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва "Берагіня" калектыў ганараваны дыпломам ЮНЕСКА за захаванне культуры. "Сунічкам" выдзелены сродкі са спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, і хутка мы набудзем для калектыву новыя інструменты.

Апантаныя кадры

— Адно з самых балючых пытанняў для раённых культурных устаноў — кадры. Як вы яго вырашаеце?

— Даём накіраванні. У мінулым годзе да нас вярнуліся 13 выпускнікоў. Для сферы культуры гэта нямала. Планавалася нават больш, але нехта паступіў пасля каледжа ва універсітэт, нехта пайшоў у войска. Дапамагае вырашаць праблему кадраў школа мастацтваў. З больш чым васьміста вучняў абавязкова знаходзяцца тыя, хто звязвае свой лёс з культурай і вяртаецца працаваць на Лепельшчыну.

Мы вядзём і сельскую моладзь. Тыя, хто актыўна гуляў у КВЗ, удзельнічаў у нашым конкурсе для таленавітай сельскай моладзі "Белыя росы", потым становяцца работнікамі культуры. Вось прыклад: дырэктар Каменскага дома культуры Анжэла Пятрышча — колішняя пераможца гэтага конкурсу. Моладзь, з якой мы некалі працавалі, да нас вяртаецца.

Асноўныя нашы задачы цяпер — вырашэнне кадравага пытання (хочацца, не толькі вырашыць колькасна, каб усе вакансіі былі закрытыя, але і каб яны былі закрытыя людзьмі апантанымі сваёй справай) і захаванне таго, што ўжо створана (стварыць калектыў — адна справа, і зусім іншая — зрабіць так, каб ён увесь час працаваў і знаходзіўся ў творчым пошуку). Стараемся спраўляцца.

Гутарыла
Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ
Фота аўтара

Малая радзіма... дзіцячы дом

Клецкі дзіцячы дом, дырэктарам якога з'яўляецца Сяргей Васільевіч Алейчык, старэйшы ў Мінскай вобласці. Сама ўстанова знаходзіцца ў вёсцы Даматканавічы. Да ведама, у Мінскай вобласці толькі тры дзіцячыя дамы: у Клецку, Старых Дарогах і Жодзінскі дашкольны дзіцячы дом, а так — дамы сямейнага тыпу, школы-інтэрнаты... Са слоў намесніка дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Ганны УЛАСЕНЬ, па некаторых звестках, першае ўпамінанне пра дзіцячы дом датуецца 1942 годам: дзятву з Клецка, бацькі якіх загінулі, сабралі і пешшу прывялі сюды, у мястэчка Студзянец, як яно тады называлася, у памяшканне былога панскага маёнтка. Сам навучальна-адміністрацыйны будынак велічны, старажытны — пачатку XIX стагоддзя. А афіцыйны адлік гісторыі дзіцячага дома распачынаецца з 1944-га, так што ўлетку будзе юбілей — 65 гадоў.

Раней тут былі сіроты, так бы мовіць, біялагічныя. А на сённяшні дзень, як зазначае Ганна Аляксандраўна, асноўная колькасць дзяцей — сацыяльныя сіроты. Хоць слова "сацыяльны" ёй не вельмі падабаецца, гучыць неяк холадна, безаблічна, казённа. З 63 выхаванцаў толькі 5 поўных сірот. Усе дзеці з Мінскай вобласці, а з Клецкага раёна — менш як 20 чалавек. Таксама ва ўстанове ёсць аддзяленне сацыяльнага прытулку на 14 месцаў. Тут знаходзяцца дзеці, якія часова адабраныя з сям'і, і бацькі яшчэ маюць магчымасць выправіцца: кінуць піць, уладкавацца на працу, навесці ў доме парадак, наведваць тут сваё дзіця і потым забраць дахаты. У большасці выпадкаў так і адбываецца.

У жылых карпусах утульна, чыста, прыбрана, прыгожа... Умовы выдатныя, але, як кажуць, як бы ні было добра — гэта не родны дом з роднымі бацькамі. Хоць некаторыя выпускнікі лічаць яго сваёй маленькай радзімай, наведваюцца сюды ўжо са сваімі дзецьмі і ўнукамі.

Ёсць і блок сямейнага тыпу з добра абсталяванай кухняй і асобным санвузлом: тут жывуць выпускнікі — дзяўчаты і хлопцы, — самі гатуюць, прыбіраюць, адным словам, вучацца жыць самастойна.

У дзіцячым доме працуе 11 выхавальнікаў, большасць з іх месцічы, з Даматканавічаў, і з суседніх вёсак, а таксама ў іх ліку два маладыя спецыялісты: псіхолаг і сацыяльны педагог, самі яны з Баранавіч, а сюды патрапілі па размеркаванні. Абслугоўваючы персанал таксама з Даматканавічаў, так што гэта ўстанова яшчэ і дапамагае мясцовым жыхарам з рабочымі месцамі. А працаўнікі тут патрэбныя, бо ў дзіцячага дома вялікая тэрыторыя — 46,5 гектара: добры сад з ігрушамі, яблынямі, сліўкамі, агарод, ёсць коні, свінаферма, а побач — возера, дзе можна лавіць рыбу, купацца і загараць. Адным словам, натуральная гаспадарка: самі сябе ўсім забяспечваюць.

Пераважная колькасць дзяцей мае ўзрост ад 14 да 17 гадоў, маленькіх амаль няма. Ёсць адзін хлопчык 6 гадоў, які ходзіць у дзіцячы садок у вёсцы. Увогуле, дзеці тут толькі жывуць і займаюцца ў розных гуртках, а вучацца ў вясковай школе. Настаўнікі не робяць ніякіх адрозненняў: ці дзіцё з вёскі, ці з дзіцячага дома. Ды і з мясцовымі дзецьмі здавён наладзіліся вельмі добрыя стасункі: разам вучацца, гуляюць, сябруюць, ходзяць адно да аднаго ў госці. Ладкуюцца сумесныя выстаўкі, конкурсы, спартландыі, дыскатэкі. Ёсць і агульная футбольная каманда, якая не можа існаваць сама па сабе: асобна без дзетдомаўскіх або вясковых хлопцаў. У бібліятэку дзіцячага дома, якая мае багаты кніжны фонд, утульную чытальную залу, запісаныя сельскія дзеці. Нават начальнік раённага аддзела адукацыі тут запісаны.

У адпаведнасці з выказваннем, што неталенавітых людзей не бывае, пацвярджаннем паўстае і Клецкі дзіцячы дом. У ім шмат таленавітых дзяцей, якія займаюцца спевамі, музыкай, танцамі, мастацка-прыкладной творчасцю: вышыванне, пляценне з бісеру, стужкавы дызайн, вязанне кручком, саломапляценне; самі для сябе шыюць тапачкі, падушкі, робяць навагоднія маскі... У навучальна-адміністрацыйным корпусе працуюць разнастайныя гурткі: клас харэаграфіі, мастацкай працы, майстэрня разьбы па дрэве... Выдаецца свайго кшталту часопіс "Наш дом" (рэдактар — семнаццацігадовы выхаванец Андрэй Бразгоўка).

Дзятва актыўна і з задавальненнем наведвае гурток "Скарбніца". Цяпер яны малююць карціны да новага конкурсу, прысвечанага 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У памяшканні — персанальныя выстаўкі 11-класнікаў Аляксандра Рыдака і Кацярыны Макарэвіч. Увогуле, выхаванцы актыўна і плённа ўдзельнічаюць у розных як рэспубліканскіх, так і абласных конкурсах: за гэты год атрымалі ўжо 9 дыпломаў.

А яшчэ, існуе орган дзіцячага самакіравання, так званы парламент. Стварылі краму, прыдумалі і выпусцілі сваю "валюту" — "САН": першыя літары імёнаў заснавальнікаў, тых, хто прапанаваў гэту задуму: Сяргей, Андрэй ды Наталля. Таксама прыдумалі сістэму матэрыяльнага стымулявання і штрафаў: за што дзеці могуць зарабіць грошы, а за што пазбавіцца іх. Самі ж і прадаўцамі працуюць. У першую чаргу, вядома ж, дзеці, карыстаюцца попытам розныя прысмакі. Вядзецца часопіс паступлення тавараў, працуе рэвізійная камісія з дзяцей, якія правяраюць казначэя, што выдае грошы, і прадаўцоў, каб ўсё было без парушэнняў.

Ганна Уласень падкрэслівае, што вольны час яны праводзяць па-рознаму, але не імкнуцца заняць яго толькі выхаваўчымі мерапрыемствамі, каб не было казарменнай муштры: прыйшлі строем, паслухалі, вывучылі ўрокі і да т.п. Намагаюцца наблізіць адносіны да сямейных, побыт да хатняга, хоць да дзіцячага дома гэта і не вельмі дапасоўваецца. Галоўнае, каб усе выхаваўчыя моманты ішлі ў працэсе жыцця, без прымусу...

Віктар КАВАЛЁЎ
Фота аўтара

Рака часу

Выдатны падарунак да свайго 70-годдзя зрабіў пісьменнік з Пецярбурга Уладзімір Кароль, выдаўшы кнігу "Рака часу" ("Река времени", СПб.: Политехника-сервис, 2009, 156 стар.). Аднак, гэта не столькі падарунак пісьменніка самому сабе. Кніга "Рака часу" найперш уяўляецца мне помнікам Уладзіміра Караля сваёй роднай вёсачцы Макаўка, якая знаходзіцца ў Бялыніцкім раёне. Яна ж, думаецца, яшчэ і досыць яскравы прыклад для іншых пісьменнікаў і журналістаў, гісторыкаў: пішыце, спадары, кнігі пра свае родныя вёскі!

Бадай, у кожнага з нас ёсць свая Макаўка. У Каралёвай Макаўцы сёння ціха, бязлюдна. Жыццё цепліцца толькі ў некалькіх хатах, у якіх датупваюць свой век усяго адзінаццаць чалавек. А было ж, было — напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны Макаўка налічвала 52 двары і каля 200 жыхароў.

Пройдзе яшчэ колькі часу — і не стане паселішча.

Як адзначае аўтар прадмовы да кнігі "Рака часу" доктар філалагічных навук, старшыня Санкт-Пецярбургскай асацыяцыі беларусаў Мікола Нікалаеў "...у сучасным беларускім гістарычна-мемуарным жанры Уладзімір Кароль не адзіноки. Толькі ў Пецярбургу ў новым тысячагоддзі з'явіліся важныя для гэтай тэмы працы генерала-сувязіста Віталя Кананюка (родам з г. Сянно Віцебскай вобласці) і прафесара-медыка Мікалая Гурына (з Навагрудка). А надрукаваная Лявонам Юрэвічам у кнізе "Беларуская мемуарыстыка на эміграцыі" бібліяграфія змяшчае 27 назваў асобных кніг і 171 мемуарны артыкул".

На багатым фактычным матэрыяле, які складаюць успаміны аднавяскоўцаў і аўтара, зместкі Нацыянальнага гістарычнага архіва ў Мінску, Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расіі, інфармацыя рэдкіх выданняў, адшуканых у багатых бібліятэках Санкт-Пецярбурга, Уладзімір Кароль стварыў запамінальную і надзвычай маляўнічую карціну гісторыі роднай вёскі і свайго радаводу — напісаў кнігу паўсядзённага побыту вяскоўцаў на працягу прыкладна стогадовага адрэзку часу.

Сама вёска Макаўка ўзнікла, вобразна кажучы, у чыстым полі. У 1902 годзе першымі тут паставілі хаты, набыўшы зямлю ў сямікаўскага пана, сем'і Сцяпана Прыёмкі, Кандрата Караля, Канстанціна Брылеўскага, Мікалая Жукоўскага, Івана Ліпая, Агея Качана, якія перабраліся сюды, пакутуючы ад малазямелля, з Ігуменшчыны, Уздзеншчыны. Пазней да навасёлаў далучыліся яшчэ колькі сялянскіх сем'яў з ваколіцаў Асіповічаў, Клічава, Беразіно.

Пісьменнік прыводзіць успаміны свайго дзеда Кандрата Караля, які так распавядаў аб рашэнні пераехаць на новую зямлю: "У мяне было чатыры сыны, і ў брата майго быў сын. Надзел зямлі нам дастаўся ад бацькоў невялікі. Аднойчы пан, у якога я служыў кучарам (а ім быў якраз сусветна вядомы сёння "прафесар электраграфіі і магнетызму" Якуб Наркевіч-Ёдка. — **М. К.**), параіў мне купіць зямлю, якую распрадаваў яго знаёмы. Маёнтак таго пана знаходзіўся ў бялыніцкай Сямікаўцы"...

Пры выхаванні маладога пакалення макаўцаў, заўважае пісьменнік, бацькі іх вялікую ўвагу звярталі на захаванне культурных і сямейных традыцый. Нямногія жыхары навакольных вёсак могуць ганарыцца такім узроўнем адукаванасці, які мела насельніцтва Макаўкі. У розныя гады з яго шэрагаў выйшлі дваццаць адзін настаўнік, пісьменнік, дзевяць медыкаў, больш як пятнаццаць афіцэраў, адзін з якіх камандаваў дывізіяй, два інжынеры, пяць былых макаўцаў пакінулі свой след у грамадзянскай авіяцыі.

Неўзабаве Кандрат наведаўся ў гэтыя мясціны. Яны яму спадабаліся.

Зразумела, падзяліўся ўражаннямі з аднавяскоўцамі. А вясной 1902 года перасяленцы на набытай зямлі пачалі карчаваць лес ды хмызнякі, заворваць першыя палосы зямлі.

Крок за крокам лес і хмызнякі саступалі месца полю. Новыя ўчасткі атрымлівалі і новыя найменні. Частка поля, што на паўднёвым усходзе ад Макаўкі, стала называцца Замосцем. На захад ад яго яшчэ адно поле атрымала назву Дубоўка — ад велічных дубоў, якія стаялі на ім.

Гэта поле асабліва памятнае для Уладзіміра Караля і тым, што 9 мая 1945 года ён разам са стрыечнай сястрой Рэняй прымчаліся сюды, каб паведаміць аднавяскоўцам, якія тут садзілі бульбу, шчымліва-радасную вестку аб перамозе.

Да 1917 года макаўцы разлічыліся з сялянскім банкам, у якім узялі крэдыты на набыццё зямлі, цвёрда сталі на ногі. Гандлявалі зернем, жывёлай. "Ці вялікі збіралі ўраджай?" — задае пытанне аўтар. І адказвае: "Аб гэтым можна меркаваць па гумнах і свірнах. Я помню гэтыя "вымяральнікі" сялянскай працы... Дваццаць пяць гумнаў налічвалася ў макаўцаў. Выдатна помню свой свіран і свіран братоў Стэльмахаў. Пад адным дахам іхні свіран меў чатыры аддзяленні, кожнае на брата, з асобнымі дзвярыма. У пасляваенны час у гэтым свіране захоўвалася збожжа, вырашчанае працаўнікамі мясцовага калгаса "Зара", гэта значыць, былымі гаспадарамі макаўскай зямлі. Для патрэбаў калгаса выкарыстоўваліся толькі чатыры гумны. Вось так! А зямля засявалася, як і раней. Толькі гэта была ўжо не свая зямля, а калгасная..."

Безумоўна, ёсць у гэтым значная віна гвалтоўнай калектывізацыі, правядзення разнастайных эксперыментаў над селянінам.

І Макаўку не абышло раскулачванне. Пацярпеў ад несправядлівасці і родны дзядзька пісьменніка Сямён Кароль. У 1939 годзе яго арыштавалі як ворага народа. Аднак, выручыў малодшы брат Данііла, які за ўдзел у савецка-фінскай вайне быў узнагароджаны ордэнам. Атрымліваючы ў Крамлі з рук Калініна ўзнагароду, Данііла перадаў яму загадзя напісаны ліст. Так Сямён апынуўся на волі. Папрацаваў крыху ў Ленінградзе, а затым вярнуўся ў Макаўку. Ён быў майстравітым чалавекам. У час вайны вырабляў для партызан прыстасаванні, пры дапамозе якіх тыя пускалі пад адхон варожыя цягнікі, рамантаваў зброю, рабіў для аўтаматаў прыклады. Узімку 1943 Сямёна Караля расстралялі фашысты. Яго сын Мікалай перажыў бацьку толькі на пяць гадоў і памёр у пятнаццацігадовым узросце — увосень касіў каля возера траву, застудзіў ногі. Лекаў не было...

"Прымружу на хвіліну вочы, — чытаем у кнізе "Рака часу", — і, здаецца, бачу перад сабой вялікую хату Мікалая Жукоўскага. У ёй часта збіралася на вячоркі моладзь, бо ўсе дзеці Мікалая Ягоравіча былі музыкамі. Яны выдатна гралі на гармоніку, цымбалах, скрыпцы, бубне. Вось такім быў іх сямейны аркестр. Яго сын Іван не толькі выдатна граў на гармоніку ды цымбалах, але і майстраваў іх, чым таксама праславіўся на ўсё навакольле.

У 1938 годзе гаспадар гэтай добрай, працавітай сямейкі Кандрат Высеўка быў без віны прыгавораны да вышэйшай меры пакарання, рэабілітаваны — праз 60 гадоў. Ірына Якаўлеўна адна расціла дзвюх дачок і сына. Мікалай да вайны паспеў яшчэ папрацаваць настаўнікам пачатковых класаў. На фронце быў з 1941 года"...

Лепш зразумець гісторыю вёскі, лёсы яе жыхароў дапамагае багаты ілюстрацыйны матэрыял. У выданні змешчана больш за дзвесце розных фотаздымкаў.

Пры выхаванні маладога пакалення макаўцаў, заўважае пісьменнік, бацькі іх вялікую ўвагу звярталі на захаванне культурных і сямейных традыцый. Нямногія жыхары навакольных вёсак могуць ганарыцца такім узроўнем адукаванасці, які мела насельніцтва Макаўкі. У розныя гады з яго шэрагаў выйшлі дваццаць адзін настаўнік, пісьменнік, дзевяць медыкаў, больш як пятнаццаць афіцэраў, адзін з якіх камандаваў дывізіяй, два інжынеры, пяць былых макаўцаў пакінулі свой след у грамадзянскай авіяцыі. Да ліку апошніх належыць і сам Уладзімір Кароль, які пэўны час служыў у ваеннай авіяцыі, да выхаду на пенсію працаваў у Пецярбургскім авіяпрадпрыемстве "Пулкава", а гісторыі развіцця паветраплавання прысвяціў некалькі кніг, сярод іх "В небе России", "Крылья Петербурга", "Воздушная гавань Петербурга", "Земля и небо генерала А. М. Кованько" і інш.

Напрыканцы яшчэ раз згадаю беларускага пецярбуржца Міколу Нікалаева і пагаджуся з ім, што кніга Уладзіміра Караля "не дасць часу панесці ў нябыт кавалачак нашай гісторыі і забыцца на лёсы цікавых людзей, што звязаныя з радаводам аўтара і з маленькай вёсачкай Макаўкай".

Міхась КАРПЕЧАНКА

Запрашэнне да роздуму

З нецярплівасцю чакаў чарговы нумар "Нёмана", каб пачытаць заканчэнне дзённіка Георгія Марчука "Салодкія слёзы" ў аўтарскім перакладзе на рускую мову (№ 10 за 2007 год, № 1 за 2008-ы, № 2, 3, 4 за 2009-ы). Пісьменнік, як заўсёды, у гушчы жыцця: у запісах бачыш перш за ўсё не аўтара, а іншых людзей і падзеі. Людзей адметных, неардынарных, падзеі — цікавыя, важныя. Адбываецца работа душы — аўтар працуе сам і прымушае рабіць гэта іншых.

Пісьменнік асэнсоўвае актуальныя праблемы палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця краіны, грамадства. Тут і роздум, звязаны з падзеямі ў сучасны момант, і ўспаміны пра землякоў, сяброў — таварышаў, а таксама і пра тых, хто выклікаў да сябе негатыўныя адносіны. Г. Марчук падкрэслівае: "Дневник для меня не фотография. Прожитый день не только факт жизни. Люблю анализировать его, порассуждать на его примере о вечном, поразмыслить над смыслом жизни". Сапраўды, жыццё чалавека шматаблічнае і непрадказальнае.

У сваіх дзённікавых запісах Г. Марчук падкрэслівае, што самае моцнае пачуццё радзімы — гэта пачуццё любові да бацькоўскага дому, і няма сапраўднага патрыятызму без гонару за сваё мястэчка, школу, вуліцу, раён. Надзвычай цікавыя і неардынарныя развагі пра творчасць, літаратуру, мастацтва, кіно, драматургію. Напрыклад: "Вот одна из загадок творчества — увидеть результат, которому рады другие".

У дзённіку Г. Марчука — занепакоенасць абмежаваннем ужытку роднай мовы, станам выдання беларускамоўных кніг і чытацкага попыту: "Со смертью книги на родном языке умрет и нация". Цэлая галерэя творчых людзей — рэжысёраў, пісьменнікаў, акцёраў, іншых дзеячаў мастацтва паўстае перад чытачом. З павагай і гонарам расказвае аўтар пра сваіх родных і блізкіх. Піша і пра сябе — самакрытычна, без прыхарошвання, бескампрамісна, жорстка, прызнае свае памылкі, сумненні.

Дзённік свой пісьменнік вядзе больш як сорак год, амаль паўстагоддзя. Што адметна: запісы ў ім размешчаны не па храналогіі, а па змесце, па нейкім унутраным стрыжні. Дзякуючы аўтару значна пашыраецца кругагляд чытача, перад ім паўстаюць і жыццё пісьменніка і драматурга, і гісторыя краіны. Думкі ж, выкладзеныя ў творы, глыбокія: "Жизнь — это не мед, но она вкуснее меда", "Старость — это кораблекрушение, в котором никто не спасется"... Можна сказаць, гэта не дзённік, а хроніка-роздум, развагі.

Пісьменнік валодае ўменнем і ў адным дні ўбачыць вечнасць. Убачыць — і паказаць гэта нам, удзячным чытачам.

Міхась КАВАЛЁЎ

Патрабаванні да дзіцячай літаратуры

Незвычайная вобразнасць мыслення, багацце і маляўнічасць фантазіі, эмацыянальнасць, няўтольная цікаўнасць — без гэтых рысаў мы не ўяўляем характар дзіцяці. Успрыманне ім мастацтва — непасрэднае, мастакоўскае. Паводле І. Паўлава, кожнае нармальна развітае дзіця мае мастакоўскі тып мыслення, "малюе жыццё як мастак, як рамантык, як драматург, як акцёр".

Дзяцінства — паняцце неаднароднае. Кожная "прыступка" мае свае асаблівасці, узроставыя рысы. У дашкольнікаў, напрыклад, фантастычны свет падпарадкоўвае сабе ўсё астатняе, паэзію яны ўспрымаюць лепш, чым прозу. У дзяцей малодшага школьнага ўзросту пераважае канкрэтнасць і разам з тым вобразнасць мыслення пры мінімальнай здольнасці да абстракцыі. У сярэднім узросце з'яўляецца цікавасць да ўзаемаадносін паміж людзьмі, імкненне да вандраванняў і гераічнай рамантыкі. Самы неўраўнаважаны, крытычны — падлеткавы ўзрост, калі на рубяжы дзяцінства і юнацтва фарміруецца светапогляд, развіваецца абстрактнае мысленне, адбываюцца самапаглыбленне, пераацэнка каштоўнасцей.

Аднак літаратура ні ў якім разе не можа быць статычна прымацавана да пэўных узроставых перыядаў, што вызначаюцца педагогікай. Узроставая схема, педагагічнае ўяўленне аб узросце — ці могуць вычарпаць яны жывую разнастайнасць індывідуальных дзіцячых характараў, абумоўленую як фактарамі грамадскімі, так і прыроднымі, біялагічнымі? Узроставыя "паверхі" застануцца толькі педагагічнай схемай, калі яны не будуць напоўнены багатым і разнастайным жыццёвым зместам. Выдатныя майстры дзіцячай літаратуры сцвярджалі: літаратура павінна апераджаць узрост, весці дзіця да новых рубяжоў і вышынь. Літаратура абавязкова павінна клапаціцца аб тым, каб, з аднаго боку, не было ненатуральнага, несвоечасовага развіцця духу, паводле слоў В. Бялінскага, калі дзіця ператвараецца ў мудрага старога, і празмернай наіўнасці, запозненай інфантыльнасці — з іншага.

Дзіцячая літаратура павінна быць перш за ўсё літаратурай, а потым ужо дзіцячай. Усе значныя мастацкія творы ўваходзяць у кола дзіцячага чытання. У той жа час многія кнігі, прызначаныя менавіта для дзяцей, не дасягаюць свайго адрасата. А лепшыя творы дзіцячай літаратуры прыносяць эстэтычную асалоду як малому, так і даросламу чытачу.

Такое ўзаемапранікненне, здавалася б, розных літаратурных "сфер" адмаўляе вузкі, "ведамасны" падыход да найбольш складанага пытання аб спецыфіцы дзіцячай літаратуры. У шырокім плане мы не можам не прызнаць, што дзіцячая літаратура падпарадкоўваецца тым жа агульным законам і патрабаванням, тым жа эстэтычным крытэрыям, што і літаратура для дарослых. Аднак праблема жыццёвай праўды ў дзіцячай літаратуры мае сваю спецыфіку. Тут пачуццё мастацкай меры павінна быць асабліва тонкім і беспамылковым, каб, засцерагаючыся ад празмернасцей, не траўміраваць далікатную душу дзіцяці.

Спецыфіка дзіцячай літаратуры дыктуецца перш за ўсё асаблівасцямі дзяцінства, узроставага бачання, успрымання, якія вызначаюць адметнасць "дзіцячай мовы" ў шырокім сэнсе слова. Спецыфіка, такім чынам, закранае не саму мастацкую прыроду твораў, не агульныя эстэтычныя законы, а канкрэтныя формы выяўлення мастацтва. Можна назваць мноства праблем, што спецыфічна вырашаюцца ў дзіцячай літаратуры, але не з'яўляюцца яе выключнай прыналежнасцю. І сюжэтна-кампазіцыйная будова, і жанрава-стылёвая сістэма, маючы адзіную мастацкую аснову ў "дарослай" і дзіцячай літаратурах, разам з тым захоўваюць і свае асаблівасці.

Вядома, што дзеці — даверлівыя, праўдзівыя, сумленныя, і таму яны надзвычай востра адчуваюць фальш, падробку, ненатуральнасць. Па сваёй прыродзе яны аптымістычныя, таму нешчаслівая канцоўка ў творы павінна быць асабліва аргументавана, абумоўлена жыццёвай неабходнасцю. Дзеці захапляюцца дзеяннем, не любяць падрабязнасцей, доўгіх апісанняў, сузіральнасці. Гэтыя своеасаблівасці адзначаў А. Макаранка. Можна пагадзіцца з ім і ў тым, што для малодшага ўзросту неабходнае размежаванне светлага і цёмнага, што асаблівую важнасць набываюць прастата апавядання і мовы, займальнасць фабулы, лагічная паслядоўнасць, дасціпнасць, што дзіцячай літаратуры супрацьпаказаны слоўная вытанчанасць, ускладненасць характараў. Безумоўна, усё гэта ахоплівае толькі самыя агульныя яе асаблівасці, якія ў кожным асобным выпадку выяўляюцца па-свойму.

Між тым, даволі часта спасылкай на "спецыфіку" прыкрываюць спробы аддаліць дзіцячую літаратуру ад важных агульналітаратурных задач, абмежаваць яе вузкім колам так званых дзіцячых тэм, апраўдаць шэрасць і прымітывізм у адлюстраванні рэчаіснасці.

Спецыфічнае і агульнае ў дзіцячай літаратуры ўвесь час пераплятаецца. Задача ж даследчыка заключаецца ў тым, каб раскрыць іх дыялектычныя ўзаемаадносіны ў творчасці пісьменніка, яго здольнасць знаходзіць тую мастацкую меру, дзякуючы якой адлюстраванне жывой рэчаіснасці будзе адпавядаць дзіцячаму ўспрыманню і мысленню.

Анатоль ТРАФІМЧЫК

Ракурсы

Сучасная беларуская паэзія актыўна асвойвае рэлігійную праблематыку. Няма паэта, які б у сваёй творчасці свядома ці падсвядома не звяртаўся б да Бога, да космасу, да вышэйшых пачаткаў. І гэта ўжо стала заканамернасцю, калі паэтычная інтуіцыя судакранаецца з боскімі азарэннямі. Паэзія заўсёды імкнулася да асэнсавання жыцця і смерці, да нейкіх гранічных сітуацый. І менавіта ёй, паэзіі, гэта ўдавалася найбольш поўна. Таму можна з пэўнай доляй дапушчэння сказаць, што паэзія нясе з сабой і рэлігійнасць, хоць і ў яе секулярызаваным варыянце.

Спроба аналізу сучаснай беларускай паэзіі і рэлігійнага натхнення

Паэзія асэнсоўвае тое, чаго не можа выявіць поўнасцю проза і драматургія, бо менавіта ў ёй б'ецца аголены нерв пачуцця на апошнім яго дыханні. Імкненне дайсці да апошняй мяжы і складае ў значнай ступені сутнасць паэзіі. І тут ёсць пэўны парадокс, калі рэлігійнасць патрабуе пэўнасці, закончанасці, а паэзія з'яўляецца пэўнай ерассю, адыходам ад канонаў, бясконцасцю часта не самага лепшага характару. Але гэтак не скрозь. Ёсць пэўная галіна сапраўднай рэлігійнай паэзіі, адухоўленай у самой сутнасці, а ёсць гульня ў рэлігію, калі паэт штучна выбудоўвае славесныя канструкцыі і імкнецца даказаць правамернасць свайго індывідуалізму. Паэт перажасэнсоўвае ў дадзеным выпадку рэлігійнасць у свой бок, калі яго апаноўвае нейкае суб'ектыўнае азарэнне і вядзе далёка ад сапраўднай рэлігійнасці. Атрымоўваецца нейкі шызафрэнічны містычны рэбус, калі адбываецца раздваенне асобы, якая ўсё больш і больш ухіляецца ад сваёй ісціннай сутнасці. Спынімся на апошнім.

Вось напрыклад, як рэфлексуе ў гэтым плане Вадзім Корань:

А так я п'ю віно —
Хрыстову кроў,
А пахмяляюся
Рэмбо з Апалінерам,
Выкрэсліваю дні
З календароў,
Чытаю ўночы
Толькі сімвал веры.

Паэт проста даходзіць да блюзнерства ў сваім вынаходніцтве, калі містыфікуе самы звычайны фізіялагічны працэс, хоць і прыкрыты высокім пафасным гучаннем. І думаецца: навошта віно параўноўваць з Хрыстовай крывёю? Мабыць, задача паэта — проста шакіраваць чытача. Дык гэтага ён дабіваецца. Але што стаіць за сказаным? У чым яго сэнс?

В. Корань досыць вольна абыходзіцца з рэлігійнымі сутнасцямі, хаця трэба ўсвядоміць, што ў хрысціянстве ёсць святыя дагматы і каноны, якія не могуць станавіцца гульнёй слова, бо яны самі з'яўляюцца велічным Словам, непарушным у сваёй святасці.

Яшчэ ў В. Кораня ёсць верш, прысвечаны светлай памяці Папы Рымскага Яна Паўла II (паэта Караля Вайтылы):

Чорны крыжык
На белай сцяне
Плача
Ад адзіноты.
Слёзаў бляск
Дыяментавы.
Ave Maria.

Хочацца толькі запытаць у паэта, чаму "чорны крыжык... плача ад адзіноты"? Адзінота і адчай — якасці, адмоўныя ў хрысціянстве. Ці можна быць адзінокім з Богам? Безумоўна, не, бо Бог дае радасць, духоўную сілу, моц. І чалавек, уводзячы сябе ў грахоўны стан, адчувае сябе адзінокім. І чорны крыжык не можа плакаць ад адзіноты, бо ў ім уся сіла боская, ён сімвал неўміручасці Хрыста, яго вечнага існавання. В. Корань зноў гуляе з хрысціянскай сімволікай, суб'ектыўна і адвольна высноўвае сваю вобразнасць. Яго творчасць на рэлігійную тэматыку з'яўляецца данінай постмадэрнісцкай гульні ў слова, для якой няма адзінага духоўнага цэнтра, таму можна пачынаць цэнтрацыю адкуль заўгодна і парушаць звычайную логіку рэчаў — да ўзроўню поўнага абсурду. Таму нездарма ў паэта мы сустракаем наступныя радкі:

Я ніколі не быў
Чыімсьці богам.
Я ніколі не быў.
Ніколі
Не
Быў...

Зноў задача аўтара — шакіраваць чытача.

Ярына Дашына ў вершы "Тварцу" таксама прапаноўвае сваё бачанне рэлігійнасці:

Ты ў нейкай сваёй
прынцыповасці бесцялеснай
ўзяў —
і аднойчы прыдумаў мяне
І цяпер я жыву,
і цяпер мне паветра хапае
дыхаць і задыхацца
на гэтае неба ў хмель.
Тут усе мы паціху
адно аднаго забіваем,
і ў гэтым таксама
падобныя на Цябе.
(...)
Мая адзінота —
твой эксклюзіў.

Зноў жа блізкае да папярэдняга паэта адчуванне адзіноты ("мая адзінота — твой эксклюзіў"). Тое ж дэманічнае супрацьстаянне Богу, які абвінавачваецца ў тым, што Ён з'яўляецца "забойцам". Здзіўляе неразуменне біблейскага канона, кідаецца ў вочы секулярызаванае мысленне паэтэсы, што імкнулася перадусім уразіць чытача. Усе грахі Я. Дашына прыпісвае Богу, у тым ліку і "прынцыповасць бесцялесную", нягледзячы на тое, што ў вобліку Хрыста Бог матэрыялізаваўся, паказаў сваю цялеснасць. Альбо паэтэса не задумвалася над сказаным, альбо ўсе гэтыя азарэнні прыйшлі да яе падчас дэманічнага экстазу, альбо яна — прынцыповы богаборца. Пачуццё адзіноты, што апаноўвае лірычную гераіню, — заканамернае, бо ў яе няма любові да Творцы, яна знаходзіцца ў нейкім стане канфрантацыі з Богам. Я. Дашына ў сваім творчым запале даходзіць да крайнасцяў дэманічнай рэлігійнасці.

Крыху іншыя настроі мы назіраем у Насты Кудасавай у вершы "Паэт":

Стосы лёсаў
па Вашых плячах,
Непраходных вякоў лёхі...
Калі слова было Бог —
Свет прысвечаны Вам,
бог мой!

З паэта аўтарка стварае ідэал, на якога яна проста моліцца. Шчырасць лірычнай гераіні Н. Кудасавай бянцам і ўражвае сваёй непасрэднасцю прызнання, але разам з тым і насцярожвае. Абагаўленне чалавека прыводзіць да духоўнай дэфармацыі, бо чалавеку — чалавечае, а Богу — боскае. Самы дасканалы святы заўсёды гаворыць аб сваёй грахоўнасці і слабасці. Паэт жа далёка не святы, мера павінна быць і ў такой бязмежнай краіне, як паэзія.

У адным з вершаў Аксаны Данільчык адчуваецца неверагодны адчай:

Вярніце мне маю душу.
Я — толькі думкі
рух злачынны.
Я не жыву і не пішу,
Я — толькі сон
бесперапынны.

У творы перадаецца стан страты лірычнай гераіняй яе душы. Гэта нагадвае нешта з М. Цвятаевай, калі "думкі рух злачынны" не дае супакою і гармоніі і ўвесь свет становіцца нялюбым. І ці варта ўвогуле такія вершы выносіць на шырокую аўдыторыю, ці не лепш пакідаць іх ва ўласным альбоме?..

Мы разглядаем выпадкі парушэння беларускай паэзіяй рэлігійнай нормы, калі становіцца яскрава відавочна, як працуе рэлігійнае натхненне ў дадзеным выпадку. Мы сустракаемся тут з праметэеўскай функцыяй мастацтва, якое вельмі часта аперыруе палемічнымі знакамі. Ствараецца цэлае палемічнае поле, але трэба спытаць, якой цаной. У паэзіі асабліва праяўляецца закон дысбалансу, калі выхад з нормы становіцца амаль што адзіным спосабам яе існавання, асабліва ў апошнія часы. Ствараецца ўражанне, што паэзіі патрэбна не ісціна, а нейкае эфемернае, ілюзорнае, як мяркуюць творцы, больш глыбокае пачуццё рэальнасці; вобласць ўяўляемага неймаверна пашыраецца. Калі ўяўленне становіцца абсалютам, дык пра якую ж ісціну можна тады гаварыць?

На думку адэптаў такога светаўяўлення, адхіленне ад ісціны можа нават паўней адказваць запатрабаванням духу і душы, якія (на іх погляд) вельмі і вельмі непастаянныя. Чым больш мастак ухіліўся ад нормы і ісціны, тым больш арыгінальным яго лічаць эстэты такога кшталту. Традыцыйныя ісціны і каштоўнасці, як мяркуюць апошнія, з'яўляюцца павярхоўнымі і, безумоўна, трэба паглыбіць іх намаганнем уласнай душы. Мы назіраем перараджэнне мастацтва ў мастацкую астраномію. Тут навідавоку ніцшэанская тэургія, калі няма нічога святога ("Бог памёр") і ўсё дазволена.

Рэлігійнае натхненне маладой беларускай паэзіі спрабуе разведаць і асвоіць пагранічныя галіны свядомасці, беручы на сябе ролю нейкага першаадкрывальніка, медыуму. Робіцца гэта бянцам упершыню і для выбраных, бо, маўляў, звычайным людзям, выхаваным на хрысціянскай традыцыі, многае будзе проста незразумелым. Беларуская паэзія такім чынам быццам упісваецца ў сусветны кантэкст — праз багаборства, экзальтацыю і высілкі псеўдаэстэтычнага кшталту. Але якая ж духоўна-маральная цана ўсіх гэтых вышукаў?

Паэзія павінна несці свет і дабро. І беларусу з яго спагадлівасцю і мяккасцю, задушэўнасцю і цеплынёй натуры, здаецца, не ўласціва імкненне да негатыўнага, адмоўнага. Давайце ж лепей угледземся ў сябе і паспрабуем зразумець, што ж такое сапраўдная маладая беларуская паэзія. Бо згаданыя вышэй паэты творча таленавітыя, але ў плане рэлігійнасці яны крыху збочваюць на шлях гульні з Боскім, і нібы вершы іх становяцца антытэзай духу, які заўсёды паяднаны з гарманічным і цэласным хрысціянскім ідэалам.

Зміцер САНЮК

Пара лістападу

...Снова эта песня за рекою:
Боль, тоска — аж оторопь берёт.
Но в ней есть сокрытое такое,
что и безголосый подпоёт...

Сапраўды, чуючы родную, спаконвечную песню аддаешся яе матыву і словам без астатку і яна доўга-доўга потым гучыць у тваёй душы. Як і добрыя вершы, калі яны занатаваны на паперы, і чытаюцца табой без прымусу, не толькі вачамі, а ўсімі, як кажуць, фібрамі душы.

Вершы з новай кнігі Міколы Намеснікава "Лістапад исповедальный" то добрыя, то крыху іранічныя, то сціснутыя спружынай, то раскручаныя вольным сувоем. На сёння, як на маю думку, мой малодшы літаратурны таварыш — самы моцны з рускамоўных паэтаў Віцебшчыны. І што самае не апошняе — паэт з відавочным патэнцыялам: ад кніжкі да кніжкі расце ягонае майстэрства, жаданне і ўменне сказаць сваё запаветнае.

Тэма дарогі (чытай — бясконцасці) і пошуку сябе на ёй — бадай, вызначальная ў зборніку. А яшчэ — восені, калі сама прырода задумваецца, прымушаючы кожнага з нас задумацца над існасцю быцця. Светласумна мроіцца "когда осение дожди размоют пятна жёлтой краски, вдруг что-то защемит в груди под свитером машинной вязки", або калі "ветер с дождём, как цыган с лошадиною гривой, с мокрой брусчатки сметает окурки и мысли" і "в путь собираются рябины с котомкой красной на плечах".

Ужо ў гэтых радках адчуваецца настраёвасць, ненавязліва перададзеная чытачу шляхам выбраных паэтычных тропаў. Вершы Міколы свецяцца зямной дабрынёй, спавядальнасцю, імкненнем разабрацца ў складанасці і супярэчлівасці жыццёвых калізій.

Працягваючы сказанае вышэй, адзначу, што кароткія вершы мяне задавальняюць больш, чым такія, у якіх недзе пад, шэсцьдзесят радкоў. І, наогул, вершы кшталту "Осенний дождь" з падзагалоўкам "Из Леопольда Стаффа" вымыкаюцца неяк з агульнай канвы кнігі і стаяць убаку. Ды і біблейскіх персанажаў не трэба так часта ўспамінаць, бо Пілат, Каін з Авелем, Галгофа самі па сабе нічога не гавораць; абыходзіцца трэба з імі разумна, асцярожна і далікатна, каб не заблытацца самому і не заблытаць яшчэ некага.

Пытанні, вядома, ставіць лягчэй, чым адказваць на іх. Ды аўтар новай кніжкі ўмее рабіць і гэта. І калі не адказваць, то інтрыгаваць, акрэсліваючы сваю чалавечую і грамадзянскую пазіцыю. Ну, зноў ён, папікне мяне нехта, пра сваё. Так, зноў і зноў, бо надакучылі, набілі аскоміну так званыя вершы пра ўсё і ні пра што! А Мікола (не фамільярнічаю, ведаючы яго і напісанае ім яшчэ не ў лістападаўскую, а ў маёвую пару) носіць грамадзянскасць ў сабе, прапускае праз сябе: "мы сами умываем руки и сами, плача, крест несем" і "даже привыкаем понемногу, что ходим по отеческим гробам — легко, спокойно ставим ногу"...

Дык што для Намеснікава паэзія, яе сутнасць? Сам ён у вызначэнні яе нечаканы: "Страх высоты, но хочется взлететь. А для начала — разучиться ползать..." Тут і ёсць канкрэтыка, сцісласць думкі і радка, а разам з усім — паэзія:

Пьешь золотую тоску одиночества.
Счастья — не выпало.
Славы не хочется.
Все, что имеешь, осталось с младенчества:
Имя без отчества,
дым без Отечества...

Крыху збянтэжыла, калі прачытаўшы кніжку "Листопад исповедальный" знайшоў у ёй толькі два-тры вершы пра каханне. Няхай даруе мне аўтар, але ў ягоным узросце... А, можа, для такога вялікага і неабдымнага пачуцця яшчэ шукаюцца і адпаведныя словы?

Як бы там ні было, Мікола Намеснікаў сапраўды ў пошуку сябе, свайго "я" ў паэзіі. Ён раздумвае над прачытаным, згадвае на старонках кніжкі імёны Фета, Таркоўскага, Рубцова. Юрыя Кузняцова ў пераліку няма, але цень гэтага выдатнага рускага паэта няўлоўна вітае ў вершы "Оторвавшись от мыслей тревожных..." І нічога дрэннага тут няма: постаці вялікіх, іх бясцэнны паэтычны вопыт не перашкодзіць, хаця і бар'ер, узяць які зусім нялёгка і нават немагчыма. Але ўсё роўна, шукаючы, позна або рана, знойдзеш шуканае. Тым больш, калі табе самому дадзены талент і натхненне.

Алег САЛТУК

Кніжная паліца

У рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва" пабачыў свет калектыўны зборнік паэзіі *"Залатое жыта"*, складзены з трох вершаваных кніг вядомых паэтаў Магілёўшчыны: "На паўмільярдным кіламетры" **Аркадзя КУЛЯШОВА** (1914—1978), "На чуйным провадзе саломы" **Аляксея ПЫСІНА** (1920—1981) і "Плач кнігаўкі" **Анатоля СЕРБАНТОВІЧА** (1941—1970). Укладальнік Л. Галубовіч. Прадмовы В. Бечыка, Дз. Бугаёва і Л. Галубовіча. Мастак Л. Рудакоўская.

У Мінску пабачыла свет кніга-энцыклапедыя **Эдуарда КАРНІЛОВІЧА** *"Беларусь: созвездие политических имён"*. Яна складаецца з раздзелаў: "Асуджаныя да страты", "Палітссыльныя і паліткатаржане", "Жанчына ў палітыцы", "Палітычныя лідэры Беларусі", "Наркомы БССР", "Ваенна-палітычныя дзеячы", "Нашы дыпламаты", "Палітыкі і пісьменнікі" ды іншыя. Выдрукаваны біяграфіі пісьменнікаў М. Чарота, П. Галавача, П. Броўкі, М. Лынькова, М. Танка, І. Шамякіна, М. Чаргінца ды іншых.

У Беластоку пры рэдакцыі тыднёвіка "Ніва" выйшла ў свет кніга **Сяргея ЧЫГРЫНА** *"З Беластоцкай зямлі"*. Гэта своеасаблівы зборнік біяграфій, нарысаў і гутарак з вядомымі людзьмі, што нарадзіліся на Беласточчыне і складаюць яе нацыянальны гонар. Гэта пісьменнікі, вучоныя, грамадскія і культурныя дзеячы, палітыкі і вайскоўцы, якіх вырасціла Падляшская зямля. Сярод выбітных імён такія як Я. Варонка, З. Верас, Я. Геніюш, Х. Ільяшэвіч, У. Казбярук, А. Карпюк, П. Макаль, М. Пецюкевіч, С. Прытыцкі, У. Чаржынскі, Д. Яканюк ды іншыя.

У выдавецтве "Слонімская друкарня" выйшаў у свет калектыўны зборнік вершаў *"Зоры над Зальвянкай"* аднайменнага літаратурнага аб'яднання, што каля сарака гадоў таму было заснавана пры зэльвенскай раённай газеце "Праца". У кніжцы змешчаны вершы дваццаці чатырох аўтараў старэйшага і малодшага пакалення. Сярод іх ёсць і вядомыя паэты, якія пачыналі свой творчы шлях на зямлі Зэльвеншчыны. Гэта — **Ю. Голуб, У. Мазго, М. Скобла, А. Хатэнка, Ю. Нераток, І. Данік**.

У Мінску ў РВУ "Літаратура і Мастацтва" выйшла кніга аўтабіяграфій пісьменнікаў Беларусі *"З росных сяжын"*. Змешчаны арыгінальныя ўласна напісаныя біяграфіі 54-х вядомых пісьменнікаў і паэтаў нашай краіны, сярод якіх Р. Баравікова, А. Бутэвіч, Г. Далідовіч, А. Жук, А. Казлоў, М. Купрэеў, У. Ліпскі, А. Наварыч, С. Панізнік, А. Пісьмянкоў, Л. Рублеўская, Р. Семашкевіч, В. Шніп... Прадмову напісаў Алесь Карлюкевіч. Укладальнік Мікола Мінзер.

Каб застаўся след

Літаратурнаму аб'яднанню "Крокі", што плённа працуе пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка, нядаўна споўнілася 30 гадоў. Яго выпускнікі — сённяшнія вядомыя літаратары, члены Саюза пісьменнікаў: Мікола Ждановіч, Мікола Мікуліч, Сяргей Карчыцкі, Таццяна Сівец, Ганна Міклашэвіч, а таксама літаратуразнаўца і паэтэса Людміла Харужык (Глінская), паэт і даследчык Юрась Гарбінскі, паэтэса і мовазнаўца Таццяна Старасценка, паэты Юрась і Ціхан Чарнякевічы, Вадзім Корань, Ігар Клепікаў, паэт і бард Міхась Бараноўскі, празаікі Сяргей Трэфілаў і Ганна Рамбальская, паэтэсы Алена Шарапа, Галіна Дзмітрук, Ганна Васільева, Святлана Леў, Кацярына Цвяткова ды іншыя. Сённяшнія крокаўцы — гэта, найперш, паэтэса, самы малады член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ксенія Шаржановіч, паэтэсы Вераніка Мандзік, Ірына Чарняўская, Ганна Барадзіна, Таццяна Прышчэпава, паэтэса і бард Наталля Пушкарова, паэт і празаік (а яшчэ кампазітар і бард) Дзмітрый Пятровіч, паэты і празаікі Аляксей Яскевіч і Алесь Мойскі, якія друкаваліся ўжо ў "ЛіМе" і "Маладосці". Таццяна Ганчарык, Наталія Пятроўская, Настасся Пастэрнак, Яўген Пац, Таццяна Лазічная, Настасся Хмель, Лёля Паўленка — на падыходзе да рэспубліканскіх публікацый. Ёсць спадзяванне, што колішні дэвіз аб'яднання — "Крочыць, каб потым застаўся след!" — яшчэ не адзін год будзе натхняць на радкі маладых творцаў, якія годна папоўняць шэрагі прафесійных літаратараў Беларусі.

Мікола ШАБОВІЧ, заснавальнік і кіраўнік літаратурнага аб'яднання "Крокі"

Ксенія ШАРЖАНОВІЧ

* * *

Старанна затушоўваю туманам
Раненні ў сэрцы. Стрэлы неўпапад.
Паміж тваім каханнем і падманам,
Як аказалася, адрозненняў няшмат.
А я чакала, верыла, ляцела
Да мар тваіх, да шчасця, да жыцця
І лашчылася коткаю няўмелай
Падслухаць рытм сардэчнага біцця.
І думала, што чую, вось вар'ятка,
Не ведала: каменне не жыве...
Так і сышла таемнаю загадкай
Туды, дзе мары. Толькі не твае.

Святло майго кахання

Такога больш ніколі не адчуецца,
Ні шэрані дажджу, ні бляску зор...
Адзіны раз натхнёна так малюецца
Жыцця і свету блытаны узор.
Калі кахаеш — нават сны здзяйсняюцца
І свет іначай бачыцца вачам.
І людзі падазрона усміхаюцца
Тваім дзівосным гутаркам і снам.
Няхай каханне болей не паўторыцца,
Хай згасне назаўжды яго святло,
Ты памятай, што з болем і бяссонніцай
Яно калісьці і ў цябе было.

Ізноў глядзіш ты сумнымі вачыма.
Даруй. Я не змагла табе сказаць.
Забудзь наступствы і забудзь прычыны,
Каб болей не хацелася ўцякаць.

Дзмітрый ПЯТРОВІЧ

* * *

Ў гэты вечар дзівосны,
Поўны мрой-таямніц,
Падары шэпат соснаў,
Ціхі плёскат крыніц.

І няхай забруіцца
Збажына-сівізна,
Ты адна будзеш сніцца —
Назаўжды — ты адна.

Нараджаецца памяць
Неўміручая зноў,
Нібы белая замець
Нашых ластавак-сноў...

Кацярына ЦВЯТКОВА

* * *

Павекі аж баляць ад асалоды,
І сэрца зараз вырвецца на волю.
Не трэба мне ніякае свабоды,
Мне шчасце —
быць палоненай табою.

Яшчэ уздых — і вусны блізка-блізка.
Ад іх наўрад ці можна адарвацца,
І рук тваіх пяшчотная калыска
Заве заснуць і больш не прачынацца.

А мне і шчасця большага не трэба,
Адно б тваім дыханнем сагравацца,
Адно б заўсёды, між зямлёй і небам,
Тваёй адзінай марай заставацца.

Вераніка МАНДЗІК

СентыМЕНТАЛЬНАЕ

Я шчаслівая тым, што на свеце ёсць ты,
Калі нават мяне не аблашчыш вачамі,
Калі нават ніколі не лягуць масты
Паміж нашай жыццёвай ракі берагамі.

Я шчаслівая тым, што змагла пакахаць
Так, як могуць кахаць,
мабыць, толькі аднойчы,
Што мне ёсць для каго цяпер ахвяраваць
І бясконцыя дні, і бяссонныя ночы.

Знаю, будзем з табою хіба толькі ў сне.
Я да гавані ціхай тваёй не прыстану...
Падмануў лёс выпадкам аднойчы мяне,
Я ж і сёння жыву
тым салодкім падманам.

Ах, скажыце, якім мне маліцца багам
За магчымасць адчуць
хмельны смак тваіх вуснаў?
Звар'яцеўшы, душу сваю д'яблу аддам,
Толькі каб не было так самотна і пуста.

Толькі... Не. Нізавошта. Ніколі. Нідзе.
Не падумаю нават ніколі аб гэтым.
Кожны дзень для мяне
як нямы запавет:
Ты жывеш дзесьці побач
са мной на планеце.

* * *

Ну, што глядзіш ты
сумнымі вачыма?!
Табе я не змагу дапамагчы.
Ніякай не шукаючы прычыны,
Хачу я сёння проста уцячы.

Ад ветру,
што мне жвірам сыпле ў вочы,
Ад попелу даўно забытых дзён,
Ад вечнай беспрытульнасці дзявочай,
Ад думкі, што пустуе мой перон,

Ад вечнай мітуслівасці крыклівай,
Зацятага маўчання валуноў...
Ну, хто сказаў,
што у душы цнатлівай
Не можа пасяліцца слодыч сноў?!.

няхай не цякуць цяпер: няма куды;
гэтае сонца — яно дарыла нам жыццё —
няхай згасне цяпер: няма каму
ды няма чаго болей дарыць.

Гэтая планета — яна гадавала нас —
памірае цяпер: забойцамі выраслі дзеці.

Наталія ПЯТРОЎСКАЯ

Сябра

Знікае сонца, я на скрыжаванні
Стаю, праводжу сонечны прамень.
А ты стаіш, як сведка развітання,
Глядзіш, як зноў знікае летні дзень.
Глядзі, мой сябра, хутка ноч настане
І недзе птушкі змоўкнуць у гняздзе.
У вокны вёскі месячык загляне
І карагоды зорак прывядзе.
А зараз, сябра, пойдзем мы дадому,
Бо трэба спаць, а заўтра новы дзень
Пакажа нам знаёмую дарогу
І пад бярозай нам раскіне цень.
І я вазьмуся за былыя справы,
А ты — ганяць суседскага ката.
А потым пойдзем мы да пераправы,
Наловім рыбы — будзе смаката!..
Ну, што сядзіш? Хутчэй бяжы, мой дружа,
Ўжо сонца села, цемрадзі пара.
З-за лесу вызірае злая сцюжа
І праганяе лета са двара.

Таццяна ПРЫШЧЭПАВА

* * *

Я прыехала сёння без кветак,
прашу прабачэння,
Выпадкова да Вас
завітала на кубак гарбаты.
Я не ведала — шчыра, —
што сёння Ваш дзень нараджэння.
Можа, лепей мне зараз
пакрочыць дахаты?..

За акном зноў віруе
зімовая лютая сцюжа,
Вы мяне завяце да стала,
прапануеце танцы,
Вы гаворыце мне,
што надвор'е халоднае дужа
І што мне будзе лепей
у Вашай кватэры застацца.

Я здыму паліто і прысяду на вольнае месца.
Госці — хутка дамоў,
а мы з Вамі — гарбату да рання...
Я пайду, падарыўшы, як сябру,
кавалачак сэрца
І маленькую кроплю
майго трапяткога кахання.

Ірына ЧАРНЯЎСКАЯ

Трыялет

Я сэрцам не скажу табе "бывай",
Хоць вуснамі, магчыма, і не змоўчу.
І гэтай красавіцкай шчырай ноччу
Я сэрцам не скажу табе "бывай".
Няхай дажджом сумленне крываточыць
За тое, што паверыш мне. Няхай!
Я сэрцам не скажу табе "бывай",
Хоць вуснамі, магчыма, і не змоўчу.

* * *

Не думала, што буду сумаваць.
Яшчэ за дзверы выйсці не паспела,
Як сэрца ўжо даўным-даўно ляцела
Табе балючы верш свой прысвячаць.

Не думала, што будуць абдаваць,
Нібыта варам, даўнія ўпаміны.
Не сніся мне, харошы мой, мой мілы!
Навошта праўдай раніцу псаваць?

Ты, можа, і на крок не падышоў,
Ды я даўно адлегласці прыбрала
І, як магла, так моцна абдымала
Цябе сваёй вясноваю душой.

А зараз — што?
Заплакаць? Адпусціць?
Дык я ж цябе ў руках
і не трымала!
А ведаеш, для шчасця трэба мала:
Твой цёплы позірк,
каб застацца жыць.

Ганна БАРАДЗІНА

Цяжарная

Я —
цяжарная
новым
каханнем.
Чым вам
не новае
жыццё?

* * *

Пасля ўсяго,
чаго між намі
не было,
мне сорамна
табе ў вочы
паглядзець...

Чорная рэўнасць

Так,
кожны мае
права на каханне,
толькі не ты
і толькі
не з ёй...

* * *

Калі апошні раз
бачыла цябе,
усе пераводзілі гадзіннікі
назад.
Цяпер
усе пераводзяць —
наперад.
Але ці вернешся ты
разам са згубленым
часам?...

Настасся ПАСТЭРНАК

Хоку

* * *

Час развітвацца.
Не слухай маё сэрца —
Першым падмане...

* * *

Надакучыла
Спрачацца з Лёсам. Шкада...
Ты больш не прыйдзеш.

* * *

Калісьці даўно
Дзень пачаўся без Цябе...
Той боль не суняць...

* * *

Вішні адцвілі.
Ведаем: новай Вясны
Дарэмна чакаць.

* * *

Ты... Я... Снегапад...
Не паруш гэтую сувязь —
Наша маўчанне.

* * *

Гэтай раніцай
Ты пайшоў. Назаўсёды.
Складзены крылы.

* * *

Дачакалася:
Гэтай ноччу выпаў снег...
Горад без Цябе...

Настасся ХМЕЛЬ

Трыялет

Ты называў мяне ласкава,
І гэта чулі лес, рака.
Лістота рэха адбівала.
Ты называў мяне ласкава:
"Галубка, кветка лугавая..."
Абняць імкнулася рука...
Ты называў мяне ласкава,
І гэта чулі лес, рака...

Каталонія

Падарожны сшытак

Уладзімір СЦЯПАН

* * *

Дачка расплакалася ў барселонскім аэрапорце. Хваляванне, узбуджанасць, першая далёкая вандроўка на самалёце. Вакол незнаёмыя людзі, незразумелая мова... Кожны сам па сабе. Вось таўстун-індус з шыкоўным чамаданам і не менш шыкоўнай барадой. Вось купка мурынаў, абчапляных залатымі ланцугамі, галандцы, шведы, немцы. Два кітайцы са складным роварам... У кожнага свае справы, свае клопаты і мітрэнгі.... Мне ж тут усё знаёмае: ад слізкай падлогі, да жоўта-вогненных таксовак пад шэра-зялёнымі, як прыцярушанымі попелам, пальмамі.

* * *

Даша пакаштавала недаспелую аліўку. Побач з люстраной сцяной тэрмінала кручанае-перакручанае дрэўца. Адкуль дачцэ ведаць, што аліўкі паспеюць аж у лістападзе, а не на пачатку жніўня. Агледзелася, ці няма каго побач, прыўзнялася на дыбачкі і адшчыкнула ад галіны яшчэ дробненькі плод, грызанула жоўта-зялёны каменьчык. Зморшчылася спалохана, грэбліва скрывілася — выплюнула... А вось дагледжаныя вінаграднікі, якія пабеглі за вокнамі аўтобуса, ёй спадабаліся, прыйшліся да густу. Невысокія, акуратныя, з бэзавымі цяжкімі гронкамі ягад. "Я хачу тут жыць", — сказала дачка. Падумала крыху, і дадала: " А скажы, кім трэба працаваць, каб жыць тут?"

* * *

З вялікай лоджыі нашага нумара на трэцім паверсе відаць мора. Дачка не можа на яго нагледзецца і прыспешвае, каб я хутчэй параскладаў рэчы, спарадкаваў і мы пабеглі купацца. А мне пакуль не хочацца. У мяне з носу ідзе кроў — перахваляваўся...

* * *

Сядзім на мяккіх утульных канапах перад шклянымі дзвярыма ў гатэльны дворык. Там — рай... Яркая зеляніна, падстрыжаная трава, вільготныя сцежкі, выкладзеныя каменнымі плітамі, басейн з блакітнай вадой, кветкі-кветачкі, пальмы, магноліі, ставок, вадаспадзік, незнаёмыя расліны... Адтуль і прыпаўзла ў гатэльны хол ладная, як мужчынская кепка, чарапаха... Каменная істота адчувае сябе на прахалоднай гатэльнай падлозе ў бяспецы, як у стаўку з лотасамі і лілеямі.

* * *

Разнамоўныя дзеці стаяць вакол стаўка, які старанна і няспешна чысціць-мые цёмнаскуры іспанец у зялёных гумовых ботах. У яго чырвоны шланг з пруткім струмянём шыпучай, як шампанскае, вады. Гэты мужчына так падабаецца дзецям, што яны не чуюць бацькоў, і не спяшаюцца ў рэстарацыю. Я і сам разглядаю яго няспешную лайдакаватую працу з задавальненнем.

* * *

Адсутнасць змен — радуе.

(Гэта я пра каталонскі гатэль, у ім мы з жонкай тройчы спыняліся амаль дзесяць гадоў таму. Мястэчка — Кама Руга. Знаходзіцца паміж Тарагонай і Барселонай.)

* * *

Чыгуначная станцыя "Сан Вінчэнца". Невялікі прывакзальны барчык з агромністым шумным вентылятарам. Дачка п'е мінералку, я — каву. Нам не пашанцавала. Сёння — нядзеля, усе банкі, а тут іх, у маленькім курортным гарадку, толькі тры, — не працуюць. Паглядзелі расклад электрычак, але паехаць у Барселону не зможам, бо няма еўрыкаў — не памянялі ўчора амерыканскія грошы на еўрапейскія... Пад суседнім столікакам, на керамічна-стракатай падлозе, ляжыць чорная мужчынская партманетка. Магчыма, там сто, дзвесце, ці дзесяць еўра... Можна нахіліцца, падняць і сысці. Гляджу. Вачэй не магу адвесці ад чорнай партманеткі. Раблю глыток халоднай мінералкі і кажу дачцэ, што сёння будзем купацца і гуляць... У нас ёсць трохі манет. На ваду, каву, марозіва і цыгарэты хопіць. А заўтра нас чакае Барселона. Сыходзім ад спакусы.

* * *

Пясок на пляжы гарачы. Пры блакітна-купаросавым моры — цяжкі і прахалодны. Купаемся. Вучу дачку плаваць. Яшчэ крышачку і — атрымаецца. Але нязвыклы смак марской вады ёй не падабаецца катэгарычна.... І сваю няўдачу яна спісвае на смак солі і гуллівыя хвалі.

* * *

У марскіх, аздобленых шыпучай пенай, хвалях можна стаяць і гушкацца бясконца. Да дрыжыкаў, да гусінай скуры. Няма каму выгнаць мяне з мора — вось і спаліў спіну да ярка-ружовай пякучасці...

* * *

На пачатку траўня ездзіў па справах у Вушачы. Там, на мясцовым кірмашы, у маленькім шапіку, дзе гандлююць рыбалоўнай драбязой, набыў аднаразовую запальнічку. Вядома, зробленую ў Кітаі. Яна служыла мне ў пасохлых трыснягах на бязлюдным беразе халоднай звілістай рэчкі. У нефарбаваным, прапахлым рыбай чаўне — на лясным возеры, ад яе прыпальваў у кавярнях на мінскім праспекце... Цяпер запальнічка са мной у Іспаніі, на беразе Міжземнага мора.... Паліва вось-вось скончыцца. Запальнічка "памрэ" і яе давядзецца выкінуць. Рэчы, як і людзі, найчасцей паміраюць не там, дзе нарадзіліся.

* * *

Раней хацелася, нават пра гэта пісаў, каб частку попелу, пасля маёй крэмацыі, рассыпалі па-над Барселонай.... Сёння жаданні мінулых гадоў падаюцца камічнымі і пошлымі. Гляджу з лоджыі на Міжземнае папялова-блакітнае мора.

* * *

Дачка яшчэ не бачыла Барселону... Я хвалююся, бо вельмі хачу, каб Барса ёй спадабалася. Каб яна палюбіла гэты горад, як я з жонкай...

* * *

Памыліліся з дачкой і выйшлі з электрычкі не на сваёй станцыі. Выбраліся з барселонскай падземкі на паверхню, тут я і разгубіўся.... Месца — незнаёмае. Як не напружваў памяць — не здолеў прыгадаць і зразумець, дзе знаходзімся. Давялося набыць план Барселоны. Неяк разабраліся і рушылі па вуліцы з назвай Паралелі. Ёсць да пары вуліца Дыягональ. Ішлі-ішлі, марозіва елі, пілі ваду. Нарэшце порт. Помнік Калумбу... Тут усё знаёмае і зразумелае, як у Мінску. Гатычны квартал. Катэдра. Знакамітая Рамбла. Дачка шчаслівая, а што яшчэ трэба? Паглядзелі на вялікія караблі і, як на цацачныя яхты. Кінулі ў мора колькі манетак, каб вярнуцца сюды, і рушылі... Барселона захапіла дачку, закруціла... Барселона адбілася ў яе бліскучых каштанавых вачах...

* * *

Іспанцы любяць дзяцей. Малечы дазваляецца самастойна наведваць крамы і крамкі. Мацаць. Прымерваць вялікія і дробныя, танныя і дарагія рэчы. Гандляры глядзяць на малечу са стрыманымі ўсмешкамі. Гандаль ад такой дазволенасці рухаецца нашмат хутчэй.

* * *

Дзядуля, крыху маладзейшы за мяне іспанец, з трыма ўнукамі. Малодшаму хлопчыку гадоў пяць. Яны ўчатырох, у восем рук, пры вадзе, будуюць з пяску палац з чатырма вежамі і мурамі. Ліюць ваду, старающца. Асабліва завіхаецца самы меншы. Ён кіруе старэйшымі, а яны яго слухаюцца. Я падумаў, што архітэктура найвялікшага каталонскага дойліда — Антоніа Гаўдзі — усяго толькі мокры пясок, які здолеў закамянець на вякі.

* * *

Гатэль застаўся такім, якім быў і дзесяць гадоў таму... Тая ж мэбля, тыя ж карціны і гравюры на сценах, тыя ж стравы ў рэстарацыі. І пара чарапах, відаць, тых жа плаваюць у стаўку, галоўны кухар — той жа...

Але нешта змянілася, знікла, як выпарылася.... А што — адразу не магу зразумець.

Раней, на вячэру, гасцей гатэля сустракаў пры ўваходзе ў рэстарацыю немалады мужчына: чорны строй, лакавыя чаравікі. Шоўкавы мятлік. Акуляры ў тонкай залатой аздобе і стрымана-ветлівая ўсмешка на тонкіх вуснах. Раней я думаў, ды і жонка была ўпэўненая, што гэты мужчына — метрдатэль. Бо афіцыянты выконвалі яго просьбы імгненна. Прыйсці на вячэру ў шортах не дазвалялі сабе нават п'янаватыя нямецкія турысты. Цяпер ходзяць на вячэру ў чым пададаецца. Урачыстасць і рытуальнасць зніклі... Барменка Святлана патлумачыла, што той мужчына быў не метрдатэлем, а гаспадаром гатэля. Ён памёр. Паехаў на паляванне у Афрыку, не зрабіў патрэбную прышчэпку. Уджаліў яго нейкі камар, а ўратаваць не змаглі. Я зразумеў, што знікла. Не стала сапраўднага гаспадара, які любіў сваю справу...

Усё трымаецца на людзях. Павітацца з былым гаспадаром, калі той у смокінгу, а ты ў брудных пляжных шортах, было непрыстойна... Вось і ўся таямніца.

Мы з дачкой апранаемся на вячэру, як у тэатр.

* * *

Мора — прышыта да берага белай ніткай прыбою.

* * *

У Іспаніі вялікія машыны саступаюць дарогу легкавікам, а тыя ў сваю чаргу — матацыклістам. Людзі на роварах спыняюцца перад тымі, хто ідзе пешкі. Разумна, калі самыя безабаронныя ў пашане.

* * *

Самае смачнае ў Іспаніі — вада.

* * *

Пад домам CASA BATLLO, збудаваным Антоніа Гаўдзі на Віа Грацыя, ці не сотня турыстаў. Стаяць, сядзяць, ходзяць задраўшы галовы. Фотакамеры — на любы густ... Захапленне — непадробнае... Здзіўленне — сапраўднае... Дачка глядзіць шырока расплюшчанымі вачамі... Глядзіць, як на нешта казачнае і адначасова адчувальнае, сапраўднае, спраўджанае. Яе здзівіла, што ў доме, які збудаваў Гаўдзі, жывуць звычайныя людзі. Спяць, ядуць, сварацца, а дзеці ходзяць у школу і катаюцца на роварах...

* * *

Я згубіў партманетку... Там былі грошы. Амерыканскія і нашы беларускія, якія пакідаў, каб з аэрапорта даехаць дадому. А самае каштоўнае, што насіў у партманетцы — фотаздымак дачкі. Калі яна глядзела на тую сваю дзіцячую выяву — пачынала плакаць... Казала, што хоча ізноў зрабіцца маленькай. Шкада... Эх. Барселона! Эх, трынаццатага жніўня!

* * *

У гатэльным холе, побач з лесвіцай, два камп'ютэры з вэбкамерамі. Кошт — еўра за дзесяць хвілін. Дачка праглядае сваю пошту, я сваю скрыню. Чытаю ЖЖ і стужку сваіх фрэндаў, як дома...

* * *

Інтэрнет сціскае свет да памераў манітора.

* * *

Стомленыя доўгай вандроўкай па Барселоне, ледзь жывыя, вяртаемся ў сваю "родную" Кама Ругу. Спяшаемся на вячэру і адчуваем, што не паспеем. Настрой ніякі. Побач з новым шыкоўным гатэлем віруе натоўп. Праціскаемся сярод англійскіх, французскіх, іспанскіх і нямецкіх слоў... Чужыя словы чапляюць і драпаюць, раздражняюць незразумеласцю.

"Цэй погана, що не трэцца!" — Гучыць раптам, зусім побач, пявучы мужчынскі голас. Мужчына ў белай кашулі стаіць побач з мармуровым ганкам і разглядае новы шыкоўны чаравік. І жанчына яго глядзіць на чаравік.

" Дывіся-дывіся, трэцца", — кажа жанчына, але не так гучна і пераканана, як яе чалавек .

Мы з дачкой пачынаем смяяцца. І хахлы смяюцца.

На вячэру мы спазняемся.

* * *

Доўга гляджу на Сабор... То караскаюся, як той мураш, позіркам, па шурпатых ад ляпніны сценах на самы верх, то спорхваю і лячу долу. Не магу наглядзецца. Сядзім з дачкой у маленькай вулічнай кавярні зусім побач з Саградай і слухаем флейтыста, які пераходзіць ад століка да століка. Колер яго белай кашулі мяняецца, бо над кожным столікам — парасоны розных колераў. Кавярня пад сцяной жылога дома, які пабудаваны напрыканцы дзевятнаццатага стагоддзя. Падумаў, што ёсць у Барселоне кватэры, за вокнамі якіх — Саграда. Не, я разважаю не пра кошт квадратнага метра той каталонскай жылплошчы... Я думаю пра людзей, якія жывуць у тых кватэрах... На вачах сям'і пачалася будоўля найвялікшага Сабора. Людзі нараджаліся, сыходзілі ў іншы свет, а за вокнамі будуецца Сабор... Ён будзе будавацца яшчэ невядома колькі. А калі нарэшце скончыцца будоўля, то пачнецца рэстаўрацыя... А ўсё ж такі цікава — колькі каштуе кватэра ў старым доме з відам на Temple Cagrada Famílla?..

* * *

Саграда — карона над Барсай.

* * *

Жончын званок заспявае нас за столікам кавярні побач з Саградай. Дачка пачынае размаўляць з мамай і расказвае пра нашы прыгоды. Відаць, жонка пра нешта пытае, бо дачка пачынае плакаць. Па-сапраўднаму, слёзы бягуць па шчаках. Кропаюць на тэлефончык ... Я палохаюся... Аказваецца, што малая расплакалася, бо яе перапаўнялі пачуцці, а слоў, каб расказаць, не хапала... І жонка спалохалася, але потым зразумела.

* * *

Барселонскі кот
лёг пад вентылятарам...
Хутка сіеста.

* * *

Мора з берага — вялікае.
Мора без берагоў — велічнае.

* * *

PICASSO. У Барселоне дождж. Каталонцы радуюцца, а турысты-адпачываючыя незадаволеныя. Мы з дачкой спадзяёмся, што ўчарашняй вялізнай чаргі ў музей не будзе. Памыліліся... чарга гадзіны на дзве. Рухаецца павольна. Крапае дождж, а ніхто не сыходзіць. Гэта адзіная вялікая чарга, якую мы пабачылі. Трапляем у музей, калі пачынаецца сапраўдная залева.

Вучнёўскія працы Пабла — расчароўваюць. Яны звычайныя. Каб не імя, то месца эцюдам, накідам і малюнкам не ў музейных залах, а на антрэсолях, ці ў канапе...

Але потым... Калі пачынае запаўняць палотны блакітны колер, калі ў залах адчуваецца эфірны халадок вечнасці, пачынаю разумець...

Пікаса малюе не пэндзлем, ці алоўкам, а чароўнай палачкай...

У Пікаса шмат рук, а на руках не па пяць пальцаў, а ...
Пікаса можа ўсё!
Пікаса ўсё мог!
Пікаса — маг!
...а калі ён — Бог?

З белых залаў выходзім на вузкую вуліцу Гатычнага квартала. Тут свеціць сонца. Над Барселонай бязвоблачнае неба... А чарга ў музей такая доўгая... Але я зайздрошчу тым, хто стаіць пад шэрымі сценамі, на мокрай брукаванцы....

* * *

Каб не Пікаса, то і сёння мастакі б і не ведалі, як маляваць голуба.

* * *

У гатэльным дворыку расце вінаград. Цяжкія гронкі: бэзавыя, зялёныя, залацістыя, бурштынавыя вісяць проста над галавой. Праз іх прабіваецца сляпучае сонечнае святло і вінаградныя гронкі падаюцца неверагодна прывабнымі. Глядзіш і каўтаеш сліну... Мы з дачкой, калі выходзім праз дворык на праменад ці да мора, спыняемся і разглядаем казачны вінаград... Калі ні хто не бачыць, то я падскокваю і адшчыкваю колькі ягад. І не толькі я так раблю. Сёння бачыў немаладую французскую пару. Мужчына частаваў тым, хутка скрадзеным вінаградам сваю жанчыну. Дзіўна, у рэстарацыі, на стале, заўсёды стаіць кошык з памытым вінаградам. Бяры, частуйся...

* * *

Фарбаваную на бландзінку бармэнку з нашага гатэля завуць Святлана. Яна з Расіі, з Курска. Як жанчына патрапіла ў Каталонію — не распытваў. Тут — у Кама Рузе яна адна з Расіі... У Святланы ёсць дзве сяброўкі з Мінска: адна жыве і працуе ў Гамбрынусе, побач з Салоу, а другая — недалёка ад Барселоны. "У лютым прыязджайце на карнавал, цікава будзе і весела", — прапаноўвае Святлана, калі прыбірае з барнай стойкі філіжанкі. " Хацелася б..." — падумаў я, але не паабяцаў.

* * *

Шэсць гадзін раніцы, а яшчэ цёмна. Мора з балкона не відаць, а толькі чуваць яго ўсхліпы. Па пляжы паўзе трактар і чысціць пясок. На вуліцах, якія мне відаць з балкона, нікаганікога. Там, дзе мора, яркая кропка святла. Гэта яхта з ліхтаром на мачце, але вось і гэтая кропка згасла.

Начная Кама Руга — жанчына ў чорнай вопратцы, без упрыгожванняў...

* * *

Восем раніцы. Сонечна. Па ўзбярэжжы мора бягуць, едуць на роварах, на роліках спартсмены і адпачываючыя. Вялікія хвалі набягаюць на бераг, але мора не чуваць. Птушкі. Музыка, гамана, гук рухавікоў...

* * *

Паспрабаваў маляваць, бо не ўсё можна сказаць... Не хапае слоў, не стае азначэнняў... А на малюнак зірнуў — і згадаў. Аловак ведае шмат такога, што не прамовіць, чаму не існуе назваў...

* * *

Іспанская стома заўжды без поту.

* * *

Дачка навучылася плаваць. І не ў салёнай і хвалістай марской вадзе, а ў гатэльным басейне... Злезла ў блакітную прахалоду па бліскучых драбінах — і паплыла. На глыбіні сто семдзесят сантыметраў паспрабавала стаць і пайшла на дно. Я скочыў, падхапіў, выцягнуў... Адхліпалася. Адкашлялася. Аддыхалася... Не спалохалася, злезла ў ваду і паплыла...

Засяроджана, сур'ёзна, па-сабачы... За лета ў дачкі два вялікіх дасягненні: паплыла і навучылася ездзіць на роварах. Як на маю думку — нямала.

* * *

Разлічыліся за гатэль. На душы сумна і хочацца спаць. Побач чамаданы і пляцакі. Дачка сядзіць на канапе і пераживае, а ці забяруць нас з гатэля. Круціць мой мабільнік, баіцца, што я не пачую, калі патэлефануюць. Яна не хоча з'язджаць... Начны парцье даўно згубіў да нас цікавасць — зірне з-за стойкі і засынае. А мы чакаем свой бус "18—8", які завязе нас па начным узбярэжжы ў аэрапорт. А там рэгістрацыя, мытнікі, памежнікі... І праз чатыры гадзіны — Мінск. Выходжу на гатэльны ганак папаліць. Вялізныя пальмы шамацяць доўгім, як кардонным, лісцем. Ветрана, цёмна і сумна. І не верыцца, што мы яшчэ тут, што гэтая ноч хутка зробіцца ўспамінам...

* * *

Тыдзень — вельмі мала, каб...

Барселона не змяшчаецца ў сем дзён.

Барса вымагае руху. Яе трэба прайсці наскрозь і не адзін раз...

Можна без мэты...

Галоўнае — ісці, глядзець, маўчаць, складаць вершы, спяваць...

* * *

Самалёт па-над аблокамі. Можна адчуваць сябе анёлам, можна птушкай...

А я адчуваю сябе чамаданам — без ручкі...

Зямны летуценнік

Сяброўскія штрыхі да партрэта артыста, паэта, пісьменніка Анатоля Жука

Ён — мудры. Таму і не дзіўна, што ўмее спраўляцца з сабой, не прападае ў багемнай бездані ці ва ўзарваным вулкане жыццёвых супярэчнасцей. Ён — надзіва таленавіты, узвышана зоркавы і незвычайна зямны. Гэта бачаць многія, але многія, напэўна, адводзяць вочы, ніякавеюць перад моцным і дужым чалавекам, які цярпліва чакае да сябе належнай увагі і павагі, не патрабуючы прызнання. Заслужаны артыст Беларусі, яркі паэт і празаік, сцэнарыст, Анатоль Жук пра сябе кажа так:

... не будую я лесвіц,
Каб узлезці вышэй на Парнас.

Дзесяць гадоў таму Надзея Белахвосцік у газеце "Вечерний Минск" заўважыла, што "...адна з рэспубліканскіх газет памылілася, прадставіўшы юбіляра народным артыстам. І, папраўдзе, была недалёкая ад ісціны — афіцыйнае прызнанне вельмі часта прыпазняецца".

Што ж, "афіцыйнага прызнання" ўсе гэтыя дзесяць гадоў чакаюць сябры, калегі па сцэне. Ды толькі не ён сам, бо заклапочаны тым, каб проста яшчэ пажыць на абранай лёсам роднай зямлі: "Як ні банальна, баюся страціць здароўе. За яго часта падымаюць тост і ў маладосці, але неяк бяздумна, не адчуваючы адказнасці, як на самай справе гэта важна".

І... чакае Анатоль Аляксандравіч новых роляў у родным тэатры — Беларускім рэспубліканскім ТЮГу, без якога не ўяўляе свайго жыцця.

Пасля смерці любімага рэжысёра Андрэя Андросіка не сыграў тут ніводнай новай ролі. Так у тэатры здараецца... Ну, "не бачыць" яго іншы рэжысёр, і нічога з гэтым не зробіш. Як у каханні: па прымусе любым не будзеш. Канечне, у тэатры А. Жук іграе, ёсць спектаклі з яго ўдзелам — са старога рэпертуару. Але ў перыяд "прастою" пачаў многа пісаць, ратуючыся літаратурай.

Муза Мельпамена аднойчы прываражыла яго, хаця стаць артыстам не марыў. Хацеў пайсці ў журналістыку, ды сябар угаварыў паступаць у тэатральна-мастацкі інстытут. Паступіў. І ні разу не пашкадаваў пра такі выбар прафесіі. Цікава, што бацька А. Жука скончыў духоўную семінарыю ў Жыровічах, але сан святара не прымаў: днём прыслужваў у царкве, а ўвечары ішоў у клуб іграць спектакль. Ён быў выдатны акцёр, дый пісаў вершы.

Пасля Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў) А. Жук паехаў у Бабруйск, дзе адкрыўся новы тэатр. За тры гады, якія там прабыў, сыграў каля 50 роляў. У гэты ж час атрымаў сваю першую ўзнагароду — за ролю Нік-Ніка ў п'есе Бурсана і Панко "Нік-Нік, ці Дон Кіхот з праектнага бюро", якую маладыя артысты паставілі ў 1971 годзе. Тады ж на фестывалі румынскай драматургіі Анатолю ўручылі грамату Міністэрства культуры СССР за подпісам Фурцавай. У 1975-м яго запрасілі на працу ў ТЮГ.

Сыграныя ім ролі адпавядаюць жанравым і стылявым асаблівасцям драматургічных твораў. Значнае месца сярод іх займаюць казачныя персанажы, у якіх акцёр зазвычай падкрэслівае дамінуючую рысу, дэманструе выразную пластыку. Актыўнасць жыццёвай пазіцыі выяўляюць створаныя ім вобразы мужных, валявых людзей: "Жухрай" ("Як гартавалася сталь" паводле М. Астроўскага), Заслонаў ("Паядынак" М. Матукоўскага), Міканор ("Подых навальніцы" паводле І. Мележа). А колькі ўвасоблена іншых роляў: Іван Цюхай-Ліпскі ("Пінская шляхта" В. Дуніна-Марцінкевіча), Білі Бонс ("Вострaў скарбаў" паводле Р. Стывенсана), Міхель Галандзец ("Петэр Мунк і яго каменнае сэрца" паводле В.Гаўфа). Прычыніўся А.Жук і да тэлевізійнага тэатра: "Тайная вячэра" ("Наш актыў") У.Трацякова, "Вочы ў вочы" Я. Сіпакова, "Зямлі яшчэ баліць" П. Панчанкі, "Варшаўскі шлях" А. Куляшова, здымаўся ў тэлефільмах "Новая зямля" паводле Якуба Коласа, "Мая справа цялячая" паводле К.Чорнага, "Сівая легенда" паводле У.Караткевіча, у мастацкіх стужках...

На пытанне пра ўлюбёныя ролі ён, не задумваючыся, адказа: Важак са спектакля "Бэмбі" (атрымаў за гэтую ролю прэмію Ленінскага камсамола Беларусі), Мудзафера са "Шчаслівых жабракоў". І — роля графа Дарынкура з "Маленькага лорда Фаўнтляроя": гэтая аповесць англа-амерыканскай пісьменніцы Ф. Бернэт запрашае нас з вамі задумацца і ўгледзецца ў сваё ўласнае жыццё, як угледзеўся ў яго герой А. Жука і назаўсёды змяніў свае ўяўленні пра людзей.

Прыходзьце ў тэатр юнага гледача на спектаклі з удзелам смелага і сціплага, мудрага і летуценнага, няўрымслівага і цярплівага Анатоля Жука, каб захапіцца яго прыгожымі героямі і напоўніць уласныя сэрцы шчырасцю і дабрынёй!

Вера БУЛАНДА

На здымку: заслужаны артыст Беларусі А. Жук.

Радуемся разам

Мастацтва, неадлучнае ад лепшых рэалістычных класічных традыцый, натхнёнае творчымі запаветамі айчынных класікаў, прасякнутае пазітыўным духам, прадставілі беларускія жывапісцы — удзельнікі І Рэспубліканскай выстаўкі "Традыцыі і сучаснасць". Гэта была не чарговая зборная экспазіцыя ў сталічным Палацы мастацтва. Гэта была грунтоўная калектыўная акцыя майстроў розных пакаленняў — не падобных між сабою творчых індывідуальнасцей, паяднаных агульнымі прынцыпамі рэалістычнага жывапісу. І вельмі важна, што іх супольны творчы праект знайшоў адметнае адлюстраванне ў маляўнічым альбоме-каталогу. Называецца ён, як і сама выстаўка, "Традыцыі і сучаснасць". Выданне ажыццёўлена ў 2009 годзе ТДА "Друк-С" за бюджэтныя сродкі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пры ўдзеле Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускага саюза мастакоў. Аўтар уступнага тэксту і ўкладальнік альбома-каталога, лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне" Галія Фатыхава ўключыла ў яго не толькі рэпрадукцыі карцін, што былі прадстаўлены на выстаўцы, і звесткі пра іх аўтараў, але і выказванні саміх мастакоў — своеасаблівыя творчыя эпіграфы, дэвізы, развагі. Прадстаўлены М. Савіцкі, В. Грамыка, Г.Паплаўскі, Н.Шчасная, М. Апёк, Б. Аракчэеў, М.Данцыг, П. Данелія, У. Уродніч, У. Гардзеенка, В. Барабанцаў, А. Панцюк-Жукоўскі, І. Бархаткоў, А. Каласенцава, А. Аракчэева — амаль чатыры дзесяткі мастакоў! "Разумеючы меру адказнасці за захаванне традыцыйнага станковага жывапісу, стан тэматычнай карціны, партрэта, пейзажу, выкананых у рэалістычнай манеры, удзельнікі выстаўкі выказалі свой погляд на традыцыю і сучаснасць і хацелі б звярнуць увагу грамадскасці і дзяржаўных структур, што дадзены від творчасці найбольш блізкі да тых асноў нашай духоўнасці, з якіх складаецца сучасная ідэалогія Дзяржавы. У групе, у асноўным, сабраліся аднадумцы, якія дзейнічаюць у межах, пастаўленых Саюзам мастакоў. Яны не замкнёнае кола. Да іх ініцыятывы могуць далучыцца ўсе, для каго рэалістычнае мастацтва, грамадзянская пазіцыя найперш важныя", — піша Г. Фатыхава на старонках новага выдання.

Дыпломам у намінацыі "За лепшы акцёрскі ансамбль" адзначана мастацкая стужка "Кадэт" Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", якая была прадстаўлена сярод 14 конкурсных карцін на Першым кіеўскім міжнародным кінафестывалі. Журы ўзначальваў знаны дзеяч польскага кіно Кшыштаф Занусі. Нагадаем, што ў фільме рэжысёра Віталя Дудзіна "Кадэт" здымаліся толькі беларускія акцёры.

"Цеплыня колеру" — назва персанальнай выстаўкі Васіля Касцючэнкі, наладжанай у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, раскрывае, бадай, самую галоўную адметнасць работ гэтага жывапісца. Яго палотны — ці то пейзаж, ці то нацюрморт, ці то партрэт, — не проста маляўнічыя, а нейкія... дэкаратыўна-сакавітыя. Здаецца, кожнага, хто глядзіць на іх, атуляюць дабрыня, радасць жыцця, свежасць эмоцый і цеплыня пачуццяў. Каларыт карцін В. Касцючэнкі ўражвае святочнасцю, а знарочыстыя "сваволствы" ў дачыненні да канонаў жывапіснага пісьма захапляюць непасрэднасцю і шчырасцю выказвання мастака, які запрашае пафантазіраваць разам з ім, паразважаць і... задумацца.



Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: вокладка альбома-каталога "Традыцыі і сучаснасць", "Нацюрморт з ружамі" В. Касцючэнкі.

Фота аўтара

Востраў райскіх надзей

Той, хто ўпершыню ўбачыць маляваны дыван, безумоўна, запытаецца: "А што гэта такое? Адкуль з'явіліся гэтыя цудоўныя творы ў Беларусі? Хто іх маляваў і калі?" На гэтыя, як і на многія іншыя пытанні можна было пачуць адказ у Вілейскім краязнаўчым музеі, калі там адкрылася выстаўка "Маляваныя дываны". У экспазіцыю ўвайшлі творы Алены Кіш, Язэпа Драздовіча, Івана Занковіча, невядомых мастакоў, дываны якіх захоўваюцца сёння ў Гісторыка-культурным музеі-запаведніку "Заслаўе" і Вілейскім краязнаўчым музеі. Цікавую экскурсію на адкрыцці выставы правёў Юрась Малаш, які доўгі час вывучае гэту унікальную з'яву беларускай культуры XX стагоддзя.

Ці вядома вам, што праяваю найвышэйшага эстэтычнага густу ў вёсцы 1930-х гадоў сталі маляваныя дываны, без якіх немагчыма было ўявіць інтэр'ер сялянскай хаты, асабліва на Піншчыне, Случчыне, Глыбоччыне? Быццам на крылах белых лебедзяў, маляваныя дзівосы разнесліся па абшарах Беларусі ды сталі як родныя ў сялянскіх хатах, несучы праз сваю прыгажосць надзею і пяшчоту, якіх так не хапала ў галодныя 1930-я... Дзівосныя карціны даравалі магчымасць народным мастакам выказаць свае патаемныя думкі і мары, а сялянам — атрымліваць асалоду ад прыгажосці вобразаў роднай зямлі і духоўных скарбаў свету. Маляваныя дываны рабіліся востравам райскіх надзей, якія спрадвек жывілі душу беларуса...

Язэп МАЛА

Фота Віктара Кавалёва

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

аб'яўляе прыём у аспірантуру на 2009 год
з адрывам і без адрыву ад вытворчасці
па спецыяльнасцях:

05.25.03 — Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства

13.00.05 — Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці

17.00.09 — Тэорыя і гісторыя мастацтва

24.00.01 — Тэорыя і гісторыя культуры

24.00.03 — Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб`ектаў.

Правілы прыёму — агульныя. Прыём дакументаў да 25 верасня 2009 года. Уступныя экзамены з 10 па 30 кастрычніка 2009 года.

Дакументы накіроўваць па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, аспірантура. Даведкі па тэлефоне: 8(017) 222 76 44.

Сябры па суполцы

Звяртайся ў «Музрэм» — не будзе праблем!



Такую параду можа даць сваім калегам кожны, хто ўжо карыстаўся паслугамі вытворча-рамонтнага унітарнага прадпрыемства Беларускага саюза музычных дзеячаў.

"Музрэм" паспяхова працуе з 1965 года, з 1987-га з'яўляецца прадпрыемствам БСМД. 80 працэнтаў яго кліентаў — установы Міністэрстваў культуры і адукацыі краіны. Прадпрыемства мае добрую вытворчую базу, штат высокапрафесійных рэстаўратараў, якія навучаліся на вядомых фірмах-вытворцах музычных інструментаў Еўропы і Японіі.

Спецыялісты УП "Музрэм" рамантуюць і настройваюць раялі, піяніна, баяны, акардэоны, гармоні, рамантуюць духавыя, смыковыя, ударныя, электрамузычныя інструменты, дынамікі і ўзмацняльнікі. Для гэтага ёсць і спецыяльнае абсталяванне, станкі, ёсць запасныя часткі для высакаякаснага рамонту замежных і айчынных музычных інструментаў. Пры неабходнасці прадпрыемства дае заключэнні наконт нерамонтнапрыдатнасці, якія з'яўляюцца падставай для спісання музычных інструментаў і гукаакустычнай апаратуры.

А яшчэ тут робяць чахлы і футаралы для музычных інструментаў, апаратуры, сцэнічнага адзення, пюпітры, рыштунак для смыковых інструментаў, рамяні для баянаў, акардэонаў, гітар; выраблюяць таксама барабаны, бубны, ксілафоны, камплекты беларускіх народных ударнашумавых інструментаў, кастаньеты, румбы, палачкі і ножкі для цымбал.

Адным словам, вас чакаюць для рашэння ўсіх вашых праблем па мінскім адрасе: вуліца Чычэрына, 1. Можна патэлефанаваць: 334-07-55, 334-22-57.

Сябры! На вашы пытанні, якія датычаць падрыхтоўкі матэрыялаў для гэтай старонкі, адказа першы намеснік старшыні Праўлення Беларускага саюза музычных дзеячаў Наталля Васільеўна ВІТЧАНКА. Тэлефоны:
(017) 222-37-33 — працоўны;
(029) 507-55-05 — МТС;
(029) 699-32-00 — Velcom.

У Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбылася падзея, якую смела можна назваць яркай і нешараговай у культурным жыцці Мінска. Гаворка ідзе пра канцэрт пад назвай "У свеце гукаў і фарбаў". Унікальнасць яго ў тым, што ўпершыню на працягу двух аддзяленняў беларускія цымбалы гучалі ў суправаджэнні Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам яго галоўнага дырыжора Пятра Вандзілоўскага.

Цымбалы, раяль і аркестр

З аркестрам у якасці салістаў выступіў вядомы ў Беларусі і па-за яе межамі калектыў, лаўрэат міжнародных конкурсаў трыо "Кансананс". У яго складзе — члены Беларускага саюза музычных дзеячаў Таццяна Шумакова (цымбалы), Наталля Аруцюнава (цымбалы) і Валерый Баравікоў (фартэпіяна).

У той вечар публіка магла атрымаць асалоду не толькі ад гукаў музыкі, але і ад сузірання карцін маладых мастачак, членаў Беларускага саюза мастакоў, сясцёр Сафіі Піскун і Вольгі Піскун-Бычко. Абедзве яны скончылі Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. Сафія Піскун праходзіла стажыроўку ў Германіі ў Акадэміі мастацтваў горада Мюнстэра. Таленавітыя творцы бралі ўдзел у выставах за мяжой нашай краіны, рабілі персанальныя экспазіцыі ў Беларусі. Размяшчэнне іх твораў на сценах Малой залы імя Р. Шырмы, дзе праходзіў канцэрт, сталася часткай праекта "У свеце гукаў і фарбаў".

Удзельнікі трыо "Кансананс" на працягу доўгага часу з'яўляюцца салістамі Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Гэта тры адметныя творчыя біяграфіі. Таццяна Шумакова і Наталля Аруцюнава атрымалі вышэйшую адукацыю ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, у класе прафесара Таццяны Сергяенкі. Таццяна Шумакова — лаўрэат Усесаюзнага агляду-конкурсу творчай моладзі (1983 г.), у 2007-м узнагароджана дыпломам "Майстар свету" на конкурсе ў Сеуле (Паўднёвая Карэя). Наталля Аруцюнава ў 14 гадоў стала пераможцай юнацкага Рэспубліканскага конкурсу сярод цымбалістаў, а ў 1987-м атрымала І прэмію Нацыянальнага конкурсу імя І. Жыновіча. Выдатны піяніст Валерый Баравікоў, акрамя ўдзелу ў трыо "Кансананс", з'яўляецца стваральнікам і нязменным удзельнікам фартэпіяннага дуэта Белдзяржфілармоніі. Ён атрымаў І прэмію на міжнародным конкурсе кампазітараў і аранжыроўшчыкаў "Duo Kodama" ў Токіо (Японія, 1993 г.).

У 1997 годзе гэтыя музыканты аб'ядналіся ў трыо "Кансананс" (што значыць "сугучча" або "згода"). Ансамбль удзельнічаў у розных фестывалях і конкурсах, запісваўся на радыё і тэлебачанні, выступаў у Беларусі і за яе межамі. Высокае майстэрства гэтага калектыву ацаніла журы Міжнароднага фестывалю-конкурсу выканаўцаў на шматструнных інструментах у Пскове (Расія) і ўзнагародзіла яго дыпломам І ступені. Трыо "Кансананс" — уладальнік дыплома і Срэбнага кубка XX Міжнароднага фестывалю-конкурсу "Дружба народаў" у горадзе Пхеньяне (Паўночная Карэя).

Музыканты складаюць праграмы сваіх канцэртаў з твораў розных эпох і стыляў, ад старадаўнасці (Бах, Вівальдзі) да сучаснасці (Бернстайн, Інфантэ). Значнае месца ў рэпертуары трыо займаюць творы, арыентаваныя на фальклорныя традыцыі розных народаў і, безумоўна, творы беларускіх аўтараў: Д. Смольскага, Я. Глебава, І. Лучанка, В. Войціка, А. Друкта, У. Кур'яна, А. Мдзівані, Л. Шлег, А. Шпянёва, В. Жывалеўскага, І. Жыновіча.

Сёлета ў Беларусі афіцыйна аб'яўлены Год роднай зямлі, а ўжо здаўна павялося, што менавіта цымбалы, з іх срэбным пранікліваым тэмбрам, які гэтак кранае душу, з'яўляюцца музычным сімвалам сінявокай Беларусі. Таму канцэрт-праект, пра які тут гаворка, — падзея з шэрагу мерапрыемстваў, прысвечаных Году роднай зямлі.

♫

Нечакана для многіх слухачоў цымбалы, абрамлёныя выканальніцкім майстэрствам Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі, загучалі яшчэ больш выразна і шыкоўна. Уразіла багацце гукавых фарбаў, тэмбравая разнастайнасць "голасу" цымбал, высокі клас выканаўцаў, здатных перадаць такія розныя па вобразнасці і настроі музычныя карціны.

Так, з першых гукаў Прэлюдыі Канцэрта № 2 для цымбал Д. Смольскага слухачы апынуліся ў атмасферы лірыкі, афарбаванай водгукамі маркотнага беларускага меласу. Прайшоўшы праз нарастаючае драматычнае напружанне І і ІІ частак Канцэрта, якое перадае складанасць чалавечага быцця, спалучанага з пакутамі і стратамі, музыка прыводзіць да жыццесцвярджальнага фіналу. Гэты выдатны твор пераканаўча і яскрава прагучаў у выкананні Таццяны Шумаковай, якая здолела перадаць і архітэктанічную зграбнасць формы, і глыбіню зместу Канцэрта Д. Смольскага.

Зусім па-іншаму, з пункта гледжання музычнай мовы і стылістыкі, уплываў на слухача Канцэрт для цымбал У. Кур'яна ў віртуозным і глыбокім выкананні Наталлі Аруцюнавай. Напісаны 20 гадоў таму, твор зрабіўся своеасаблівым маніфестам авангардных прыёмаў гуказдабывання на цымбалах. Засурдзіненая з дапамогай тасьмы першая актава стварае асаблівы "сухі" тэмбр гуку, падкрэсліваючы нервовае напружанне такатнай І часткі. Тут можна пачуць элементы "канкрэтнай" музыкі: сірэны "хуткай дапамогі", сігналы азбукі Морзэ... ІІ частка — астравок лірыкі, мары, настальгіі. Апошняя тэма выконваецца металічным ключом для настройкі цымбал, і гэта дазваляе здабываць гукі, падобныя да гавайскай гітары, з характэрнымі "салодкімі" глісанда. Прыёмы з галіны перкусіі — удары па розных драўняных падстаўках. І вось — вольная па форме ІІІ частка, дзе кадэнцыю (а яна і ёсць сэнсавая кульмінацыя ўсяго Канцэрта) стварае сам выканаўца-саліст. Усё гэта стала новым словам у музыцы для цымбал, і праз яго перадаецца няпросты, афарбаваны трагізмам, змест твора У. Кур'яна. У музыцы Канцэрта — вобраз сучаснага чалавека, заціснутага безаблічнай урбанізаванай культурай, спакутаванага ад дэфіцыту зносін з прыгожым і ўзвышаным. Трагедыя, страта прымушае яго зазірнуць па той бок быцця — за мяжу, не сумяшчальную з жыццём. У такой інфернальнай плоскасці, шматкроп'ем (салістка кідае палачкі на цымбалы) і заканчваецца гэты арыгінальны твор.

♫

Але чалавек не можа знаходзіцца ў пастаянным напружанні. І лірыка — гэта тое, што дорыць адхланне. Сапраўдным душэўным цяплом сагрэла слухачоў "Лірычная мелодыя" Я. Глебава ў выкананні Т. Шумаковай. А вось вядомая лірычная п'еса "Пакуты кахання" Ф. Крэйслера сталася тэмай для вытанчанай "Фантазіі" В. Войціка, напісанай спецыяльна для трыо "Кансананс". У суправаджэнні аркестра гэты твор заззяў яшчэ больш яркімі фарбамі.

Не пакінулі слухачоў абыякавымі тэмпераментныя іспанскія танцы, агністыя лацінаамерыканскія рытмы, венецыянскі карнавал. Асаблівае захапленне публікі выклікаў малдаўскі танец "Вясновая хора" Н. Раду, дзе галавакружныя скокі саступалі месца пачуццёвай мелодыі з каларытным, характэрным для малдаўскай музыкі, сола скрыпкі, бліскуча выкананае канцэртмайстрам аркестра Алегам Подавым.

♫

Высокапрафесійнае натхнёнае выкананне гэтай праграмы Дзяржаўным камерным аркестрам Беларусі і яго галоўным дырыжорам Пятром Вандзілоўскім вартае асобнай ухвалы. Гэты калектыў — адзін з лепшых у нашай краіне, ён гастраляваў па ўсім свеце, граў з выдатнымі салістамі. Аркестр стварыў у той вечар атмасферу высокага мастацтва, якая зачаравала слухачоў.

Цудоўная музыка ў атачэнні выставы адмысловых карцін — уражанне незабыўнае. Вельмі хацелася б, каб такія яркія творчыя праекты мелі працяг!

Арцём КУМЕЛЬСКІХ

На здымку: падчас выступлення трыо "Кансананс" у суправаджэнні Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам П. Вандзілоўскага.

Мандаліна вяртаецца

Тое, што да 50-х гадоў мінулага стагоддзя мандаліна была адным з самых любімых і распаўсюджаных на беларускай зямлі музычных інструментаў, ведаюць сёння, бадай, толькі спецыялісты. Яна паўсюдна гучала ў ансамблях, аркестрах, сола. Аднак, прылічаная разам з саксафонам да буржуазнага мастацтва, практычна была знішчаная.

За вяртанне "рэпрэсіраванага" інструмента ў беларускае культурнае асяроддзе актыўна ўзялася створаная ў 1992 годзе Асацыяцыя беларускіх дамрыстаў і мандаліністаў Беларускага саюза музычных дзеячаў, якая абвясціла адной з галоўных мэтаў сваёй дзейнасці курс на адраджэнне мандаліны.

Зроблена шмат. І вось як вынік — стварэнне два гады таму Мінскага мандалінна-гітарнага аркестра (з 2009 года — калектыў Беларускага саюза музычных дзеячаў). У аркестры іграюць лепшыя выканаўцы на мандалінах і гітарах — выкладчыкі і навучэнцы Мінскага дзяржаўнага музычнага вучылішча імя М. Глінкі, студэнты і выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, педагогі музычных школ. Многія з іх — лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Мастацкі кіраўнік аркестра — Яраслаў Валасюк.

Калектыў паспяхова ўдзельнічаў у музычным праекце, прысвечаным японскаму кампазітару і мандаліністу Ясуо Кувахара (дырыжор — Дзмітрый Зубаў), у Міжнародных днях мандалінна-гітарнай музыкі "Мандалінісіма" (дырыжор — Эльвіра Тахірава). Пра насычанае творчае жыццё аркестра сведчыць і напрацаваны за два гады значны рэпертуар, у якім — арыгінальныя творы нямецкіх, італьянскіх, японскіх кампазітараў для такога інструментальнага складу. Цяпер калектыў рыхтуе новую праграму, у якой вялікая ўвага будзе нададзена беларускай музыцы.

Васіль СЦЕПАНЮК

А. Макаёнак, В. Быкаў, І. Шамякін і М. Чаргінец.

Сёння, 19 чэрвеня спаўняецца 85 год з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка Васіля Быкава. Пра яго творчасць і жыццёвы шлях ужо даволі многа напісана. Аднак згадкі людзей, якія асабіста ведалі Васіля Уладзіміравіча, сустракаліся з ім не толькі па службовых і літаратурных пытаннях, заўсёды чытаюцца з цікавасцю. Сваімі ўспамінамі падзяліўся і старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец.

Творчая вечарына М. Чаргінца, 1977 год.

Быкаўскія сітуацыі

Пачатак

Недзе ў 1975 годзе паўстала пытанне, ці не пара мне ўступаць у Саюз пісьменнікаў. На той час я ўжо быў добра знаёмы з Мікалаем Матукоўскім, Генадзем Бураўкіным, Анатолем Сульянавым. І вось неяк Матукоўскі даў Васілю Быкаву пачытаць рукапіс адной маёй кнігі — "Финал Краба", здаецца. Пры сустрэчы Васіль Уладзіміравіч сказаў, што кніга яму спадабалася, выказаў жаданне напісаць рэцэнзію і нават прапанаваў узяць на сябе ролю аўтара прадмовы. Ён зацікавіўся, ці ўваходжу я ў Саюз пісьменнікаў, і калі даведаўся, што не, сказаў: "Вам трэба абавязкова ўступаць. Некалькі кніг выйшла, і "пяро" ў вас добрае". Такім чынам адбылося наша знаёмства, якое перарасло ў добрае, я лічу, сяброўства. Мы сустракаліся часта, нярэдка гэтыя сустрэчы адбываліся ў такой кампаніі як Анатоль Сульянаў, Мікалай Матукоўскі, абавязкова — Генадзь Бураўкін. Генадзя Быкаў паважаў, любіў як маладога, энергічнага, але ў той жа час і ўжо даволі вядомага паэта.

На лецішчы М. Чаргінца падчас адпачынку.

В. Быкаў выступае на літаратурнай сустрэчы з М. Чаргінцом, 1977 год.

Самае яркае

Васіль Быкаў, на першы погляд, быў вельмі сарамлівым чалавекам. Але пры гэтым ён заўсёды казаў тое, што думаў, не хаваў сваіх думак, і калі выказваўся, то ў яго голасе гучала цвёрдая ўпэўненасць. У характары Васіля Уладзіміравіча была адна рыса, якая дазваляла некаторым людзям выкарыстоўваць яго ў сваіх мэтах, — здзіўляльная вера ў тое, што яму расказвалі. Я памятаю быў такі анекдатычны выпадак, калі Быкаву збіраліся надаць званне Героя Сацыялістычнай Працы. Гэта ж такая была вялікая таямніца! А я сябраваў з сакратаром абкама Міхаілам Князюком (я, дарэчы, пазнаёміў яго і з Быкавым, і з Матукоўскім), і ён пад вялікім сакрэтам паведаміў мне, што ў Бюро ЦК Кампартыі БССР падпісалі ўжо ўсе дакументы і цяпер яны пайшлі ў Маскву. Я сказаў: "Крыўдуй не крыўдуй, Міша, але я ўсё-ткі Васілю Уладзіміравічу скажу". Ён згадзіўся, з разуменнем паставіўся, але толькі пры той умове, што Быкаў не прагаворыцца.

Я паехаў да Быкава дамоў, на Танкавую. Мы сядзелі ў яго кабінеце, і раптам прыйшоў адзін пісьменнік. Я чуў, як ён казаў Васілю Уладзіміравічу, што ён вось толькі-толькі з абкама, і там Быкава палівалі ўсялякім брудам. "Вось, Васіль, падпішы паперу". І Быкаў падпісаў. Тады было модна падпісваць рознага кшталту паперы, якія нават не ішлі "наверх", а куды — невядома. Васіль Уладзіміравіч вяртаецца ў кабінет, а я кажу: "Слухай, я тут міжвольна пачуў вашу размову... Але я таксама з абкама прыйшоў". І расказваю яму пра тую радасную навіну. Ён вельмі ўзрушыўся, падняўся з крэсла, пачаў хадзіць па кабінеце... Не паверыў, сказаў, што не можа такога быць.

А памятаю і такі выпадак, важны, прынамсі, для мяне.

У мяне дзень нараджэння 17 кастрычніка. І вось на наступны дзень, 18-га, — я працаваў тады ў МУС БССР, узначальваў Упраўленне крымінальнага вышуку — паставы тэлефануе і кажа, што да мяне нейкія два мужчыны прыйшлі. Я здзівіўся, бо было ўжо даволі позна. Аказалася, што гэта Быкаў і Матукоўскі. Яны прынеслі мне вялікі бюст Дзяржынскага, вышынёй, мабыць, сантыментраў шэсцьдзесят, — у якасці падарунка на дзень нараджэння. Сказалі, што ў час павіншаваць не маглі: Матукоўскі быў у ад'ездзе, а Быкаў — у Гродне. Я ім прызнаўся, што мы дамовіліся з Князюком разам выехаць за горад, "пастаяць на капоце", яго таксама ўчора не было. Прапанаваў далучыцца. Было дажджлівае надвор'е, але мы ўсё адно, учатырох, паехалі і так прастаялі пад дажджом пару гадзін, гутарачы на ўсе магчымыя тэмы.

Яшчэ адно такое, чыста чалавечае. Калі я апынуўся ў Афганістане, Васіль Быкаў вылучыўся сярод усіх маіх знаёмых. Мне пісалі і Бураўкін, і Сульянаў — час ад часу. Ад Быкава я атрымліваў вестку амаль кожны тыдзень — ці ліст, ці паштоўку (частку я аддаў у Музей гісторыі беларускай літаратуры). Трэба сказаць, што мае жонка і дачка паехалі са мной. Я застаўся ў Кабуле, а саветнікам, якія там знаходзіліся, дазвалялася мець пры сабе сем'і, вядома, з шэрагам папярэджанняў і перасцярог. Сын і цешча засталіся ў Мінску. І вось Быкаў раз на тыдзень, а то і болей, прыязджаў іх наведаць. Цешча акурат тады зламала нагу, дык ён намагаўся дапамагаць, і проста прыязджаў пасядзець, пагаварыць. А сын скончыў школу, паступіў, не параіўшыся з намі, у радыётэхнічны... І ў яго быў канфлікт з адным выкладчыкам, які некалі меў непрыемныя для яго адносіны са мной. Той выкладчык яму казаў: што, бацькі няма, дык хоць я цябе павучу. І ставіў двойкі. Дык Васіль Уладзіміравіч нават парываўся паехаць у інстытут і заступіцца за сына, але пасля ўсё неяк наладзілася.

У яго лістах гучала і трывога, і клопат. Пра Афган нельга было пісаць адкрыта. І ён ухітраўся выказваць свае думкі яшчэ і ў іншасказальнай форме. Мы неяк так называлі, што знаходзімся на курорце. І вось ён пісаў: там на курорце, вядома, добра, але ж мы ведаем, што трэба быць асцярожным...

Пра вайну і ўплывы

У Быкава была такая манера. Ён мог доўга-доўга маўчаць, а пасля казаў сваю каронную фразу: "Да, яно канечне..." — і тады пачынаў расказваць многа цікавага. Упершыню ад яго я даведаўся, што партызан расстрэльвалі не толькі немцы, але і паліцаі. Ён распавёў такі выпадак: аднойчы паліцаі забралі з вёскі ў Лагойскім раёне шмат людзей і паставілі іх расстрэльваць. І ўжо некалькіх людзей расстралялі, а тут пад'ехалі на легкавой машыне два нямецкія афіцэры і пачалі распытваць, што адбываецца. Раптам немец падняў руку і — адну аплявуху паліцаю, другую... Пасля загадаў усіх адпусціць. Атрымалася, што нямецкі афіцэр выратаваў людзей. Так што немцы розныя былі... Былі і такія, хто проста паводле вайсковага абавязку апынуўся на фронце, але пры гэтым заставаўся чалавекам. Калі я слухаў гэта, таксама прыгадаў некалькі выпадкаў са сваёй уласнай біяграфіі: напрыклад, адзін немец папярэдзіў нашу сям'ю пра аблаву гестапа, а ўся наша сям'я была сувязнымі ў партызан.

Мне, вядома, было прыемна, што Быкаў, нягледзячы на сваю занятасць, — ён жа быў і дэпутатам Вярхоўнага Савета — удзяляў увагу маёй творчасці. Сам патрабаваў: давайце рукапіс пачытаю. І тое, што ён пісаў прадмовы, рэцэнзіі на цэлы шэраг кніг — "Финал Краба", "Служба — дни и ночи", "Вам задание" (пра гэты твор ён надрукаваў вялікі артыкул у "Літаратурцы", здаецца, пад назвай "Наука побеждать"), "За секунду до выстрела" — усё гэта гаворыць пра тое, што ён не лічыў мяне дрэнным пісьменнікам.

Быў нават адзін такі цікавы момант. Васіль Уладзіміравіч прачытаў першую кнігу майго рамана "Вам задание", і пры сустрэчы сказаў: ведаеш, кніга добрая, але вось у цябе героі — і гінуць, і раненні цяжкія атрымліваюць, словам, трапляюць у безвыходнае становішча, але — усе выжываюць. У мяне такога не было б, у мяне б яны ўсе не выжылі. Другую кнігу "За секунду до выстрела" ён ужо сам рэцэнзаваў. І пасля патэлефанаваў і кажа: трымаю слухаўку ў зубах, рукі падняў угору. Справа ў тым, што мае героі, прайшоўшы ўсё ваеннае ліхалецце, па адным гінуць у мірны час. Адзін герой, напрыклад, трапляе, па сутнасці, у "быкаўскую" сітуацыю экстрэмальнага выбару: або пайсці на згоду з бандытамі, альбо загінуць. Ён выбраў другое. Тады нават Уладзімір Багамолаў мне сказаў: тут у цябе, вядома, "быкаўская" сітуацыя.

Рэмарка

Я не магу сказаць, што Быкаў прыцясняўся ў часы Савецкага Саюза, адно тое, што ён атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы, пра нешта сведчыць. Зразумела, былі моманты, якія яму не падабаліся. Але, напрыклад, калі Быкаў сабраўся пераязджаць у Мінск, я пайшоў да старшыні гарвыканкама, і праз некалькі дзён было прынята рашэнне даць Быкаву кватэру. Мне назвалі адрасы — ідзі і выбірай. Мы разам з Васілём Уладзіміравічам і Ірынай Міхайлаўнай, яго жонкай, пайшлі на Танкавую, 10, і выбіралі з пяці кватэр. Значыць павага ад гарадской улады яму выказвалася. Я б сказаў, што больш яго білі, як ні дзіўна, самі журналісты. Нешта вышуквалі, намагаліся, можа быць, даказаць сваю аданасць уладзе. Цяпер некаторыя з іх зусім іншае кажуць пра Быкава. Атрымаў ён і дачу ў Ждановічах і вельмі быў рады, што ў яго нарэшце з'явілася месца, дзе можна пісаць. Так, была насцярожанасць асобных вялікіх чыноўнікаў, я гэта адчуваў пры размове з імі. Аднак сакратар ЦК Кампартыі БССР Аляксандр Трыфанавіч Кузьмін не хаваў свайго сяброўства з Васілём Уладзіміравічам.

Апошні ўспамін

І быў яшчэ выпадак, успамін пра які цяжкім каменем кладзецца мне на сэрца. Неяк раздаўся званок, і вельмі ціхі, слабы голас сказаў:

— Ці не маглі б вы прыехаць да мяне?

З цяжкасцю зразумеў, што гэта Быкаў (я ведаў, што ён ужо прыехаў у Беларусь і апынуўся ў Бараўлянах) і папабяцаў прыехаць. Раніцай жа пазваніў у Бараўляны і запытаўся, як мне сустрэцца з Васілём Быкавым. Мне адказалі, што цяпер ён вельмі дрэнна сябе адчувае, а вось праз пару дзён, калі ўрачы яго падмацуюць, можна будзе сустрэцца і нармальна пагутарыць. Гэты ўрач мяне падмануў — на наступны дзень Быкаў памёр.

Просьба

Для сучаснага беларуса Васіль Быкаў павінен стаць найперш прыкладам сапраўднага Чалавека. Ён заўсёды быў сумленным, сціплым, адкрытым. Можа быць, гэта прымушала яго часам вельмі моцна пакутаваць. Яго поглядаў можна не падзяляць, з ім можна не згаджацца, але ў любым выпадку нельга недаацэньваць.

Хацелася б яшчэ звярнуцца да людзей, якія намагаюцца светлае імя Быкава прыватызаваць, падагнаць пад сваё палітычнае крэда, з просьбай: **зберагчы Добрае Імя Чалавека.**

Падрыхтавала
Жанна КАПУСТА
Фота з архіва
Мікалая Чаргінца

З трывогай за будучыню

Па старонках апошніх твораў Васіля Быкава

Творчасць Васіля Быкава апошніх гадоў паказала, наколькі універсальным можа быць талент празаіка, для якога няма непад'ёмных і састарэлых тэм. Нават у пройдзеным, адкрытым можна адшукаць недагаворанае, расставіць маральныя акцэнты з улікам змены часавых дэкарацый, не зважаючы, што паміж імі не адно дзесяцігоддзе.

В. Быкаў у ваенныя гады.

Першы творчы вечар В. Быкава ў СП Беларусі ў 1971 годзе.

В. Быкаў заўсёды ўмеў падабраць сітуацыю, у якой чалавек прасвечваўся, нібы пад рэнтгенам, выхопліваючы хворыя плямы яго душы. Гэты прыём называецца яшчэ экзістэнцыялізмам. І ў творчасці беларускага пісьменніка ён знайшоў трывалае і паслядоўнае ўвасабленне. Узгадаем толькі апошнія аповесці і апавяданні: "Ваўчыная яма" (1999), "Балота" (2001), "Жоўты пясочак" (1995), "Труба" (1998), "Чырвоныя пятліцы" (2000)... У адных даследуецца праблема "чалавек на вайне", у іншых адлюстраваны вострыя праблемы сучаснасці. А яны, як вядома, маюць сваю "гісторыю хваробы", што сягае ў не такое ўжо і аддаленае мінулае. Не важна, пра якія падзеі расказвае твор, галоўнае — закранутыя там праблемы па-ранейшаму захоўваюць надзённасць, таму і сёння прыцягваюць увагу чытача.

Да ліку такіх твораў можна аднесці адно з апошніх апавяданняў В.Быкава **"На балотнай сцяжыне"** (2001), галоўным персанажам якога з'яўляецца настаўнік. Яго вачыма аўтар глядзіць на жахі ваеннага ліхалецця, горкія і незасвоеныя ўрокі гісторыі, вечныя пытанні быцця, чалавечай маралі і годнасці.

У чарговы раз на ваенным матэрыяле пісьменнік спрабуе асэнсаваць спрадвечныя духоўныя каштоўнасці, традыцыйныя ўяўленні пра дабро і зло, справядлівасць-несправядлівасць, жыццё і смерць... В. Быкаў заўсёды ў пошуках маральна-этычнага ідэалу, які грунтуецца на народнай мудрасці, спрадвечным імкненні да праўды і самаахвярнасці — на векавых нацыянальных традыцыях. І вобраз настаўніка ў апавяданні зусім невыпадковы. Педагогі заўсёды з'яўляліся носьбітамі і захавальнікамі духоўнага патэнцыялу народа.

Сюжэт твора просты. Ля прыдарожнай вёскі цячэ рака, праз якую пракладзены масток — *"нехуцавае дарожнае збудаванне са струхлелага дрэва"*. Тым не менш гэта "важны" стратэгічны аб'ект, які могуць узарваць партызаны. Таму і ўсталёўваецца дзяжурства — кожная хата па чарзе. Каб (у выніку чаго) адказвала не ўся вёска, а той, хто яго нёс. А дзяжурства прыходзіцца несці пераважна жанчынам, бо мужчын мабілізавалі ці то ў Чырвоную Армію, ці то завербавалі ў паліцыю, а некаторыя ўвогуле разбрыліся па лясах.

У адну з начэй да мясцовай настаўніцы прыбягае спалоханая чарговым дзяжурствам жанчына: яна даведалася, што ў хаце на ўскрайку лесу сабраліся партызаны, якія хочуць учыніць дыверсію. Перад намі любімае быкаўскае пытанне: што рабіць?

Настаўніца вырашае пайсці да партызанаў і ўгаварыць іх кінуць сваю задуму, бо з-за гэтага могуць быць расстраляны ўсе вяскоўцы.

Аперацыя сарвалася. І вінаватая ў гэтым — ускосна — настаўніца, удава "нацдэма". Яе вядуць у лагер да камандзіра, каб той вырашыў, як быць. І ён вырашае: расстраляць. Карцінай смерці і заканчваецца твор.

В.Быкаў не ідэалізуе ні немцаў, ні партызанаў. З-за іх пакутуе мірнае насельніцтва: *"...дзе партызаны, там і немцы — карнікі ды паліцаі — ганяюцца адно за адным. Мірныя ж людзі між імі. Пад агнём з абодвух бакоў..."*

Пісьменнік стварае цэлую сям'ю — пакаленне — настаўнікаў: галоўная гераіня; яе муж Апанас Пятровіч, расстраляны як нацдэм; бацька, які свядома прыняў смерць у шэрагах яўрэяў. Малюючы гэтыя вобразы, аўтар імкнуўся паказаць душу беларускай інтэлігенцыі, яе служэнне хрысціянскім і агульначалавечым каштоўнасцям. Нездарма ж дзяжурная Алена прыбягае за дапамогай менавіта да настаўніцы, імя якой В.Быкаў наўмысна не называе.

Жанчына разумее, што яе чакае смерць, прычым зусім недарэчная. Таму натуральным з'яўляецца нямое пытанне: завошта? За мужа-"нацдэма", "адваяваны" масток? За ўсё разам. А болей — за ярлык. Ды яшчэ за тое, што... не спадабалася камандзіру, які шукаў сабе прыгожую палюбоўніцу...

Адзіны клопат жанчыны — яе васьмігадовы Уладзік. Але партызан Пецюкевіч-Жукаў запэўнівае, што *"сын за бацькоў не атвячае"*. Якая хімера! Настаўніца ўбачыла ў ім *"згвалтаванага нявольніка, які, каб выжыць у гэтай калатнечы, гвалтуе іншых. Як і яны ўсе. Ці бальшыня. Можа, у тым самая вялікая жуда нацыі..."* Ды зразумела гэта жанчына вельмі позна...

Сцэна смерці сімвалічная. Ідучы па балотнай сцяжыне і чакаючы стрэлу, жанчына спадзяецца яшчэ на паратунак: *"... яна падумала: а можа яе толькі палохаюць?"* І толькі *"яна гатовая была азірнуцца і засмяяцца ад свайго адкрыцця"*, як *"у патыліцу грымнула"*. Але памерла жанчына не адразу, пачула яшчэ знаёмы мужчынскі голас: *" — Адцягнеш куды са сцежкі... Далей, у балота..."*

Такая шматзначная песімістычная канцоўка. Інтэлігенцыя заўсёды стаіць на хісткай "балотнай сцяжыне" сваіх перакананняў. Хто мацней, хто слабей, — залежачы ад трываласці духу. Галоўнае — застацца чалавекам у любых, нават самых неверагодных, абставінах і, калі спатрэбіцца, праверыць загартоўку страхам немінучага канца, прыняўшы ўласную смерць з усёй годнасцю.

Апавяданне "На балотнай сцяжыне" мае відавочную "пераклічку" з аповесцю "Абеліск" (1971) — паміж імі 30 гадоў. І там, і тут вырашаецца адзіная праблема — праблема выбару паміж пагібеллю фізічнай і смерцю духоўнай. Кампрамісу быць не можа: абраўшы адно — страціш другое. І ў апавяданні, і ў аповесці выбар быў прадказальны: настаўнік павінен ахвяраваць сабой, бо толькі тады ён варты гэтага звання.

У цэнтры другога апавядання — **"Чырвоныя пятліцы"** — сітуацыя не менш абсурдная за папярэднюю. Пабываўшы на раённай нарадзе, сакратар вясковай партячэйкі Пётра Анішчык быў пастаўлены перад невырашальнай дылемай: як быць, калі начальнік НКУС таварыш Дзвярной патрабуе "ворагаў" і "шкоднікаў" звыш "плана", а ў яго, Анішчыка, іх няма зусім. А гэта ўжо гаворыць пра многае...

Анішчык тэрмінова склікае ячэйку: настаўніка, старога бальшавіка Петрачкова, каваля Клячкова і брыгадзіра. На павестцы дня адно пытанне: каго залічыць у ворагі? Зразумела, добраахвотна ахвяраваць сабой ніхто не хацеў. Кожны прыводзіў у сваю абарону неабвяргальныя довады, з якімі ўсе, трохі падумаўшы, згаджаліся, бо баяліся адзін аднаго. Нарэшце, каб адвесці ад сябе небяспеку, аднадушна вырашылі зрабіць "ворагам народа" беспартыйнага нетутэйшага пагарэльца-яўрэя Злотніка, сям'я якога ледзь зводзіла канцы з канцамі. Да яго і накіравалася "прадстаўнічая" дэлегацыя з "няёмкай" просьбай...

Усе разумеюць глупства таго, што робяць. Той жа Анішчык пакутуе ад сумлення, нялюдскасці справы, яе бесчалавечнасці. Аднак партыя ведае, што робіць. Яна не памыляецца ніколі. Таму і супрацьпаставіць загартоўку страхам немінучага канца, прыняўшы ўласную смерць з усёй годнасцю.

Анішчык быў ашаломлены: *"Пасля таго, як працэдура рэгістрацыі была скончана, высокі худы чэкіст выняў з шуфляды стала кароткі нож і ўзяўся зразаць чырвоныя пятліцы з Анішчыкавага шыняля. Але нож быў тупы, а суровыя ніткі, якімі Анішчык колісь прышыў пятліцы, трымалі моцна, і чэкіст нарэшце з трэскам паадрываў іх ад каўняра. Анішчык ледзьве стрываў, каб не заплакаць, выразна адчуваючы, што з пятліцамі назаўжды адразаецца і яго мінулае. Ён не сакратар болей. Не бальшавік. А можа, і не чалавек нават"*.

Так недарэчна заканчваецца жыццё дзвюх ахвяр сталінска-рэпрэсіўнай сістэмы. Адзін пайшоў у турму свядома, другі, бяздумна выконваючы загады партыі, сам стаў яе заложнікам, так і не зразумеўшы "завошта". А ўлада арыентавалася менавіта на такіх старанных "вінцікаў": анішчыкаў, петручковых — звычайных выканаўцаў чужой волі. І калі яны станавіліся непатрэбнымі, іх знішчалі (А-нішчык — нішчыць), не надаючы гэтаму вялікай праблемы: быў чалавек — няма чалавека. Ёсць іншыя. На падыходзе. Няспынны працэс. Канвеер даўжынёю ў некалькі дзесяцігоддзяў.

"Чырвоныя пятліцы" — твор-антыутопія, які можна ўпэўнена паставіць побач з аповесцю Дж.Оруэла "Ферма" і раманам "1984".

Тое ж самае можна сказаць і пра апавяданне **"Велікоднае яйка"**. Але калі ў папярэднім творы маляваліся 30-я гады XX стагоддзя, то тут расказваецца пра нялёгкае пасляваеннае жыццё-быццё вяскоўцаў, вымушаных аддаваць апошняе дзеля дабрабыту савецкай дзяржавы, пабудовы віртуальнай "светлай будучыні".

Вобраз парторга Выпаўзкова таксама пададзены ў сатырычным плане. Гэта відаць ужо з ягонага прозвішча, якое людзі лагічна змянілі на Выпаўзак, што надзвычай трапна характарызуе гэтую асобу, тыповага прадстаўніка адышоўшай у нябыт эпохі. Аўтар даволі ўдала перадаў атмасферу таго часу, калі падобныя выпаўзковы здзекаваліся з народа, запалохвалі яго і прыніжалі.

Выпаўзкоў кантралюе выкананне плана ў раёне. Таму нават на Вялікдзень выганяе людзей на працу — вазіць гной. А каб тыя паслухаліся і не ўпарціліся — пужае наганам, бо адчувае сваю поўную ўладу над імі. Прычым усё суправаджаецца адборным матам. У святы дзень!..

Твор пабудаваны на кантрасце: Вялікдзень — светлае свята, у якое вывозяць смярдзючы гной; Выпаўзкоў — апантаны *"бальшавік-чэкіст"*, сухарукі і нягеглы, ды яшчэ страшэнны брыдкаслоў. Яго жыццёвае крэда: *"баяцца — значыць, паважаюць"*. Баяцца, але не ўсе. Брыгадзір, напрыклад, паслаў яго, *"парторга і чэкіста"*, *"на тры літары"*, чым выклікаў у таго недаўменне і гнеў.

Камуніст Выпаўзкоў упэўнены, што *"не ўсіх, далёка не ўсіх выкаранілі ў трыццатыя, яшчэ засталося антысавецкага ахвосця"*, а значыць, *"будзе чым заняцца"*, бо *"класавая барацьба важней за ўсё"*. Нават за гуманізм. І Выпаўзкоў гатовы самаахвярна служыць фантомнай ідэі.

Здзіўляе сваёй недарэчнасцю партызанства парторга, калі ён за памылку ў выяўленні завербаваных быў узнагароджаны ордэнам і нават павышаны ў званні.

Выпаўзкоў жорсткі і дэспатычны не толькі да чужых людзей, але і да ўласнай жонкі, імкнучыся даказаць гэтым сваю справядлівасць і самаахвярнасць: ніякіх спасылак на сямейнасць, Ганна павінна працаваць з усімі.

У рэшце рэшт жанчына не вытрымлівае пастаяннага прыніжэння і брыдкаслоўя. Тым больш — у святы дзень, калі муж адабраў у дзяцей велікодныя яйкі, адзіную радасць і надзею ў час беспрасветнага голаду і страху. Яна *"ўхапіла вілы і, не адчуваючы сябе, што было сілы ўдарыла Выпаўзка ў грудзі. Бруднья ад гною вілы надзіва лёгка ўтыркнуліся ў яго хударлявае цела, і парторг, адразу абвяўшы, моўчкі апоўз долу"*.

Заканчваецца твор своеасаблівым эпілогам: па заснежанай тайзе ў лагер брыдзе калона жанчын, сярод якіх адна адстае і, збочыўшы з дарогі, *"бы сонная"*, адыходзіць ад яе ўсё далей. На папярэджанне спыніцца яна не рэагавала. У выніку — жанчыну застрэлілі. Да яе падбег канваір, *"узняў вінтоўку, павярнуў яе штыхом уніз і ўдарыў — штыхом у грудзі. Пасля ўдарыў яшчэ. Тая не крыкнула, мусіць ёй было ўсё роўна.*

Даўно ўсё роўна".

Бо не было дзеля чаго жыць — не было дзяцей, якіх адабралі ад маці, якая здзейсніла забойства свайго мужа-чэкіста.

Вобраз Выпаўзкова запамінальны і яркі, як, дарэчы, і вобразы Гаршчка з аповесці М. Гарэцкага "Дзве душы" ці Самсона Самасуя з рамана А. Мрыя. Ён выяўляе сутнасць тых людзей, якія дарваўшыся да ўлады, хоць і нязначнай, у бяздумным экстазе захапіліся выкананнем загадаў зверху. Таму гэты вобраз адначасова і выкрывальны. Ён знішчальна абмалёўвае антычалавечы характар любой таталітарнай сістэмы.

Пры пэўным схематызме і эскізнасці, непрыхаванай зададзенасці і празмерным песімізме апошнія творы В.Быкава (у тым ліку апавяданне "Кароткая песня" (2002), аповесць "Афганец" (1998) і інш.) ніколі не страцяць свайго грамадскага гучання і актуальнасці. У кожным творы В. Быкава пульсуе трывога і заклапочанасць за далейшы лёс Радзімы, нераўнадушны боль сынавага сэрца за яе пакручастую гісторыю.

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ

Інтэлігенцыя заўсёды стаіць на хісткай "балотнай сцяжыне" сваіх перакананняў. Хто мацней, хто слабей, — залежачы ад трываласці духу. Галоўнае — застацца чалавекам у любых, нават самых неверагодных, абставінах і, калі спатрэбіцца, праверыць загартоўку страхам немінучага канца, прыняўшы ўласную смерць з усёй годнасцю.

Імя Міколы Трафімчука добра вядомае ў літаратурным асяроддзі краіны. Апошнім часам яго пачалі згадваць і ў асяроддзі аматараў літаратуры, у колах пачынаючых паэтаў і празаікаў. А звязана гэта перш за ўсё з выданнем народнага альманаха "Гоман", праекта, які Мікола Трафімчук паспяхова рэалізоўвае. Карэспандэнт "ЛіМа" сустрэўся з выдаўцом з нагоды нядаўняга прызначэння М. Трафімчуку галоўным рэдактарам часопіса "Акно".

Спрыяць станаўленню

— Мікола, па шчырасці, ці адчуваеш небяспеку, што часопіс "Акно" можа ператварыцца ў своеасаблівы тэкставы дублікат альманаха "Гоман"?

— Пакуль што так і адбываецца. Бо разлічваў якраз на аўтарскі актыў "Гомана". Часопіс "Акно" два гады не выходзіў, увогуле спыніў існаванне. За гэты час страціліся сувязі з аўтарамі і чытачамі. І я вымушаны выкарыстоўваць менавіта аўтарскія сувязі "Гомана".

— Калі не сакрэт, колькі ў актыве "Гомана" аўтараў?

— Усяго ў маіх спісах чалавек чатырыста. Гэта тыя, хто перыядычна друкаваўся ў "Гоман" на працягу двух-трох гадоў. І гэта неблагі патэнцыял, каб зрабіць першы крок. Зразумела, што даводзілася пачынаць з нуля: ні аўтараў, ні падпісчыкаў, ні чытачоў. Не было ніякага анонса наконт узнаўлення часопіса "Акно". Таму адразу прыйшлося рыхтаваць першы нумар, абапіраючыся ў асноўным на аўтараў "Гомана". Многія гэта адзначылі, нават у тыднёвіку "ЛіМ" пісалі, што часопіс "Акно" быццам бы акно альманаха "Гоман".

— Для таго, каб падняць тыраж часопіса, трэба правесці пэўныя арганізацыйныя, рэкламныя і піар-акцыі. Ёсць нейкія канкрэтныя планы павелічэння тыражу. А трэба выйсці хаця б на частковую самаакупнасць.

— Я нагадаю, што заснавальнікам часопіса з'яўляецца Беларускае таварыства інвалідаў. І цэнтральнае праўленне, а таксама старшыня Уладзімір Патапенка, асабліва, пасля выхаду ў мінулым годзе першага нумара, адразу вельмі моцна зацікавіліся, пачалі актыўна дапамагаць. Напрыклад, мы сустракаліся са старшынёй і вялі размову, што тыраж першага нумара павінен разысціся пры дапамозе самога кіраўніцтва таварыства. Пры таварыстве інвалідаў па ўсёй рэспубліцы існуе вялікая сетка розных вытворчых прадпрыемстваў — гэта таксама патэнцыйныя нашы падпісчыкі.

— "Літаратурна-мастацкі і публіцыстычны часопіс" — так анансуецца на вокладцы выдання. А якая будзе палітыка галоўнага рэдактара і рэдакцыйнай рады адносна мастацкасці? Можна спадзявацца, што часопіс "Акно" стане сур'ёзным выданнем?

— Безумоўна. Гэта наша асноўная мэта. Будзем падымаць тыраж і адначасова паляпшаць якасць. Але пакуль даводзіцца друкаваць і вучнёўскія вершы, таго ж інваліда, які спрабуе ў творчасці свае сілы. Яго трэба яшчэ вучыць майстэрству прыгожага пісьменства, ён яшчэ пачатковец, але мы ўжо яго друкуем, каб падтрымаць маральна. Ды, калі па шчырасці, ідзе змаганне за кожнага аўтара-падпісчыка. Таму што асноўнымі падпісчыкамі з'яўляюцца пакуль што самі аўтары.

— Часопіс можна выпісаць у паштовым аддзяленні?

— Пакуль не. Ён не ўключаны ў падпісныя каталогі. Планавалі з другога паўгоддзя, але сутыкнуліся з пэўнымі цяжкасцямі. Белпошта прапанавала заключыць дамову, толькі не на тых умовах, калі спачатку года заключаецца, гэта значыць з сімвалічнай аплатай. А ў сярэдзіне года трэба заплаціць немалыя грошы, якіх у нас пакуль няма.

— Таварыства ж інвалідаў карыстаецца нейкімі льготамі, пазбаўляецца падаткаў?..

— Да льготаў пакуль не даходзіць, таму што яны датычаць прыбытку. Часопіс будзе карыстацца льготамі і пазбавіцца падаткаў, калі рэдакцыя больш як напалову будзе складацца з інвалідаў.

— У вас ганарарнае выданне?

— Так, ганарарнае. Хаця пакуль, скажам так, сімвалічна ганарарнае.

— Я быў на прэзентацыі другога нумара часопіса, на гэтай імпрэзе прагучала, што вы плануеце ў кожным нумары рэкламаваць музычныя калектывы і рок-гурты.

— Вось гэта і ёсць тая частка піара, дзе мы выкарыстоўваем свае магчымасці. Вырашылі падтрымаць маладых музыкантаў і спевакоў, заадно робячы рэкламу і часопісу, а за кошт гэтага яшчэ і павялічваць тыраж.

— Проза, паэзія, публіцыстыка, крытыка... Якія яшчэ рубрыкі будуць?

— Пакуль не вылучаем у асобны раздзел выяўленчае мастацтва. Хаця, пачынаючы з першага нумара, ідуць матэрыялы пра мастакоў. Збіраемся вылічвасць колькасць рубрык. Тым больш, што нават сярод інвалідаў, у самім таварыстве вельмі шмат праводзіцца конкурсаў, фестываляў дзеля рэабілітацыі творчых людзей.

— Думаецца, што часопіс вельмі хутка выйдзе за межы праблематыкі Таварыства інвалідаў і ўвальецца ў агульнае рэчышча беларускай культуры.

— Гэта і ёсць задача рэдакцыі. У нашым статуце так і запісана: "Дапамагаць, спрыяць станаўленню творчай асобы, у тым ліку і інвалідаў". Не сказана, што толькі інвалідаў. Мы не абмежаваны статутам. Прыцягваем і вядомых творцаў, знакамітых майстроў слова. Магчыма, у нас будзе нешта накшталт "літаратурнай вучобы". Хочацца, каб гэта быў паўнавартасны літаратурна-мастацкі часопіс.

Гутарку вёў
Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Ад легендаў і былін

Неаднойчы і не адным даследчыкам была выказана думка, што паданні і міфы валодаюць неспасцігальнай здольнасцю да ўвасаблення ў рэальнасці: тое, што існуе ў свядомасці народа, абавязкова калі-небудзь праяўляецца і набывае рэальныя рысы.

Не таму даўно штотыднёвік "ЛіМ" распавядаў пра цікавую гіпотэзу Міколы Багадзяжа і Ірыны Масляніцынай, што святым першапакутнікам Феадорам мог быць легендарны заснавальнік Турава. Такая версія цалкам мае права на існаванне, бо князь Тур і святы Феадор былі сучаснікамі, а жыціе святога дае вельмі скупыя біяграфічныя звесткі пра першапакутніка Феадора і яго сына Іаана.

Нядаўна ў Выдавецтве Беларускага Экзархата ў дзіцячай духоўна-асветніцкай серыі "Святыя Праваслаўнай царквы" выйшлі дзве чарговыя кніжкі "Святыя першапакутнікі Русі Феадор і яго сын Іаан" і "Святы багатыр Ілья з Мурама", пераказ для дзяцей зрабілі Ірына Масляніцына і Мікола Багадзяж. Як і ранейшыя выданні гэтай серыі, кнігі аздоблены каляровымі малюнкамі, рэпрадукцыямі карцін, іконамі, схемамі і картамі (каля трох дзесяткаў на васемнаццаць старонак тэксту), упрыгожаны віньеткамі, застаўкамі і набраны буйным шрыфтам. Серыя выдаецца з благаславення Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта, кнігі гэтай серыі прыемна ўзяць у рукі як дзецям, так і дарослым. Тэксты адаптаваны для лёгкага чытання і нязмушанага ўспрымання.

Магчыма, нават для многіх дарослых і адукаваных людзей будзе адкрыццём, што былінны асілак Ілья Мурамец, які трыццаць тры гады прасядзеў на печы і, дзякуючы вандроўнікам, што папрасілі ў нямоглага вады, перасіліў сваю хваробу, а потым здзейсніў дзесяткі подзвігаў — не легендарны герой, не плод паэтычнай фантазіі, а рэальны зямны чалавек, прылічаны царквою да ліку святых. Асабіста для мяне было невялікім шокам, калі дзесятак гадоў таму, трапіўшы ў Кіева-Пячорскі манастыр і блукаючы са свечкай па лабірынтах пячор, упершыню натрапіў на мошчы святога Ільлі з Мурама. Падумалася: можа, не той, не былінны Ілья? Аказалася — той самы, які і Салаўя-Разбойніка за пояс заткнуў, і полаўцаў разбіў, і бараніў зямлю рускую ад шматлікіх ворагаў. Святому Ілы Мурамцу моляцца аб дараванні Богам добрага здароўя і фізічнай моцы. Так легенда ператвараецца ў рэальнасць.

І не такога ўжо волатаўскага (па сённяшніх мерках!) росту быў Ілья, але ж — якая велічы душы і якая неадольная сіла!

Многія стагоддзі Троя лічылася легендай — міфам, прыдумкай Гамера, пакуль археолаг Шліман не паверыў у рэальнасць яе існавання і ўсяму свету не паказаў раскапаны горад. Безліч легенд, паданняў і ў славянскіх народаў, і некаторыя раптам спраўджваюцца, становяцца рэальнасцю...

Антон КУДЛАТЫ

Сяргей Грышкевіч... Алесь Паплаўскі... Хто наступны?

Хачу выказацца

Цікава: чым менш літаратуры пэўнага плана ў агульнай масе надрукаванага, тым больш знаходзіцца людзей, якія так добра ў ёй разбіраюцца. Рытарычнае пытанне: "Чаму ж так мала пішуць?" няхай павісіць у паветры. Заўважу яшчэ адно: падобныя крытыкі найчасцей аналізуюць твор праз свой жыццёвы вопыт. І гэты асабісты вопыт застаецца галоўным ва ўспрыманні напісанага, і тым больш — напісанага для падлеткаў.

Адчуў гэта на ўласнай скуры. Напрыклад, Міхась Южык расчароўваецца ў маёй аповесці "Пастка на рыцара" таму, што, аказваецца, ён "...вучыўся ў розных школах, і нідзе не толькі не думалі пераставаць крыўдзіць слабейшых, а рабілі гэта з адмысловай бязлітаснасцю". А тут Гапееў пра нейкі там ордэн высакародны, што стаў бараніць слабых... Лухта, карацей, і аўтар — дурань-летуценнік. Не тое што не чакаў... Было прадчуванне, што пасля ёрнічання брэстчаніна Сяргея Грышкевіча ў "ЛіМе" з нагоды майго "Уроку бяспечнага сексу..." будуць яшчэ падобныя перлы. Калі Жанна Капуста хоць імкнулася да аналізу, С. Грышкевіч не ўпадабаў самога аўтара ("А хто ён такі!? Нават не настаўнік!") ды тое, што я не апраўдаў яго надзеяў на фінал: так чакаў чалавек сапраўднага сексу — і не дачакаўся. Ён упэўнены, што секс павінен быў быць, бо гэта дыктуецца, аказваецца, яго веданнем сучаснай моладзі. А гэтае веданне грунтуецца на "выпадкова" падслуханых размовах сексуальна заклапочаных дзяўчынак...

Па законах жанру, які цалкам авалодваў свядомасцю С. Грышкевіча, мне трэба было, значыць, наладзіць "групавуху".

Што супрацьпаставіць такой аргументацыі, як "выпадкова падслуханая размова"? На адным сайце для дзяўчынак да 16 гадоў у Рунеце было галасаванне на тэму: "У якім узросце лічыце магчымым першы секс?" Дык вось, у 12 год — 995 галасоў, у 16 — 3165, у 18 — 2964. І "толькі пасля вяселля" — 1849. І, бадай, самы загадкавы для С. Грышкевіча пункт: "Толькі калі ўпэўнішся, што кахаеш ты і кахаюць цябе" — 5504 галасы.

Хоць напісана было ў анонсе, што будуць два погляды, ды ў чым розніца поглядаў Ж. Капусты і С. Грышкевіча, я так і не разгледзеў. Абодва крытыкі ўпікаюць аўтара: маўляў, падлеткі яго з 70-х гадоў мінулага стагоддзя. Ах, мілыя вы мае, значыць, вы ў сваёй маладосці маглі быць рамантычнымі і светлымі, а дзеці вашыя — не? А пра вас хіба не казалі бацькі, што вы не такія, як яны, што ў вас гулі на розуме ды джынсы з пласцінкамі?

Спрадвечны штамп: "Вось у наш час..."

...І зноў выстрэльвае "ЛіМ" артыкулам. І зноў — брэстчанін. Алесь Паплаўскі. Артыкул на самай справе добры, палемічны, можна з аўтарам паспрачацца, ды не хочацца. Бо ён не разважае, а канстатуе. Вось адшукаўся ўрач і з ходу ставіць дыягназ усёй беларускай літаратуры... Заўважу, што доўгі час артыкул вісеў у "ЖЖ" аўтара. З цікавым папярэджаннем: "Занудам уваход забаронены".

Артыкул як артыкул. Адно незразумела, чаму з усіх раскіданых камянёў толькі адзін запушчаны прыцэльна — у мой агарод?

Абразліва-знішчальна, нават не ўспамінаючы твор (каб мацней падкрэсліць нікчэмнасць?): "Чытво". Ну і ляд з ім, чытво дык чытво...

Цікава (але прадказальна), на чым грунтуецца гэтая знішчальнасць. "Ну хоць забіце мяне, але не стане ніхто з сучасных вучняў чытаць гэтае чытво, не іх моваю яно напісана..." Чаму не іх — маўчыць аўтар. Якая мова іх — А. Паплаўскі сакрэтаў не выдае.

Ды не ў тым, мабыць, справа. А ў тым, што і аднаго, і другую, і трэцяга закранула, відавочна, тое, што "яйкі пачалі вучыць курэй".

Але ж гэта — праўда. Нашы дзеці лічаць якраз нас адсталымі. Мы, па іх цвёрдым перакананні, не ўмеем арыентавацца ў сучасным свеце, многага проста не ведаем, не чуем, не бачым.

16-гадовы сын ушчуваў маці: "Як ты можаш глядзець серыялы? Ты разумееш, што ад іх мазгі заплываюць тлушчам, што яны робяць з людзей дэбілаў, якім толькі хлеб і відовішчы трэба!?" Гэта — з жыцця.

Прынамсі, яны вучаць нас карыстацца мабільнікамі, камп'ютэрамі, пральнымі аўтаматычнымі машынамі, іншай бытавой тэхнікай.

Адна справа — бачыць гэта, унутры сябе пераварваць, а іншая — пра гэта прачытаць. Уга! Тут ёсць прычына для банальнай злосці.

І (паўтаруся) тым больш злосці, што ў гэтых дарослых дзеці адбіраюць іх "святое" — бо гэта ж толькі яны, сённяшнія дарослыя, маглі быць у юнацтве рамантычнымі, светлымі, мары іх — чыстымі. А сённяшняе пакаленне зацыклілася на сексе ды наркотыках.

Давайце будзем шчырымі і паспрабуем адказаць на простае пытанне: чаму мы прайграем вайну з наркотыкамі?

Няма адказу? А цяпер давайце шчыра адкажам самі сабе на іншае пытанне: якая частка дзяцей і падлеткаў даведалася аб наркотыках ад нас, ад дарослых? Хіба не мы ім расказваем, не мы знаёмім іх з тым, што такое ёсць?

І хіба стане хто адмаўляць, што, ведучы прафілактычную барацьбу, мы распаўсюджваем інфармацыю аб наркотыках?

Тое ж і са СНІДам. Разумею, як абурылі С. Грышкевіча і А. Паплаўскага словы майго героя: "Не вучыце трахацца бяспечна — мы ўвогуле раней пары ніяк не будзем."

Бо не так гэта проста — узяць на сябе адказнасць за маральнае здароўе сваіх дзяцей і падлеткаў. Хоць крышачку адказнасці! Вядома, у наш час і неба было глыбейшым, і дрэвы зелянейшымі... Ускласці адказнасць на што і каго заўгодна — на самі падлеткаў, на Інтэрнет, на тэлебачанне, на вуліцу — толькі б выключыць сябе з гэтага ланцужка прычын.

Паказаць гэтае пакаленне як апошняе перад канцом свету, як пазбаўленае ўсіх маральных тармазоў, як бездухоўнае і цынічнае — о, такі твор быў бы даспадобы маім апанентам.

І апошняе. Што чытае сёння моладзь, тое дакладна А. Паплаўскаму невядома. Не тая мова? Выбачайце, лічу, што мова павінна быць адна — літаратурная. Мяне не чытаюць, бо няма кнігі. (І ці будзе?..) Але ж лічыльнік праглядаў на сайце паказвае якраз, што чытаюць у Сеціве "Урок бяспечнага сексу". Спецыяльна не выкладваў адным суцэльным кавалкам, каб дакладна ведаць, колькі чытачоў пасля прагляду першай часткі адкрылі другую, пасля другой — трэцюю. Варта б было зазірнуць, звярнуць увагу на гэтыя лічбы...

Валерый ГАПЕЕЎ

Чалавек, які бярог нам раніцу



Варлен Бечык... Надзвычай дасведчаны крытык і навуковец, руплівы даследчык беларускай літаратуры, нястомны адкрывальнік новых паэтычных імён. Згадаем тут хаця б Анатоля Шушко, якога шаноўны Варлен Леанідавіч, будучы яшчэ і сам даволі маладым па ўзросце, прадставіў шчырым прыхільнікам паэзіі са старонак "ЛіМа", дзе працаваў у сярэдзіне 1960-х, памятных нечуваным прылівам творчых сіл. Свамі яркімі артыкуламі пра літаратурныя набыткі прызнаных майстроў слова, высокапрафесійнымі аглядамі маладой паэзіі ў часопісах і газетах Варлен Бечык стаў недасягальным аўтарытэтам у калег і пісьменнікаў самых розных уплываў і напрамкаў.

Яркі прадстаўнік так званага філалагічнага пакалення, ён цікавіўся сучасным літаратурным працэсам і добра ведаў яго. Пра гэта сведчаць кнігі паважанага крытыка — "Свет жывы і блізкі", "Беларуская савецкая лірыка", "Шлях да акіяна" (пра паэзію А. Куляшова), і асабліва — "Прад высокаю красою". Вось яшчэ дзённік Варлена Бечыка "Радкі і жыццё", які пісаўся з вялікім болем душы і сэрца, але пабачыў свет толькі пасля ранняй і заўчаснай смерці гэтага незвычайна сумленнага і прынцыповага чалавека.

Яму часта сніліся ўласныя ненапісаныя вершы, і гэта не дзіўна: у Варлена Бечыка быў бездакорны паэтычны слых, пра што сведчаць многія старонкі яго дзённіка "Радкі і жыццё". Вось запіс ад 7 чэрвеня 1966 года: "*Вершы сняцца ўжо другую ноч. Першы раз снілася: мае ўдалыя вершы набраны, але ў гранках начыста перароблены. Нават у сне ў мне гаворыць крытык: я лаўлю недахопы*". Асабіста я, даўні прыхільнік майстра, тут зрабіў бы ўдакладненне: Варлен Бечык "лавіў" недахопы, якія дапамагалі нам, тады яшчэ даволі маладым рамантыкам, творча расці, набірацца вопыту, вучыцца на сваіх жа памылках.

Чамусьці гэты выдатны настаўнік і вялікі эрудыт, для многіх з нас адчыніўшы браму "высокай красы", час ад часу займаўся самабічаваннем: "*Я не паэт, не празаік, не крытык... але літаратуру я люблю, ёю жыву. Любоў гэта большая за магчыную неабходнасць адмовіцца ад кніжак і пашукаць нелітаратурнай сферы прымажэння сваіх сіл*" (Запіс у дзённіку ад 28 лютага 1967 года). Спробы "самаедства" абсалютна дарэмныя, таму што для развіцця беларускай паэзіі і прозы Варлен Бечык зрабіў вельмі шмат, і, што істотна, праблемы літаратуры, пра якія з трывогай гаварыў славуты крытык, актуальнымі застаюцца і ў наш час. Ну, хто не памятае яго артыкул "Толькі без сю-сю"... — пра надзённыя пытанні дзіцячай паэзіі? Надрукаваны яшчэ ў 1981 годзе ў газеце "ЛіМ", гэты артыкул меў незвычайны поспех, безліч водгукаў. Шкада, што сённяшнія дзіцячыя паэты не ведаюць такой зычлівай і высокакваліфікаванай крытыкі.

"Варлен Бечык быў добры чалавек,— у прадмове да кнігі "Радкі і жыццё" пісаў народны паэт Беларусі Пімен Панчанка.— Ён амаль ніколі гнеўна не "распякае" аўтара, а нават у не вельмі адораных паэтаў імкнецца знайсці нейкія светлыя праўдзівыя радкі". Да справядлівых слоў хацелася б дадаць: добры чалавек — гэта вечны пакутнік, добрым людзям звычайна не шанцуе ў жыцці, пра што пераканаўча сведчыць трагічны і нялёгкі лёс самога Варлена Бечыка. На крыху дзіўнаватае спалучэнне нязвыклага імя і прозвішча я ўпершыню звярнуў увагу яшчэ ў 1964 годзе, калі ў часопісе "Маладосць" прачытаў нататкі невядомага мне настаўніка "Клас восьмы, клас дзевяты..." Чытаў дакументальны твор узахлёб, бо сам толькі што скончыў сярэднюю школу, а тут, у Варлена Бечыка, такія ж падлеткі-гарэзы, неслухі, са сваімі "сталымі" думкамі і капрызамі.

Памятаю, у 1982 годзе, калі яшчэ жыў і працаваў у невялікім палескім мястэчку Ганцавічы, на закрыты літаратурны конкурс у выдавецтва "Юнацтва" я паслаў свой зборнік вершаў "Незабудкі азёр". Усё, як і трэба: пад дэвізам, а прозвішча расшыфроўвалася ў асобным канверце. Канечне, на нейкі поспех не спадзяваўся, ажно разгортваю аднойчы газету "ЛіМ", а там вынікі конкурсу: мне — трэцяе месца. Калі кніга выйшла асобным выданнем, даведаўся, што выдатны водгук на зборнік даў сам Варлен Бечык, з якім пазней вельмі кароткі час, на жаль, давялося быць у сяброўскіх, прыязных адносінах.

Не абышлося, як кажуць, і без кур'ёзаў. Аднойчы на нейкім пісьменніцкім сходзе, дзе разглядалася творчасць маладых, Варлен Бечык згадаў няўдалы радок з майго верша "І жораў стары, быццам Данка..." Гэты верш быў у нейкім яшчэ нявыдадзеным рукапісе. Назаўтра я паехаў у выдавецтва, выняў з кнігі слабы твор, парваў і выкінуў у сметніцу. Так што верша пра горкаўскага Данка ў мяне цяпер няма. Застаўся толькі запіс у кнізе В. Бечыка "Радкі і жыццё". Праўда, тут ёсць нямала і цытат з маіх вершаў, якія чымсьці спадабаліся шаноўнаму крытыку.

Вось яшчэ колькі слоў пра чалавечую сціпласць Варлена Бечыка. Практычна ўсё, што ён думаў і пісаў пра мяне, я даведаўся намнога пазней, калі з друку выйшлі яго дзённікі, клапатліва падрыхтаваныя да выдання ягонай маці Ларысай Лявонцьеўнай Кароткай, якая вядомая ў філалагічных колах як таленавітая выкладчыца і вучоны, а яшчэ — як мужная партызанка, удзельніца антыфашысцкага падполля. Дарэчы, не так даўно грамадскасць рэспублікі адзначыла 90-гадовы юбілей Ларысы Лявонцьеўны. Сваёй маці таленавіты сын, безумоўна, ганарыўся, бо пакінуў у дзённіку самыя цёплыя і светлыя згадкі аб ёй.

Дазволю сабе працытаваць яшчэ адзін запіс Варлена Бечыка — ад 5 верасня 1967 года: "*... Як пісаў адзін разумны чалавек, беражы маладосць, каб жыццё было доўгім; беражы раніцу, каб быў добры дзень!*". Менавіта гэтыя радкі мяне заўсёды кранаюць да слёз. Адбылася нейкая гістарычная несправядлівасць. Чалавек, які ўсяго сябе аддаваў людзям, сваю раніцу, на жаль, не зберог, бо да 70-гадовага юбілею ён не дажыў амаль чвэрць веку.

Віктар ГАРДЗЕЙ

Рэдакцыя часопіса "Вожык" глыбока смуткуе з прычыны смерці былога галоўнага рэдактара часопіса Аляксандра Данілавіча РАМАНАВА і выказвае шчырае спачуванне яго родным і блізкім.

1976 год. Мінуў год пасля таго, як шырока было адзначана 30-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У друку з'яўляецца аповесць Івана Шамякіна "Гандлярка і паэт". Сюжэт аповесці выношваўся аўтарам доўга, амаль трыццаць гадоў. Вось як у навеле "Сюжэты" з цыкла "Начныя ўспаміны" сам І. Шамякін апісвае задуму свайго твора: "Сюжэт Мінскага падполля. Зацятая барацьба гісторыкаў перашкаджала з'яўленню надзвычайных характараў. Подзвіг Осіпавай і Мазанік абслюнявілі іншыя пісьменнікі і кінематаграфісты. Фільм паводле сцэнарыя Кучара і Куляшова "Гадзіннік спыніўся апоўначы" я не прыняў. Івана Кавалёва "затуманілі" гісторыкі, звялі да малазначнай фігуры.

Страсці вакол аповесці «Гандлярка і паэт»

Ды, можа, трыццаць гадоў жыў вобраз жанчыны, пра якую я пісаў, з якой пазнаёміўся на Лагойскім тракце. Вольга (і ў жыцці Вольга) была пляменніцай нашай гаспадыні (у 1948 годзе Іван Шамякін, пераехаўшы з сям'ёй у Мінск, жыў на прыватнай кватэры. — ***А.Ш.***). У выхадныя, у святы Вольга з дачкой-вучаніцай наведвала цётку. Мая Маша, чалавек выключнай душэўнай шчодрасці, сябравала з гаспадыняй, і тая часта запрашала нас у застолле — праз калідор, дзе шумелі прымусы.

Гаспадыня з гонарам паведаміла, што Вольга — падпольшчыца. Але ад самой весялухі я не выцягнуў нічога такога, што магло стаць сюжэтам хоць бы аповесці.

Крытыкі адразу ж адгукнуліся на гэтую аповесць рэцэнзіямі. Не ўсімі "Гандлярка і паэт" была прынята. Але большасць водгукаў была станоўчай. Вельмі цёпла і прыязна аповесць ацанілі чытачы: на хатні адрас, у Саюз пісьменнікаў прыходзілі дзесяткі і сотні лістоў, у якіх або самі ўдзельнікі, або іх нашчадкі расказвалі пра падобныя выпадкі, і гэта ўмацоўвала І. Шамякіна ў думцы, што расказаная ім гісторыя — хутчэй тыповая, чым унікальная, але ні ў якім разе не штучная. Аднак самымі дарагімі для пісьменніка былі водгукі калег-пісьменнікаў. Найбольш шчыра, ёмка і лаканічна ахарактарызаваў аповесць Янка Скрыган у лісце ад 11 сакавіка 1967 года: "...я пад вялікім уражаннем ад наравіўшаяся да акупацыйнага рэжыму жанчына, свая сярод паліцаяў, сумавала не па мужу, а па мужчыне".

Н. Пашкевіч даказваў усім прысутным, што не было ніякіх рабаўніцтваў крамаў і складоў у першыя дні бамбёжкі Мінска: "Людзі акуратна стаялі ў чэргах у чаканні хлеба на чале з міліцыянерам". Аргумент Н. Пашкевіч прывёў таксама жалезны: ён тры разы быў у акупаваным горадзе і нічога такога не бачыў. Але ж І. Шамякін таксама нічога не выдумваў у сваёй аповесці: ён абапіраўся на ўспаміны, аповеды тых людзей, якія жылі ў акупаваным Мінску з першага дня акупацыі і да вызвалення, а не былі тры разы ў акупаваным горадзе.

Маскоўскія крытыкі больш прыязна паставіліся да аповесці. Так, сакратар СП СССР Ю. Сураўцаў сказаў: "Гэта не аповесць, а хутчэй раман. Гэта тое, пра што Сіманаў сказаў: раман лёсу. Гэта тыповы раман з рухам душы гераіні, калі ў пачатку твора — гэта адзін характар, а ў канцы твора становіцца як бы іншы чалавек. Мы адвыклі ад таго, што людзі мяняюцца на працягу рамана".

Доктар філалагічных навук А. Аўчарэнка даў аповесці "Гандлярка і паэт" высокую ацэнку: "...Я падтрымліваю задуму аўтара: паказаць, што гераізм апошняй вайны ў кожным выпадку быў канкрэтным. Гэты гераізм праяўлялі самыя розныя людзі".

Канечне, пасля такога абмеркавання і выступлення на пасяджэнні Н. Пашкевіча і У. Юрэвіча ні пра якую прэмію размова ўжо не ішла. А вельмі шкада, бо аповесць гэтая — арыгінальны твор з дынамічным сюжэтам, жывымі характарамі. Гэтыя асаблівасці хутка былі заўважаны кінематаграфістамі, і па аповесці знялі мастацкую стужку, у якой галоўную ролю, Вольгі Ляновіч, выканала маладая зорка тагачаснага савецкага кінематографа Наталля Андрэйчанка.

І. Шамякін ніколі не помсціў тым людзям, якія рабілі яму непрыемнасці. Аднак, відаць, пэўны асадак ад учынку "сяброў" застаўся, але ён не паказваў гэта ні словам, ні справай. А ў апошніх дзённікавых запісах (8 лютага 2003 года) ёсць наступныя радкі: "... Дзён колькі назад падумаў: "Трэба пазваніць Нічыпару (Пашкевічу. — ***А. Ш.***). Хоць ён, Юрэвіч, Асіпенка сарвалі мне прэмію (навела "Сябры"), але я крыўды не трымаю. А на другі дзень чытаю ў "Звяздзе": памёр Нічыпар. І стала мне шкада яго і балюча, і страшна — ад думак пра смерць".

Гісторыя і час усё расставілі па сваіх месцах: з "мудрых" думак крытыкаў зараз можна хіба што рагатаць, а аповесць "Гандлярка і паэт" і сёння чытаюць, яна і сёння застаецца яркім мастацкім увасабленнем народнага подзвігу, такога ж розната, як і сам народ.

Алеся ШАМЯКІНА

Неўзабаве пасля апублікавання ў беларускім друку "Гандлярка і паэт" была перакладзена на рускую мову і з'явілася ў часопісе "Молодая гвардия" і "Роман-газете". А потым аповесць была вылучана і на Дзяржаўную прэмію СССР. Але атрыманне прэміі было сарвана. Падставай стала выступленне беларускіх крытыкаў Нічыпара Пашкевіча, Уладзіміра Юрэвіча, Алеся Асіпенкі на пасяджэнні Савета па беларускай літаратуры Саюза пісьменнікаў СССР у Маскве.

А потым я ўбачыў яе на Камароўскім рынку, яна бойка гандлявала гародніной. Гэта мяне расчаравала: падполыпчыца — гандлярка!.. Як мы тады глядзелі на гандлярок! (У навеле "Сябры" я пісаў, як мае "прагрэсіўныя" сябры паставіліся да аповесці: гераіня — гандлярка, жах! "Дапісаўся партыйны аўтар да ручкі".)

А гады праз два, калі я ўжо меў кватэру ў цэнтры і забыўся на былых гаспадароў, аднойчы адвячоркам сустрэў Вольгу на вуліцы з партфельчыкам. Павіталіся, бадай, узрадавана.

— Куды вы?

— У школу.

— Бацькоўскі сход?

— Не. Я вучуся ў вячэрняй школе, ужо ў дзесятым...

Падполыпчыца, гандлярка, вучаніца... Вобраз! І доўга-доўга ён жыў, доўга прасіўся галоўнай гераіняй у раман. Была ў сюжэце "Сэрца на далоні". Але з'явілася пакутніца Зося Савіч. У "Снежных зімах" ёй месца не было: там не падполле — партызаны. І раптам... Сяджу ў Саюзе пісьменнікаў. Кірую. Заходзіць жанчына, незнаёмая. Расказвае сумную гісторыю. У пачатку вайны ў лагеры ў Драздах яе сястра выкупіла палоннага раненага чырвонаармейца. Такіх немцы прадавалі міласэрным жанчынам. Гады два хлопец жыў у яе, ірваўся ў бой, пісаў вершы. Памёр. А сшытачак застаўся. І жанчына вырашыла прынесці яго нам, у Саюз пісьменнікаў, можа, надрукуем.

Вершы былі пачаткоўскія, хоць глыбока патрыятычныя, гнеўна антыфашысцкія. Але не ўчынак жанчыны — столькі берагла сшытак! — не вершы мяне ўразілі. Адразу, уміг, як бліскавіцай, высвеціўся сюжэт з Вольгай: во што яна робіць — выкупляе палоннага, паэта. Яго пакахала, з ім уключылася ў барацьбу. За ім ідзе на смерць".

Крытыкі адразу ж адгукнуліся на гэтую аповесць рэцэнзіямі. Не ўсімі "Гандлярка і паэт" была прынята. Але большасць водгукаў была станоўчай. Вельмі цёпла і прыязна аповесць ацанілі чытачы: на хатні адрас, у Саюз пісьменнікаў прыходзілі дзесяткі і сотні лістоў, у якіх або самі ўдзельнікі, або іх нашчадкі расказвалі пра падобныя выпадкі, і гэта ўмацоўвала І. Шамякіна ў думцы, што расказаная ім гісторыя — хутчэй тыповая, чым унікальная, але ні ў якім разе не штучная. Аднак самымі дарагімі для пісьменніка былі водгукі калег-пісьменнікаў. Найбольш шчыра, ёмка і лаканічна ахарактарызаваў аповесць Янка Скрыган у лісце ад 11 сакавіка 1967 года: "...я пад вялікім уражаннем ад

Неўзабаве пасля апублікавання ў беларускім друку "Гандлярка і паэт" была перакладзена на рускую мову і з'явілася ў часопісе "Молодая гвардия" і "Роман-газете". А потым аповесць была вылучана і на Дзяржаўную прэмію СССР. Але атрыманне прэміі было сарвана. Падставай стала выступленне беларускіх крытыкаў Нічыпара Пашкевіча, Уладзіміра Юрэвіча, Алеся Асіпенкі на пасяджэнні Савета па беларускай літаратуры Саюза пісьменнікаў СССР у Маскве.

А потым я ўбачыў яе на Камароўскім рынку, яна бойка гандлявала гародніной. Гэта мяне расчаравала: падполыпчыца — гандлярка!.. Як мы тады глядзелі на гандлярок! (У навеле "Сябры" я пісаў, як мае "прагрэсіўныя" сябры паставіліся да аповесці: гераіня — гандлярка, жах! "Дапісаўся партыйны аўтар да ручкі".)

А гады праз два, калі я ўжо меў кватэру ў цэнтры і забыўся на былых гаспадароў, аднойчы адвячоркам сустрэў Вольгу на вуліцы з партфельчыкам. Павіталіся, бадай, узрадавана.

— Куды вы?

— У школу.

— Бацькоўскі сход?

— Не. Я вучуся ў вячэрняй школе, ужо ў дзесятым...

Падполыпчыца, гандлярка, вучаніца... Вобраз! І доўга-доўга ён жыў, доўга прасіўся галоўнай гераіняй у раман. Была ў сюжэце "Сэрца на далоні". Але з'явілася пакутніца Зося Савіч. У "Снежных зімах" ёй месца не было: там не падполле — партызаны. І раптам... Сяджу ў Саюзе пісьменнікаў. Кірую. Заходзіць жанчына, незнаёмая. Расказвае сумную гісторыю. У пачатку вайны ў лагеры ў Драздах яе сястра выкупіла палоннага раненага чырвонаармейца. Такіх немцы прадавалі міласэрным жанчынам. Гады два хлопец жыў у яе, ірваўся ў бой, пісаў вершы. Памёр. А сшытачак застаўся. І жанчына вырашыла прынесці яго нам, у Саюз пісьменнікаў, можа, надрукуем.

Вершы былі пачаткоўскія, хоць глыбока патрыятычныя, гнеўна антыфашысцкія. Але не ўчынак жанчыны — столькі берагла сшытак! — не вершы мяне ўразілі. Адразу, уміг, як бліскавіцай, высвеціўся сюжэт з Вольгай: во што яна робіць — выкупляе палоннага, паэта. Яго пакахала, з ім уключылася ў барацьбу. За ім ідзе на смерць".

"Гандлярцы і паэта". Цудоўна, удумліва, псіхалагічна, эканомліва і паэтычна напісаная рэч. І сацыяльна, і псіхалагічна даказаная. І вельмі свежая і праўдзівая па тэме: гандлярка і паэт. Лепш кажучы, самы просты народ, гераізм самога народа. А колькі танюткіх нюансаў, каб Вольцы прыйсці да такога пераканання — да барацьбы, да гневу..."

Неўзабаве пасля апублікавання ў беларускім друку "Гандлярка і паэт" была перакладзена на рускую мову і з'явілася ў часопісе "Молодая гвардия" і "Роман-газете". А потым аповесць была вылучана і на Дзяржаўную прэмію СССР. Але атрыманне прэміі было сарвана. Падставай стала выступленне беларускіх крытыкаў Нічыпара Пашкевіча, Уладзіміра Юрэвіча, Алеся Асіпенкі на пасяджэнні Савета па беларускай літаратуры Саюза пісьменнікаў СССР у Маскве (стэнаграма пасяджэння захоўваецца ў НАРБ, ф. 4 п., воп. 119, спр. 67, л. 82-90, выяўлена В. Скалабанам). На пасяджэнні абмяркоўваліся вынікі 1976-га літаратурнага года. Канечне, найбольшую ўвагу надавалі тым творам, якія былі вылучаны на прэмію. У. Юрэвіч вельмі растрывожыўся, што І. Шамякін забыўся на прынцып гістарызму: Вольга Ляновіч — дачка патомнага рабочага, і на працягу дзесяцігоддзяў жыцця ва ўмовах сацыялістычнага грамадства ў яе не павінна было застацца ні граму прадпрымальніцкай жылкі. Аргумент: Вольга сама працуе ў вагонным дэпо, скончыла восем класаў школы. Ну ніяк не можа яна гандляваць на Камароўцы! У савецкай школе гэтаму не вучылі! Нават векавечны жаночы боль па тых, хто пакутуе (маецца на ўвазе выкуп з плену Алеся Гапанюка) крытык змог павярнуць у цынічнае русла: "Гэта хутка пры-

Міхась ЮЖЫК *(СОТНІКАЎ Міхаіл Юр'евіч). Нарадзіўся ў 1969 годзе ў горадзе Мінску. Скончыў Мінскі радыётэхнічны інстытут. Працаваў на ВА "Гарызонт". З 1997 года — супрацоўнік літаратурна-публіцыстычнага часопіса "Акно". Пісаў на рускай, але неўзабаве канчаткова перайшоў на родную мову.*

Друкаваўся ў тыднёвіку "ЛіМ", часопісах "Крыніца", "Полымя", "Маладосць", "Бярозка", "Родная прырода". Выдаў кнігі "Мёртвае дрэва" (2001), "Перакулены час" (2002), "Марыянеткі і ляльказводы" (2008).

Зусім нядаўна выйшла ў свет кніжка яго выбраных паэтычных і эксперыментальных твораў **"АнтыРЫФМАР"** (Мінск, выдавец І. П. Логвінаў, 2009, у аўтарскай рэдакцыі, 180 стар., 100 асоб.)

"Я ўжо бачыў паэтаў, якія пераўтварыліся і звярнулі свой позірк на сябе.

Я бачыў пакаянцаў духам: яны выраслі з паэтаў."

Фрыдрых НІЦШЭ

З літаратурнай творчасцю Міхася Южыка я знаёмы даволі даўно. Дзесяць год таму ў часопісе "Крыніца" рэдагаваў да друку яго першыя беларускамоўныя спробы ў паэзіі і прозе. Рад быў пабачыць той дэбютны верш і ў гэтай кніжцы аўтара. Наогул пастаянна адсочваю яго творчасць і нават калісьці пісаў пра яго кніжку "Мёртвае дрэва" ў "ЛіМе". Але тое ўсё ў мінулым часе, а сёння М. Южык ужо даволі вядомы літаратар, найперш як празаік. Шырокі палемічны розгалас выклікала яго кніжка "Марыянеткі і ляльказводы". Ды аўтар і сам чалавек крэатыўны, эмацыянальны, схільны да спрэчкі і аспрэчвання ўсяго, што стае ўпоперак досведу і разуменню тых ці іншых яго жыццёвых і літаратурных пастулатаў (у гэтым можна пераканацца, чытаючы яго блог у Інтэрнеце і шматлікія каментары да яго). А так як жыццё пісьменніка з маладосці перацярпела вялікія нягоды, што змусіла яго *задзіночыцца*, жыць і тварыць у прасторава замкнёным свеце, то і ў сваіх пошуках гэтак званага *"святла ў канцы тунелю"* ён пераважна сыходзіць з прынцыпаў высокай чалавечай маралі.

Сама кніжка літаратурных тэкстаў называецца "Анты РЫФМАР" і з іранічным адценнем падзелена аўтарам на дзве часткі — "Рыфмар" і "Анты РЫФМАР", тым самым як бы намякаючы чытачу і крытыку на адносную несур'ёзнасць гэтага выдання. Пра паэзію тут, маўляў, услых казаць не будзем. Калі ж падыходзіць да структуры зборніка наўпрост, то сітуацыя выглядае так, што тут ёсць і рыфмаваныя вершы і "свабодныя", так званыя верлібры, версэты, тактоўнікі і нават рытмізаваныя запісы...

З усіх задавальненняў
цьмяна-шэрых
адна незадаволенасць сабой
смыліць і надакучвае без меры,
і развінае роздумаў сувой.

Не ведаю, навошта было змяшчаць у кніжцы прадмовы Ю. Нератка і самога аўтара, у якіх абодва скіроўваюць патэнцыяльных чытачоў да не надта строгай крытыкі выдрукаваных тэкстаў. Першы напрыканцы свайго слова зазначае, што *"АнтыРЫФМАР" выходзіць прэзентацыйна-падарункавым накладам — дастатковым, каб напісанае засталося і можна было рухацца далей"*, а сам Южык і ўвогуле зводзіць выданне на нішто: *"у кнізе паэзіі "АнтыРЫФМАР", якую выдаю да свайго саракагоддзя, па сутнасці нічога няма, акрамя пакутлівых праклятых пытанняў і нясмелых адказаў на іх"*...

Ну, гэта гледзячы якія пытанні ставяцца і якія адказы на іх даюцца. Маё ўражанне такое, што першую палову кніжкі складаюць вершы паэта, а другую — яго стылёва скампанаваныя нататкі пра жыццё, чалавека і літаратуру. Ды і сам М. Южык піша у сваёй прадмове, што ён *"нядаўна ўразумеў, што апошнія дваццаць гадоў займаецца толькі адным — развагамі пра жыццё і выясненнем месца ў ім для свайго бясцэннага эга"*.

Буду шчырым, першая палова мяне ўразіла найменш. Тут пераважаюць вершы традыцыйнай формы, напісаныя на добрым версіфікацыйным узроўні... Не так часта, як хацелася б, але сярод іх здараюцца і выбітныя творы. Ну вось, скажам, мне падалося, што так па-мастацку самабытна (рэалістычна-"зримо") пра Айчыну ў нас ніхто не пісаў (найперш акцэнтую вашу ўвагу на заключным радку):

Калі сніць —
то сінечу прасторную,
калі згадваць —
то ліўняў размах
ды радзіму лістотна-азёрную,
вёскі чорныя ў белых садах.

Яшчэ да таго, як сесці за гэты артыкул, у мяне была ўнутраная ўмова: аніякіх скідак аўтару, паколькі ён і сам не дае іх іншым. Больш за тое, ён выдатна разумее, што да чаго і што чаго варта, бо і сам судзіць сябе па вышэйшай мерцы. Прынамсі, чытаючы такое, хіба могуць у нас узнікаць іншыя высновы адносна яго ўласнай творчасці: *"...кожны Божы дзень мільёны паэтаў планеты Зямля бяруцца за пяро, упэўненыя, што з'яўляюцца першаадкрывальнікамі нечага таемнага і вялікага. Насамрэч яны нічога не адкрываюць свету, проста свет прыадкрывае ім іншы свой бок."*

Мне заўсёды імпанавалі творцы такога кшталту — бескампрамісныя, канфліктныя, непрымірымыя ў вызначэннях Дабра і Зла. Нават у сваіх эмацыйных і раздражняльна-памылковых выказваннях (а падчас і ў цэлых асобных творах) яны ўсё ж не хаваюць ні сваіх намераў, ні сваёй натуральнасці і не хаваюцца ад адказнасці за іх. *Мастацтва квітнее на крыві і пяшчоце.* Няважна, хто гэта сказаў, — знаны класік, Южык ці ЛеГАЛ... Галоўнае, што ўсе мы разумеем жыццесцвярджальную метафарычнасць гэтага выказвання. Інакш не напісаліся б і падобныя строфы:

Ціха ступі на сцяжыну сваю
і выбрыдай на дарогу.
Я ўжо твой поступ
здаля пазнаю,
пільна ўглядаюся, строга.
Мы не чужыя, за сотні гадоў
хіба мяняецца сутнасць
рэчаў зямных
і зямных галасоў,
водаў гісторыі мутных?

Сярод вершаў, якія выклікалі станоўчыя ўражанні, назаву і тыя, што выдрукаваны на 14, 18, 22, 23, 61, 64, 71, 73, 77, 79 старонках гэтай кнігі.

Ёсць і тое, чаго я пажадаў бы аўтару пазбягаць у далейшым. Сцісла працытую асобныя прыклады такіх хібаў: "*няздорава* многа ведаць"; "агулам *наваляць* беды"; "ноч *скрывала* выявы і рухі"; "ён *кратаў нагою* нясмелай"; "калі *загінаецца* свет жураўліны"; "парвіце *аковы*, *нібыта расліны*"; "і дні *наўспят* над ёй не паплылі"; "і разам шарахнулі ў *супрацьбакі*"; "і *боль* перастане *балець*"; "то шыю напэўна *паломіш*"; "не дрэва раскажа, а *словаў навал*"...

Але, як я ўжо зазначыў, цікавейшым у зборніку ўсё ж з'яўляецца раздзел "АнтыРЫФМАР" са своеасаблівымі *мініяцюрамі* філасофскага і лірычнага складу. Я іх назваў бы (ад біблейскага) версэтамі альбо нават зусім па-разанаўску — зномамі. Зрэшты, калі аўтар не паставіцца да маёй іроніі з крыўдай, то можна было б і **ёжыкамі**, з-за іх абарончай калючасці і натапыранасці. Што вызначае аснову гэтых тэкстаў? Праз увесь іх кантэкст прасочваецца пэўны песімізм і агульны прыземлены філасофскі погляд на зямныя і паднебныя рэчы і дзеі... Усё аўтарскае, біяграфічнае, таемна адпакутаванае, праступае праз самоту, смугу і прыцемненыя фарбы яго паэтычнага свету...

"З падачы ўласнай фанабэрыі расту да нябёсаў. І з вышыні гіганцкага росту раптам бачу сябе сапраўднага: мураша за мурашынымі справамі. Жахаюся, але мушу пакідаць уяўную верхатуру і займаць сваё месца."

Калі ўважліва чытаць падобныя пасажы, то ўзнікае адчуванне нейкай тонкай повязі паміж табой і аўтарам, нават ускоснае паразуменне. Аголеная душа, абвостраныя пачуцці, незагойныя раны і падрэзаныя крылы не даюць яму ўзвышацца над людзьмі, але ўздымаюць яго перад грахоўнымі дзеямі канкрэтнага чалавека, і *ўмаляюць* перад цнатлівым, высокім і боскім.

Аўтар разумее, што біблейскія пастулаты Эклезіяста — *"наймарнейшая марнасць, пустая марнасць, — усё марнасць"*, *"бо пры многасці мудрасці множыцца й скруха; і хто памнажае спазнанне, той памнажае і боль"*, *"словы мудрых — што іголкі, і складальнікі іх — ад адзінага пастара"*, *"а што звыш усяго гэтага, сыне мой, таго асцерагайся: складаць многа кніг — канца ім не будзе, і многа чытаць — стамляецца цела"* — не накладваюць на яго вярыг непарушнай чалавечай веры, а пашыраюць яго веру да абсягу досведу ўсяго чалавецтва. Таму не далёкім ад гэтага ёсць і наступны пасаж:

"Я крычаў, і голас мой нёсся ўздоўж калідора, а рэха прасіла: "Не крычы, я стамілася лётаць між сцен".

Бо сваё ў чалавеку змагае чужароднае, нават калі тое і значна мацнейшае. Чужое не мае адказу ў нашым сэрцы, як і чужамоўнае, бо мы не разумеем і не прымаем яго блізка да ўласнай душы. Сваё ж можа быць і горшым ды драбнейшым, але незаменным, бо намі выпакутаваным. Як пра тое сказана ў Южыка ў гэтым метафарычным версэце:

"Але я не люблю свой дом з бульварнага боку. Люблю пыльны двор, і нават — далёкі яго закутак, дзе паміж старым клёнам і сметніцай касабочыцца мая лаўка".

Цягам усяго прачытання не пакідае адчуванне адметнай аўтарскай начытанасці і ў той жа час сям-там вытыркаецца неўпарадкаваны кніжны інтэлект... Можна прасачыць чыста біблейскія матывы (стар. 89 ды інш.), так і пазнакі ніцшэанства (*"Хвала вар'ятам і хвала немаце"*), кантаўскія пасылы (*"Яго вялікасць закон і яе вялікасць Мараль нясуць тую варту"*), оруэлаўскія рэмінісцэнцыі (*"Мы ёсць выключэннем з агульнага правіла смерці, а таму шчасце наша — падман, а няшчасце — рэальнасць"*)...

Ды Міхась Южык не баіцца паказаць гэтую абазнанасць перад чытачом, разам з тым пазбягаючы цёмнасці і няўцямнасці. Бо для чытача таксама важна, на якім падмурку палягае творчая і мастацкая выбудова аўтара — на высокім ці на нізкім, на моцным ці слабым (на камені ці на пяску)...

Нездарма і прызнаецца — без пафасу і скрушнасці — у тым, у чым іншыя зазвычай прызнацца абыходзяць:

"Як і ўсе творцы, я — паразіт на калізіях паміж чорным і белым".

Калі чалавек **адзін** — гэта не значыць, што ён *адзінокі*. Пацаркоўнаславянску кажучы, ён — "един" ва ўсіх сваіх праявах і ў адносінах да акаляючага яго свету. Калі, да таго ж, ён яшчэ і творца, то — як цень — тым ясней і вызначальней яго постаць на святле ўсяго нашага свету. Як піша Міхась Южык: *"Я на ўяўнай мяжы, дзе няма жыцця, а ёсць адно* назіранне*"*. Бо інакчай, яго ж словам кажучы, — *"разасабляемся"*...

Сустракаюцца, на мой погляд, і выпадковыя запісы, ёсць і некаторы негатыў, які дазволю сабе пакінуць па-за межамі разгляду. Думаю, кніжка была б *чысцейшай*, калі б у яе меўся рэдактар ці хоць бы карэктар (такіх, на жаль, не пазначана). Зразумела, што сёння, як у аўтараў, так і ў выдаўцоў, многія жаданні натыкаюцца на матэрыяльную абмежаванасць... Ды, як пісаў, праўда, з іншай і больш трагічнай прычыны, А. Т. Твардоўскі: *"но всё же, всё же, всё же..."* Калі, вядома, хочам, каб слова наша было не толькі мастацкім, але і граматычна беспамылковым. І гэта бяда не аднаго М. Южыка. У далейшым будзем спадзявацца на лепшае.

Хаця б сыходзячы з уласцівай аўтару самаіроніі як пазнакі сапраўднай творчай асобы. Да прыкладу, у такіх вось радках: *"Пешчу сваю ляноту. Ганаруся, што магу месяцамі не сядаць за пісьмовы стол. Вялая, кволая і дужа не паважаная людзьмі, яна не дае пакуль стаць кончаным графаманам"*.

Што праўда, часам і адсутнасць пісьмовага стала ад гэтага не выратоўвае. Але тое ўжо, даў Бог, Южыка не тычыцца.

ЛеГАЛ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19
Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73
Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3339
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 17.06.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 3188

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686